Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ШТОТЫДНЁВІК

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 18 мая 1990 г. № 20 (3534) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

Унумары:

ХТО Ж КАГО ПЕРАМОГ?
З пошты выбарчага клуба «ЛіМа»
2—3

ІМЕМ МІНУЛАГА, ДЗЕЛЯ БУДУЧЫНІ
Пасля канферэнцыі ў «вечным горадзе»
3

ДВА АНЁЛЫ
ПАЭМА
С. СОКАЛАВА-ВОЮША
4

Х з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі
У мінулых нумарах «ЛіМа» змешчана частка матэрыялаў Х пісьменніцкага з'езда — надрукаваны даклады В. Зуёнка, В. Рагойшы і В. Хомчанкі. Сёння мы завяршаем асвятленне работы з'езда. Выступленні яго ўдзельнікаў падаюцца ў скарочаным выглядзе і ў тым парадку, у якім выступалі прамоўцы.
5—15

ПАРЛАМЕНТ ВУЧЫЦЦА ПРАЦАВАЦЬ

15 мая ў Мінску адкрылася першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР 12 склікання

Журналісцкае месца на балконе залы пасяджэнняў Вярхоўнага Савета — як месца ў глядзельнай зале. Адсюль і сапраўды шмат відаць: як галасуе сакратар ЦК, што падабаецца ветэрану, чым засмучаны «нефармал»... І хоць першыя дні сесіі былі далёка не самым цікавым відовішчам, якое мне давялося бачыць у сваім жыцці, а ўсё адно, стоячы на балконе, нібы саўдзельнічаеш з тым, што адбываецца там, унізе. У нейкія моманты нават хочацца... дапамагчы дэпутатам. Калі не выступіць (да мікрафонаў далёка, ды і заняты яны ўвесь час), то хоць бы падаць прапанову «ў пісьмовым выглядзе» ў сакратарыят...

На старонках нашага друку паступова акрэсліваецца тон асвятлення сесіі. Я сказаў бы — паблажліва-ўшчувальны, часам бескампрамісны. Сёння, па сутнасці, нанова ствараецца жанр парламенцкай журналістыкі, і многае з убачанага дае газетчыкам неацэнную магчымасць вастрыць пёры. З іншага боку, што рабіць, калі першыя ж гадзіны працы сесіі выявілі глыбокую супярэчлівасць паміж Канстытуцыяй БССР і... здаровым сэнсам. І ўвасабляў гэтую супярэчлівасць ніхто іншы, як старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі М. Лагір.

Але справа, зразумела, не ў той ці іншай асобе. На другі дзень, калі памятаеце, нашы парламентарыі на чале з другім старшынёю ў бадзёрым тэмпе забалатавалі літаральна ўсе дапаўненні да парадку дня. Тое, што можна назваць «супрацўленнем матэрыялу»,—вось тэма для ўважлівага аналізу. Маю на ўвазе не нейкую частку дэпутацкага корпуса, не схаваныя ад вачэй апаратныя «тонкасці» ў падрыхтоўцы сесіі, але — непамерна высокі кошт, які ўсе мы сёння мусім плаціць за адсутнасць уласнага вопыту паўнакроўнага палітычнага жыцця. Каб нам хоць крышачку «генаў» дэмакратыі, каб гэтулькі гадоў у нашы галовы не ўбівалася негатыўнае стаўленне да «буржуаз-

(Працяг на стар. 2).



ПАРЛАМЕНТ ВУЧЫЦЦА ПРАЦАВАЦЬ

(Пачатак на стар. 1).

нага парламентарызму» — мы былі б іншыя. І мы, і нашы выбраннікі.

А так — маем, што маем. Раз'яднанасць, непаразумеласць, блытаніну ў працэдурных і тэхнічных пытаннях... Але я не стаў бы прад'яўляць «гамбургскі рахунак» нашым дэпутатам. Яны не з Альфа-Цэнтаўры да нас завіталі і занялі месцы ў Вярхоўным Савеце. У зале, прыстасаванай хутчэй для сядзення і націскання кнопак, а не для эфектыўнай парламенцкай дзейнасці. Пад вычварным барэльефам 30-х гадоў, на якім у натуральную велічыню ўвасоблены постаці ўзброеных людзей, што крадком кудысьці ідуць... Бывае, хочацца і паспачуваць дэпутатам. Нашай воляй яны трапілі на ярка асветленую палітычную сцэну— і аказалася, што па ёй нават хадзіць трэба вучыцца.

Між тым, першыя дні работы сесіі даюць цікавую інфармацыю для роздуму. І хоць часта гучаць заклікі да кансалідацыі і канструктыўнасці, досыць выразна акрэсліваецца расстаноўка сіл сярод дэпутацкага корпуса. Найперш гэта выяўляецца пад час галасавання, калі на электронным табло ўспыхваюць лічбы «за» і «супраць». Вось некалькі фактаў з майго блакнота, занатаваных пад час абмеркавання пытанняў, звязаных з фарміраваннем парадку дня сесіі. Напрыклад, за стварэнне надзвычайнай камісіі па расследаванні дзейнасці службовых асоб у сувязі з чарнобыльскай катастрофай (назва камісіі будзе яшчэ ўдакладняцца) выказалася 274 дэпутаты (галасаванне было пайменным). 114 галасоў было пададзена супраць абмеркавання на сесіі пытання аб Камітэце народнага кантролю (за — 145). За тое, каб разгледзець закон аб крымінальнай адказнасці за вытворчасць прадукцыі, забруджанай радыенуклідамі і нітратамі (прапанова дэпутата Л. Баршчэўскага), прагаласавала 126 чалавек, супраць— 155. Адным голасам было адхілена пытанне аб рэгістрацыі БНФ «Адраджэнне» (прапанова дэпутата С. Папкова атрымала 150 галасоў «за» і 151 — «супраць»). Цікава, што за пайменнае галасаванне па гэтым пытанні выказалася 116 дэпутатаў, супраць было 169. 223 галасамі адхілена ўключэнне ў парадак дня пытання аб нацыянальнай сімволіцы, 84 было пададзена за гэтую, яшчэ адну прапанову Л. Баршчэўскага. 67 — за, 228 — супраць — такі быў расклад, калі галасавалася прапанова разгледзець сесіі пытанне аб прэзідэнцкай уладзе ў БССР; 35 — за, 265 — супраць, калі было прапанавана ўнесці змены ў выбарчае заканадаўства... А калі пераважнай большасцю галасоў у першы дзень было вырашана не трансліраваць пасяджэнні сесіі па тэлебачанні, у зале раздаліся апладысменты...

Зразумела, што галасавалася толькі ўключэнне таго ці іншага пытання; зразумела, што некаторыя з іх былі не лепшым чынам сфармуляваны. Але тое, як размяркоўваліся галасы, сведчыла і аб адносінах дэпутатаў да БНФ, і да сімволікі, і да КНК.

Упэўнены, што журналісты яшчэ не раз будуць пісаць пра паводзіны «большасці» і «меншасці» на гэтай сесіі. Заўважу, аднак, што ўсё адносна і, уласна кажучы, сам Вярхоўны Савет з'яўляецца меншасцю ў дачыненні да грамадства...

Што найбольш запомнілася? Асобы, якія ўжо вылучыліся, якія актыўна ўдзельнічаюць у рабоце сесіі, фарміруючы крытэрыі такога паняцця, як «парламенцкая праца». Я назваў бы дэпутатаў В. Ганчара, В. Голубева, С. Навумчыка, У. Станкевіча, У. Кавалёнка, В. Радамысльскага, Л. Баршчэўскага, Я. Цумарава, П. Садоўскага — на шчасце, іх пералік заняў бы значна больш месца, чым я сёння маю, занатоўваючы першыя свае ўражанні.

Усё яшчэ наперадзе. Калі вы заўважылі, дэпутаты выступаюць галоўным чынам каля расстаўленых у зале мікрафонаў. Галоўная трыбуна сесіі пакуль што пустуе...

Андрэй ГАНЧАРОЎ,
парламенцкі карэспандэнт «ЛіМа».

Фота А. КАЛЯДЫ і А. КЛЕШЧУКА.

УРАДАВАЯ ПРАГРАМА: ПРЫЯРЫТЭТ КУЛЬТУРЫ

Другі раз за нядоўгі тэрмін свайго знаходжання на пасадзе прэм'ера сустрэўся В. Ф. Кебіч з дзеячамі беларускай культуры. Размова адбылася напярэдадні адкрыцця сесіі Вярхоўнага Савета БССР, дзе ўраду трэба будзе прадставіць на суд дэпутатаў праграму сваёй дзейнасці. Разам з пісьменнікамі, мастакамі, архітэктарамі, кампазітарамі, дызайнерамі, акцёрамі Старшыня Савета Міністраў вырашыў расставіць у ёй апошнія, магчыма, самыя важныя акцэнты.

А пачалася размова аб беларускай культуры з праблем эканамічных. У іх цеснай узаемасувязі і ўзаемазалежнасці нікога з прысутных пераконваць не трэба было. Як падкрэсліў В. Ф. Кебіч, многія сённяшнія беды ў духоўнай сферы былі запраграміраваны лічбай 0,75 працэнта — іменна такая частка бюджэту расходавалася доўгі час на культурныя запатрабаванні нацыі. Новы ўрад прапануе ўжо ў 1991 годзе павялічыць гэту лічбу як мінімум да трох працэнтаў.

У цэлым згадзіўшыся з эканамічнай праграмай урада, удзельнікі сустрэчы прапанавалі значна дапоўніць і расшырыць яе культурны раздзел. Занадта ўжо многа неадкладных праблем накапілася ў гэтай сферы. А тут паявілася такая, скажам прама, пакуль яшчэ нячастая магчымасць расказаць аб іх кіраўніку ўрада, напрамую папрасіць дапамогі. Патрэбны новыя будынкі тэатральна-мастацкаму інстытуту, кансерваторыі, мастацкаму музею. На ўрад галоўная надзея і ў рэалізацыі праграмы адраджэння беларускай мовы. Сярод неадкладных задач — павышэнне зарплаты работнікам культуры, дзяржаўная дапамога кінастудыі «Беларусьфільм», забеспячэнне паперай выдавецтваў...

Трэба адзначыць, што В. Ф. Кебіч заахвочваў зварот прысутных з матываванымі просьбамі, некаторыя праблемы вырашаліся тут жа. Старшыню Савета Міністраў не бянтэжыла, што цана многіх праектаў вымяраецца не адным мільёнам рублёў. Рэзка скараціўшы інвестыцыі прамысловасці, урад атрымаў магчымасць укладваць у культуру значныя сродкі.

БЕЛТА.

З ПОШТЫ «ВЫБАРЧАГА КЛУБА «ЛіМа»

ХТО Ж КАГО ПЕРАМОГ?

Пра тое, што пад час выбарчай кампаніі дапускаліся парушэнні закона, а кандыдаты ў народныя дэпутаты дазвалялі сабе абразлівыя выпады супраць саперніка, даводзілася чуць і чытаць. Напярэдадні выбараў 5 мая і самому трапіўся ў рукі дакумент, напісаны ў форме звароту да людзей, якія назаўтра павінны былі пайсці да выбарчых урнаў. Пад заслону, як кажуць, на дарожку, ім і даваўся апошні, «правільны», інструктаж, які ўжо ніхто не мог аспрэчыць і абвергнуць, бо ў дзень выбараў усякая агітацыя «за» і «супраць» забаронена...

«Дорогие товарищи! Минчане проявили политическую дальновидность и благоразумие, нанеся поражение на выборах 4 марта 1990 года представителям Белорусского народного фронта. Мы сделали свой выбор. Мы не поставили на карту собственную судьбу и будущее своих детей...»

Але чакайце—хіба мінчане сапраўды нанеслі паражэнне кандыдатам Беларускага народнага фронту, які, як вядома, выступаў на выбарах не сам па сабе, а ў саюзе з Таварыствам беларускай мовы, Беларускім экалагічным саюзам, Беларускім сялянскім саюзам, утвараючы сумесны Дэмакратычны блок? Так, многія яго відныя прадстаўнікі, як віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР Ліштван, доктар фізіка-матэматычных навук Хадыка, доктар гістарычных навук Ткачоў, старшыня Беларускага сялянскага саюза Ярмоленка, мастак Марачкін, філолаг Вячорка і некаторыя іншыя сапраўды не прайшлі ў народныя дэпутаты, але асабіста я ў гэтым не бачу ніякіх падстаў для радасці. Названыя людзі змагаліся за мандат у беларускім парламенце не з наспех сшытымі перадвыбарчымі праграмамі, разлічанымі на танны эфект і поспех у выбаршчыкаў, а зыходзячы з жыццёвых і грамадзянскіх пазіцый, глыбокага разумення праблем, што стаяць перад Беларуссю і патрабуюць неадкладнага вырашэння.

Але выбары ёсць выбары і сёння цяжка адназначна адказаць, чаму названыя і не названыя прадстаўнікі Дэмакратычнага блока, якія выйшлі на другі тур галасавання з вялікай перавагай галасоў, не здабылі перамогі. Сёй-той спрабаваў вытлумачыць гэта рашэннем літоўскага парламента аб выхадзе з СССР, чым, маўляў, былі запалоханы многія нашы выбаршчыкі. Але ж ні пра які выхад Беларусі з Саюза ні ў платформе Дэмакратычнага блока, ні ў індывідуальных праграмах яго прыхільнікаў і слова не было сказана. Разам з тым, хлусяць аўтары звароту, калі кажуць пра нейкае сакрушальнае паражэнне БНФ, бо, па-першае, і пры такой сітуацыі нямала прадстаўнікоў Дэмакратычнага блока прайшло ў народныя дэпутаты. А, па-другое, нельга не бачыць таго, што выбаршчыкі адмовілі ў сваім даверы многім прадстаўнікам партыйнага і адміністрацыйнага апарату.

Невядома, ці падсумоўваў хто, у якую капеечку нам ужо ўляцелі гэтыя рэкордныя па працягласці выбары? Акрамя ўсяго іншага, яны запатрабавалі вызвалення з асноўнай працы масы людзей. Але куды важней страты маральныя, якія адаб'юцца на дзейнасці нашага парламента і на яго аўтарытэце ў народзе!

Адным словам, не падзяляю радасці аўтараў звароту з нагоды вынікаў галасавання 4 сакавіка. Калі на тое пайшло, дык у той дзень мы перш за ўсё сустрэліся з недасканаласцю нашай выбарчай сістэмы, з недасведчанасцю многіх нашых выбаршчыкаў, якія не мелі цвёрдых перакананняў, выверанай пазіцыі і пад уплывам знешніх фактараў мянялі арыенціры. Сяго-таго было лёгка застрашыць, запалохаць, падмануць абяцанкамі. Застаецца спадзявацца, што самаўсведамленне прыйдзе да нас са шматпартыйнай сістэмай, якая разбурыць мана-

Перамозе — 45 год

Выставы да чарговай гадавіны Вялікай Перамогі заўжды займалі ў выставачнай дзейнасці Саюза мастакоў Беларусі і рэспубліканскіх дырэктыўных органаў, адказных (праўда, невядома перад кім) за стан культуры, асаблівае месца. Гэта ў пэўнай ступені тлумачылася тым, што другая сусветная вайна сталася для нашага народа найвялікшым выпрабаваннем, выявіла для ўсяго свету нацыянальны характар беларусаў. Разам з тым, і гэта трэба прызнаць, «ваенная» тэма на Беларусі для многіх ператварылася ў звычайную кан'юнктуру, іншы раз на вялікай рэспубліканскай імпрэзе шчырыя, праўдзівыя творы можна было пералічыць па пальцах...

Сёлетняя выстава—сведчанне крызісу «ваеннай» тэмы ў беларускім выяўленчым мастацтве, а таксама выразнай палярызацыі ў поглядах мастакоў і на «ваенную» тэматыку і ўвогуле на «тэматычныя» (да дзяржаўных святаў) выставы. Калі мастакі старэйшага пакалення, сярод якіх, дарэчы, нямала ветэранаў, прадставілі ў экспазіцыю партрэты ўдзельнікаў вайны ці батальныя сцэны ў міфалагічна - гераічнай трактоўцы, дык іх маладзейшых калег больш вабяць адвечныя каштоўнасці звычайнага мірнага чалавечага жыцця. А калі яны і звяртаюцца да драматычнага мінулага краіны (сталінскі генацыд, вайна), да трагедый сённяшняга дня (экалогія, Чарнобыль, Афганістан),

У. ЖУК. Плакат.



А. ЗАДОРЫН. «Ладдзя Харона».

У. ТОЎСЦІК. «Дзяцінства».

У. КОЖУХ. «Матчын плач».

— дык акцэнтуюць увагу менавіта на трагізме, заклікаюць гледача думаць аб тым, чаго вартыя перамогі любым коштам, калі забываюць пра ахвяры, пра людзей.

Старэйшае пакаленне памятае, як сустракалі савецкія танкі ў Бялградзе, Празе. У маладзейшых іншы сацыяльны вопыт: браніраваныя машыны на вуліцах Тбілісі, Душанбе, Рыгі, Вільнюса. Гэта—апошнім часам. А раней — Будапешт-1956, Прага-1968...

І ўсё гэта падсвядома прысутнічае ў творчасці мастакоў, так ці інакш адбіваецца ў іх творах.

П. ВАСІЛЕЎСКІ.

Імем мінулага, дзеля будучыні

З 29 красавіка па 6 мая ў «вечным горадзе» Рыме праходзіла канферэнцыя на тэму «Фарміраванне сацыяльна-культурных традыцый ва Усходняй і Цэнтральнай Еўропе: Беларусь, Літва, Польшча, Украіна». На канферэнцыю была запрошана група беларускіх навукоўцаў—мовазнаўца В. Вярэніч, гісторык А. Грыцкевіч і літаратуразнаўца А. Мальдзіс. Удзельнікі канферэнцыі былі прыняты Папам Рымскім.

Наш карэспандэнт звярнуўся да Адама Іосіфавіча МАЛЬДЗІСА з просьбай сказаць колькі слоў пра рымскі форум.

— Ініцыятарам правядзення канферэнцыі выступіў Польскі інстытут хрысціянскай культуры ў Рыме. Таму менавіта тут яна праходзіла. На канферэнцыю быў яшчэ запрошаны Васіль Быкаў. Яго імя значылася ў праграме літаратурнага вечара. На жаль, абставіны не дазволілі яму прыехаць у Рым... Што хацеў бы перш за ўсё зазначыць? Упершыню ў гісторыі Беларусі сабраліся і вялі размову за адным сталом беларусы з Мінска, з Варшавы, з Нью-Йорка, з Лондана, з Рыма. Гаварылі разам пра нашу агульнанацыянальную справу. Хацеў бы падкрэсліць і такі момант. Ехалі мы на канферэнцыю з пэўнай, скажу так, насцярожанасцю. Выклікала насцярожанасць, пэўныя асацыяцыі сама назва канферэнцыі. На ёй, зазначу тут жа, было шмат палітыкі, былі разыходжанні, бурныя дэбаты часам зацягваліся дапазна. Прыходзілася выступаць па некалькі разоў. Але гэта быў якраз той выпадак, калі ў спрэчках нараджаліся ісціна, узаемаразуменне. Насцярожанасць хутка ўступіла месца ўсведамленню, што можна і трэба рабіць агульную справу, што трэба пераадольваць няведанне і ігнараванне каранёў сваёй супольнасці—этнічнай, рэлігійнай. У ходзе дыскусій узнікала пачуццё адказнасці за нашу векавую супольнасць, за повязь часоў. Я ў сваім выступленні падкрэсліваў, што трэба акцэнтаваць не на тым, што нас падзяляе, а на тым, што нас збліжае.

— З мэтай далейшага супрацоўніцтва было вырашана стварыць пастаяннадзеючы камітэт—па тры чалавекі ад кожнага народа. Ад беларусаў у камітэт увайшлі А. Грыцкевіч, Р. Кіпель і А. Мальдзіс. Намецілі пэўны план дзейнасці камітэта, у прыватнасці выданне супольнага атласа—сацыяльнага, этнічнага і рэлігійнага. Паколькі ў нас, беларусаў, ёсць тут добры задзел,—я маю на ўвазе атлас нашых вучоных С. Польскага і С. Мацюніна «Беларусы: колькі і дзе?»,—то заходзіла размова аб выдаўцу-спонсары для друкавання гэтай працы.

З украінцамі мы дамаўляліся аб сумесных выданнях. З літоўскімі калегамі вялі гаворку аб адраджэнні Беларускага музея імя Івана Луцкевіча ў Вільнюсе. Ну, і ўсе ўдзельнікі канферэнцыі падтрымалі прапанову вылучыць кандыдатуру Васіля Быкава на атрыманне Нобелеўскай прэміі...

— Якія яшчэ добрыя справы можна залічыць на рахунак канферэнцыі?

— На ёй узніклі дзве новыя суполкі Таварыства беларускай мовы — рымская і нью-йоркская. Яны перадалі праз нас адпаведны ўступны ўзнос у амерыканскіх доларах. Гэта папершае. Па-другое, не забывалі мы, не маглі забыць пра Чарнобыль. Беларуская дэлегацыя звярнулася да гаспадароў сустрэчы з просьбай дапамагчы нам у бядзе. Адгукнуліся перш за ўсё дзве жанчыны, госці канферэнцыі—графіня Інаканта Селяра дэль Борджо і маркіза Ванда Гаўрон-ска. З дапамогай мужа графіні Фаусто Селяра дэль Борджо, прэзідэнта дабрачыннага таварыства Мальційскага ордэна, былі тэрмінова закуплены два корабы полівітамінаў і кораб сардэчных сродкаў і дастаўлены ў аэрапорт. Гэты клопат пра хворых дзяцей—ахвяр Чарнобыля,—яшчэ адзін своеасаблівы штрых да пытання аб нашых агульных сацыяльна-культурных традыцыях, пра якія ішла размова на канферэнцыі...

Ян Павел II, Р. Кіпель, А. Грыцкевіч і А. Мальдзіс.

На канферэнцыі шмат гаварылася пра агульнаеўрапейскі дом. Да размовы падключыліся француз Бавуа і англічанін Дэвіс, абодва прафесары. Разглядаючы нашы праблемы, праблемы ўзаемадачыненняў чатырох народаў, крыху збоку, больш аб'ектыўна, яны зазначылі, што трэба не вярэдзіць старыя раны, а шукаць сродкі іх супольнага лячэння. З імі цяжка было не пагадзіцца.

— Якія былі дасягнуты дамоўленасці? Ці прыняты якія канкрэтныя рашэнні?

польнае права толькі адным гаварыць ад імя народа, вырашаць яго лёс. Выбары нас змогуць поўнасцю задаволіць тады, калі мы зможам выбіраць прыхільнікаў той ці іншай альтэрнатыўнай палітычнай праграмы. А не як цяпер, калі даводзілася прымаць на веру абяцанкі, дэкларацыі, запэўненні кандыдатаў у дэпутаты з мэтай спадабацца выбаршчыкам.

Я не буду тут далей пераказваць змест згаданай у пачатку адозвы да выбаршчыкаў Машэраўскай акругі г. Мінска, бо, паверце, не вельмі прыемна гэта рабіць у дачыненні да нізкагатунковай прадукцыі.

Прозвішчаў аўтараў, натуральна, пад адозвай няма, толькі пазначана, што гэта «группа автотранспортников, педагогов Фрунзенского района». Вось і здагадвайся, ці гэта пісалі шафёры, слесары, аўтарамонтнікі, ці сейбіты «разумнага, добрага, вечнага»...

Нарэшце засталося ўдакладніць, у імя чаго, ці, дакладней, для каго нашы безыменныя аўтары так стараліся. Аказваецца, для кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Савета БССР старшыні Белсаўпрофа У. Ганчарыка, як тут было сказана, «сторонника прогрессивных радикальных изменений в нашем обществе...».

Для дасягнення мэты падыходзяць усе спосабы? Так атрымліваецца...

Яўген ЛЕЦКА.

ПАТРЭБНЫ РЭАЛЬНЫЯ ГАРАНТЫІ

Апошнім часам досыць часта праводзяцца апытанні грамадскай думкі па найбольш важных жыццёвых праблемах. Не засталася ўбаку ад гэтага і кафедра журналістыкі Маскоўскай вышэйшай партыйнай школы. Яна звярнулася да шэрагу палітычных дзеячаў, вучоных, пісьменнікаў, журналістаў, работнікаў культуры, спецыялістаў, кіраўнікоў вытворчасці, а таксама замежных грамадзян, якія працуюць у нашай краіне, з пытаннямі, якія тычацца галоснасці, далейшай дэмакратызацыі савецкага грамадства. Матэрыялы апытання ўвайшлі ў кнігу «Лёс галоснасці — лёс перабудовы», толькі што выпушчаную Выдавецтвам палітычнай літаратуры ў Маскве.

На яе старонках сутыкаюцца самыя розныя погляды. Знайшлося месца і вядомай Ніне Андрэевай. Лімаўскаму ж чытачу, мабыць, цікава будзе даведацца, што сярод аўтараў кнігі — і народны пісьменнік Беларусі, народны дэпутат СССР Васіль Быкаў.

Яго адказы змешчаны пад загалоўкам «Дэмакратыя і праўда». Сярод пытанняў, зададзеных пісьменніку, былі і такія: «Ці патрабуе сёння галоснасць якіх-небудзь абмежаванняў? Якія яе перспектывы? Якія магчымы рэальныя гарантыі, што забяспечваюць незваротнасць у развіцці дэмакратыі?» В. Быкаў зазначае, што «любое абмежаванне галоснасці ёсць свядомае ці несвядомае зацісканне дэмакратычных правоў чалавека і, па сутнасці, служыць кансерватыўным, рэакцыйным мэтам. Галоснасць, адкрытасць, свабода слова — усё-такі выражэнне свабоды грамадства, яго праўды, а праўду аб сабе і аб свеце дазіраваць супрацьпаказана».

Далей, адказваючы на пытанні анкеты, В. Быкаў гаворыць: «Поспехі перабудовы ў першую чаргу звязаны з незваротнасцю галоснасці, з паслядоўным пераўтварэннем яе ў больш высокую форму дэмакратыі — свабоду слова... Але аднаго прызнання яе надзённай неабходнасці, відаць, недастаткова для грамадства. Патрэбна яе легітымізацыя, забеспячэнне яе прававымі і арганізацыйнымі гарантыямі». Першачарговым крокам тут В. Быкаў лічыць «вывядзенне сродкаў масавай інфармацыі з падначалення цэнтральным і мясцовым органам улады (парткомаў, Саветаў, ведамстваў), прызнанне за гэтымі сродкамі статуса сапраўды незалежных органаў, для якіх галоўным богам у іх дзейнасці сталі б два прынцыпы: дэмакратыя і праўда».

У заключэнне В. Быкаў падкрэсліў: «Калі мы зможам ажыццявіць гэта ў бліжэйшы час, то і наша цяперашняя галоснасць будзе гарантавана надоўга».

В. ЗАКРЭЎСКІ.

АБ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ МОВЫ

З мэтай паскорыць стварэнне і паспрыяць напаўненню канкрэтным зместам Праграмы Савета Міністраў БССР па рэалізацыі Закона аб мовах у Беларускай ССР 11—12 мая г.г. у Доме літаратара прайшла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя «Дзяржаўнасць беларускай мовы: праблемы і шляхі ажыццяўлення», арганізаваная Таварыствам беларускай мовы імя Ф. Скарыны сумесна з Міністэрствам народнай адукацыі БССР. На форум былі запрошаны настаўнікі і кіраўнікі органаў народнай адукацыі, навукоўцы, прадстаўнікі творчых саюзаў, дзеячы культуры, служачыя, рабочыя, святары праваслаўнай і каталіцкай цэркваў Беларусі, людзі розных прафесій і сфер дзейнасці з усіх куткоў рэспублікі. У працы канферэнцыі бралі ўдзел і прадстаўнікі шэрагу міністэрстваў, дзяржкамітэтаў, грамадскіх арганізацый рэспублікі, у якіх, як вядома, павінна быць распрацавана канкрэтная ведамасная праграма ажыццяўлення Закона аб мовах у БССР.

Канферэнцыю адкрыў старшыня Таварыства беларускай мовы Н. Гілевіч. Са змястоўным дакладам выступіў міністр народнай адукацыі БССР М. Дзямчук. У дакладзе была асветлена дзейнасць сістэмы народнай адукацыі рэспублікі ў недалёкім мінулым, ставіліся маштабныя задачы беларусізацыі грамадскага жыцця ў рэспубліцы, выявіліся акцэнты, якія даюць надзею, што ў сферы народнай адукацыі нарэшце могуць адбыцца значныя зрухі ў напрамку да адраджэння нацыянальнай школы Беларусі.

У выступленнях дзесяткаў прамоўцаў у першы і ў другі дзень эмоцыі — без чаго ў вялікай справе нельга — былі, бадай, на другім месцы. Разважлівасць і пошук канкрэтных форм, метадаў і шляхоў адраджэння беларускага слова, станаўлення нацыянальнай школы як першачарговага звяна ў кантэксце нацыянальнага аднаўлення і ў канчатковым выніку вяртання беларускай мовы да грамадскага жыцця ва ўсіх яго сферах — вось асноўны тон выступленняў вучонага і пісьменніка А. Мальдзіса, гісторыка М. Ткачова, супрацоўніка Міністэрства замежных спраў У. Шчаснага, майстра Мінскага аўтазавода Б. Родзіча, заслужанага настаўніка БССР А. Белакоза, свяшчэнніка праваслаўнай царквы Г. Латушкі, беларускага каталіцкага святара Я. Матусевіча і многіх іншых.

Вынікам працы канферэнцыі стала пастанова з 20 пунктаў, якая будзе надрукавана ў чарговым нумары бюлетэня ТБМ «Наша слова» і ў іншых рэспубліканскіх выданнях. Акрамя таго, усе змястоўныя прапановы і заўвагі, выказаныя ў час канферэнцыі, будуць сістэматызаваны і афармлены ў выніковы дакумент-справаздачу, якая будзе перададзена адпаведнай камісіі Савета Міністраў БССР, іншым зацікаўленым дзяржаўным органам, установам і арганізацыям.

УСПОМНІЛІ БЫЛЫЯ ГАДЫ

Вечар памяці беларускіх паэтаў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, адбыўся ў Доме літаратара. Адкрыў вечар намеснік старшыні СП БССР, сакратар партыйнай арганізацыі В. Супрунчук.

М. Аўрамчык, М. Скрыпка, А. Вольскі падзяліліся ўспамінамі аб ваенных падзеях, прачыталі свае творы. А. Сульянаў заклікаў літаратараў пісаць на ваенна-патрыятычную тэму.

Вершы А. Жаўрука, Л. Гаўрылава, М. Сурначова, А. Коршака, З. Астапенкі і іншых паэтаў, якія не вярнуліся з вайны, а таксама творы М. Танка, П. Броўкі, А. Пысіна і П. Панчанкі прачыталі артысты Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра БССР.

На вечары выступілі спявак А. Купчэнка і хор «З песняй па жыцці» Дома ветэранаў Фрунзенскага раёна горада Мінска.

П. ГАРДЗІЕНКА.

Сяржук СОКАЛАЎ-ВОЮШ

Два анёлы

I

Прыспаны снегам краявід:
Палі, мястэчкі, пушчы, вёскі,
Сівой завеі адгалоскі
Яшчэ блукаюць, як прывід.

Імчацца коні. Санны след
Самотна стыне між сумётаў,
І месяц сыпле пазалоту
На гэты край, на гэты свет.

Імчацца коні. Шпаркі бег
Сціскае сэрца пакрыёма,
Звіняць узрушаныя бомы,
Пад палазамі крэкча снег.

Куды, навошта дзень пры дні
Ляцець не ведаючы шляху?
Спыніцца? Стаць? Пайсці на плаху
Халоднай белай цішыні?

Пускаю лейцы. Карабач
З вар'яцкім свістам кола піша,
А коні самі цішай, цішай
І не прымусіць іх наўскач...

Нарэшце сталі. Рослы мур
Сівагаловай камяніцы,
Старой, як гэты свет, бажніцы
Спыніў раз'ятраны алюр.

Выходжу з санак. Войкнуў крок.
Сумёт пасунуўся ў валёнкі;
Лядзяш упаў пад ногі звонкі
І зноўку ціша, зноўку змрок.

Вось зараз дзверы адчыню,
Заплюшчу вочы на парозе,
Аб нечым чыстым думаць-крозіць
Пачну праз гэту цішыню.

А хтось нябачнаю рукой
Кранецца клавішаў аргана
І гукі песняў нечуваных
Абудзяць цішу і спакой...

II

Узорныя краты на шэрым вакне,
Ды цені ад іх на падлозе...
Як цёпла і радасна сталася мне
На гэтай халоднай дарозе.

А што падарожніку трэба яшчэ?
У дзень немагчыма сцюдзёны
То джаліць мароз, то віхура сячэ
Бязмэтна, бяздушна, будзённа.

І раптам такое: бялюткі алтар,
Ды свечак бясконцае многа,
Ды месяц праз вокны, як цудны ліхтар
Запалены воляю Бога.

Так добра, пакінуўшы шал маразоў,
Стаяць каля гэтай пякноты
І слухаць гаворку старых абразоў
Сатканую з мудрае цноты.

Уверх пазіраць, дзе бялюткай рукой
Сівы як арган арганісты
Узмахвае лёгка і сее спакой
У зале прасторнай і чыстай.

Сагрэлася цела і стала лягчэй...
А коні іржуць у дарогу...
Здалося, што холад прабег ля плячэй,
У сэрцы збудзіўшы трывогу.

Я выйшаў на вуліцу. Поўні святло
Таемна плыло наваколлем.
Ні коней, ні санак, і як не было
Ніколі-ніколі... ніколі.

Ну хоць бы які там нязначны слядок,
Ну хоць бы праява якая.
Нядарма прабег ля плячэй халадок...
Хутчэй! Даганяю. Гукаю.

То падаю ніцма ў халодны сумёт,
То мацаю вокам дарогу.
Здаецца, што чую шалёны намёт,
А вуха настаўлю — нікога.

Вунь там, каля лесу, ў гушчэчы начы
Мільгаюць гарачыя грывы.
Хапаю і мацаю ў цемры: карчы
Пад снегам халодным і сівым.

Імчуся на поле. Напэўна яны
Прывабна званочкамі звоняць.
О колькі яшчэ ў гэтым свеце маны:
Завея як шпаркія коні.

У роспачы падаю ніцма на снег,
Гарачае кідаю ў холад.
Хто скажа, за што, за які такі грэх
Тупое нямоцце наўкола.

Трымайцеся, ногі. Дарога адна...
Мястэчка зіхціцца агнямі...
І пляшка пустая з пустога вакна...
— Ідзі ты з сваімі канямі.

І дзверы на ключ, і згасілі святло,
Атолкай вакно захінулі...
Халодным маўчаннем другое жытло...
Страшней, чым гарачаю куляй.

У трэцім бяздушна плявалі ў твар,
У шостым... І далей не лепей:
Тут прорва распусты, папоек і свар,
Тут дыхаеш быццам у склепе.

Хутчэй за мястэчка. У вёску. Туды,
Дзе добрыя шчырыя душы.
— Падумаеш — коні! Вялікай бяды.
Бяда, калі з раніцы сушыць.

— Ну колькі вас? Колькі? Ды марна пытаць.
Стаяць ля дзвярэй грамадою
Гатовыя біць, зневажаць, рагатаць,
Сам-насам пакінуць з бядою.

А сэрца, як птушка, ірвецца з грудзей:
Няма куды кінуцца болей.
Ні поля, ні лесу наўкол, ні людзей,
Ні жальбы, ні песні, ні волі...

III

Падставіўшы грудзі завейным вятрам,
Пакінуўшы сціжмы дарог,
Я зноўку прыцёгся ў няведамы храм
На добра забыты парог.

Замкнёныя дзверы сустрэлі мяне,
Як, зрэшты, і ў гэны прыход.
Я гэтак жа лёгка прайду іх, ці не?
Я іншы за гэтулькі год...

Адскочыла клямка. Падаўся засоў.
Ды што гэта з храмам маім?
Дзе свечкі гарэлі — там тысячы псоў,
Мы моўчкі насупраць стаім.

Сівы арганісты — халодны шкілет,
Кастыркі — блішчасты арган,
А цемра употай рыхтуе стылет
І правіць аб звон ятаган.

У новых абкладах другія багі
Маўкліва глядзяць у бакі,
Алтар ад памыяў згубіў берагі.
Са шчодрае іхняй рукі.

— О Божа! — прарэзлівы шэпт абудзіў
І цела маё і душу,
А сэрца прачнулася думкам наўздзіў,
Пачуўшы святую імшу.

Раздзершы смуродны і гнілісты груд
Халоднага чорнага дна
Двох белых анёлаў, скідаючы бруд,
Памкнуліся ўвысь, да відна.

Таемным святлом асвятляючы храм,
Яны свае песні лілі,
Прарочылі сонца халодным вятрам
І мудрасць людзей на зямлі.

Зацяты бязверца у змроку густым,
Ахвяра змагарных знямог,
Я стаў на калені у храме святым
І доўга маліўся як мог.

IV

Уладару Неба і Зямлі
Божа мой спрадвечны і святы!
Люду паспалітаму пашлі
Паратунак свой ад нематы.

Укладзі у вусны родных слоў,
Абудзі да вольніцы душу,
Дай разважных, кемлівых галоў,
Чуеш? Я малю цябе, прашу!

Адпусці суворыя грахі,
Тыя, што зрабілі незнарок
У някепскі час і ў час ліхі.
Дай нам слёзы, каб ачысціць зрок.

Дай нам еднасць, згоду і любоў,
Сілы дай для мужнай барацьбы,
Дай нам быць рабамі між рабоў,
Калі ўсе наўкол твае рабы.

Ад ліхіх людзей абарані,
Абудзі прыспаны гонар наш,
Каб заўсёды толькі на кані...
Глянь на нас, падумай і разваж.

Шмат глухіх, сляпых, якіх яшчэ?
Пагарджаных — стос, знямоглых — рацъ.
Кожны крыж калецтва валачэ,
Хто якога — цяжка разабраць.

Быў сляпы, а сёння, бач, аглух,
Заўтра анямее, ўсім на здзіў,
І малюе свой заўсёдны круг:
Не казаў, не бачыў, не хадзіў,

Не пісаў, не чуў, не еў, не спаў,
Не шукаў, не ведаў цэлы век,
Не ляжаў, не думаў, не капаў,
Гадаваў такіх, як сам, калек...

Я не лепшы — коней пагубляў,
Недзе у палёх пасеяў меч...
Божа, калі ты нас не пракляў —
Не русач, не польшчы, не нямеч...

Дай усходы гэтаму мячу,
Абарону дай свайму рабу,
Я жыццём, я розумам плачу,
Толькі каб архангел у трубу...

Ды маўчыць святарная труба,
Ды маўчаць нябёсы ў вышыні.
Два анёлы — Песня і Жальба,
І не я, а іншы на кані.

Пырскі пены, пошчак капытоў,
Што ж так ціха, што ж не ў поўны рост,
Дзесь па загуменнях, ля платоў,
Калі трэба гучна і наўпрост.

Гіне храм. Чаго, Уладар, маўчыш?
Слёзы цэглай падаюць на дол...
Абудзі сумленне, глуш і ціш!
Дзе твой трэці? Дзе ён твой анёл,

Што вядзе і кліча за сабой,
Што вяртае гонар на зямлю?
Прысягаю страшнаю кляцьбой:
Стану побач і не адступлю!

Бачыш, Божа, бачыш гэты край?
Лепш вулкан, патоп ці землятрус.
Пакарай нас, Божа, пакарай,
Каб збудзіўся ў душах Беларус.

Каб у соты раз рабам тваім
Не крычаць адказ для іншых нацый:
— А чаго ж, чаго захацелась ім...
Людзьмі звацца.

Тры анёлы — тры дарогі ў свет,
Што наўсцяж зліваюцца ў адну...
Дай ім, Божа, меней страшных бед,
Адвядзі паклёпы і ману.

Хай яны ідуць у мой народ,
Хай знікае бруд і тае стынь...
Дай хоць крыху ад сваіх шчадрот
Перамог і ўзнёсласці...

Амінь!

Віцебск — Наваполацк.
1989—1990 гг.

КУЛЬТУРА Ў НЕБЯСПЕЦЫ

Выступленне Барыса САЧАНКІ

Мы, беларусы, шчаслівыя і разам з тым няшчасныя людзі. Шчаслівыя, бо ў нас, як і ў большасці народаў, ёсць свая зямля, свая мова, свая культура, сваё мінулае і сваё будучае. Няшчасныя, бо маючы, здаецца, усё, што трэба, мы, тым не менш, не мелі цягам стагоддзяў сваёй дзяржаўнасці. І не мелі не таму, што не дараслі да яе ці не хацелі, а таму, што як пісаў Якуб Колас:

Тут схадзіліся плямёны
Спрэчкі сілаю канчаць,
Каб багата адароны
Мілы край наш зваяваць.
А нас цяжка ў сэрцы раніць,
Пад прыгон узяць навек,
Нашы скарбы апаганіць
Душу вынесці на здзек,
Каб у віры той ашукі
Знішчыць нашы ўсе сляды
Каб не ведалі і ўнукі,
Хто такія іх дзяды.

І кожны, хто прыходзіў з агнём і мячом на нашу зямлю, прыносіў сюды і свае парадкі, імкнуўся калі не фізічна знішчыць нас, дык духоўна. Насуперак усім фактам даказвалася, што беларусы ніякі не народ, што ў нас няма сваёй гісторыі і культуры, а тая мова, на якой спрадвеку гаварылі і пісалі нашы продкі, — зусім не мова, а ўсяго толькі дыялект. Словам, рабілася ўсё, каб як найхутчэй забыліся на ўсё сваё, роднае, каб калі не зусім знішчыць, дык прыбіць, прыглушыць у кожным з нас нашу самасвядомасць, нашу нацыянальную годнасць. А, заадно, навязвалася ўсё чужое — мова, культура і нават звычаі. Так было пасля Люблінскай і асабліва Брэсцкай уніяў, калі пачалася жахлівая паланізацыя краю, калі вышэйшыя колы грамадства, тыя, хто павінен быў бараніць народ, здрадзілі яму, прыняўшы амаль пагалоўна чужую рэлігію, культуру і мову. Так было і пасля раздзелаў Рэчы Паспалітай, калі Беларусь была далучана да «турмы народаў» — Расіі. Мураўёў-вешальнік — яркі прадстаўнік царызму, і, на жаль, не адзіны, хто чыніў здзек над нашым народам, хто не толькі вынішчаў усё жывое і здаровае, але і распрацаваў цэлую сістэму ўціску.

Вялікая Кастрычніцкая рэвалюцыя разняволіла разам з іншымі народамі і наш народ. Па прыкладу іншых беларусы ўзяліся ладзіць сваё жыццё, сваю дзяржаву. Але гэта прадаўжалася нядоўга. Падзеленая на дзве часткі Рыжскім мірам, Беларусь зноў пачала аблівацца не толькі потам яе сумленных працаўнікоў, але і слязамі, крывёю. Картуз-Бярозу, расправу над усякім грамадскім рухам прынеслі польскія ўлады. Не намнога лепшым было жыццё беларусаў і па другі бок мяжы, дзе ўсталяваўся такі — сталінскі — «савецкі» лад, пра які трапна сказаў Янка Купала вуснамі аднаго са сваіх герояў: «Савецкі лад... гэта такая чырвоная паводка... такая, между протчым, паводка, аб якой не снілася ні Фараону, ні Саламону...». Ужо з канца трыццатых гадоў тут планамерна вынішчаліся ўсе самыя культурныя слаі грамадства, тапталася і ганьбавалася наша мова, наша мінулае. Дайшло да таго, што з сумлення народа, нацыянальнага генія Купалы захацелі зрабіць здраднікі і даносчыкі. Янка Купала не вытрымаў — зрабіў спробу самагубства. Як рэагавалі на гэта? Вось дакумент — пісьмо аднаго з тагачасных катаў беларускага народа Гея ў Маскву Постышаву:

«Считаю необходимым сообщить Вам, что вчера, 20 ноября утром покушался на самоубийство Янка Купала — народный поэт Белоруссии...

Янка Купала входил в руководящий центр «Саюза Вызвалення Беларусі», (...) являлся идейным центром нац.-демовской контрреволюции, что нашло отражение и в его творчестве.

Приглашенный для переговоров в ГПУ, Янка Купала упорно отрицал свою принадлежность к какой бы то ни было контрреволюционной организации и не обнаружил ни малейшего желания пойти навстречу нам в смысле хотя бы осуждения контрреволюционной деятельности своих друзей — участников и руководителей СВБ...

Всё это происшествие рассматривается нами как протест против нашей политики борьбы с национал-демократизмом...

(Самый факт покушения на самоубийство мы, конечно, огласке не придаем).

В связи с этим прошу ускорить присылку окончательной редакции информационного сообщения по делу СВБ. Работу среди интеллигенции надо разворачивать во всю и, конечно, молчание нашей прессы связывает нам руки».

«Молчание прессы» было парушана, і «работа среди интеллигенции», як таго і дамагаўся Гей, пачала разгортвацца «во всю» — рукі новых катаў беларускага народа больш не былі нічым звязаны. Толькі пісьменнікаў было рэпрэсіравана больш за 120 чалавек! Былі знішчаны ці накіраваны ў сталінскі ГУЛАГ усе больш-менш вядомыя вучоныя, мастакі, кампазітары, артысты, журналісты, краязнаўцы, тысячы настаўнікаў і студэнтаў, усе тыя, хто не забываў сваю мову і культуру, аддана служыў народу. У тыя гады было знішчана фактычна ўсё лепшае сялянства, якое, гаворачы словамі Энгельса, з'яўляецца «галоўным носьбітам нацыі». Потым, спакваля, але ўсё настойлівей узяліся нішчыць апошняе, што яшчэ заставалася — прыроду, вынішчэнне якой прадаўжаецца і сёння.

Вялікая Айчынная вайна, а ўслед за ёю і аднаўленчы перыяд, масавыя высылкі і вярбоўкі прывялі да незвычайных перамяшчэнняў людзей і нават цэлых народаў, што дало магчымасць Сталіну, Хрушчову, Брэжневу і іх памагатым прываблівымі, высакароднымі лозунгамі інтэрнацыяналізму правесці дэнацыяналізацыю савецкага грамадства, прывіць многім нацыянальны нігілізм. Найбольш у гэтых адносінах пацярпела наша рэспубліка, якая зрабілася своеасаблівым палігонам для самых розных, часам вельмі сумніцельных, эксперыментаў. Народ, хоць і не знішчаны фізічна, але пазбаўлены гістарычнай памяці, мовы і культуры — ужо не народ, а насельніцтва, з якім можна абыходзіцца як заўгодна. І не трэба думаць, што з прыходам перабудовы гэтыя сумніцельныя эксперыменты спынены. Яскравы прыклад таму — чарнобыльская аварыя.

Ну, а ў якім стане апынулася наша мова, гаварыць у гэтай аўдыторыі, думаю, не варта. За рэдкім выключэннем ёю даўно ўжо «не оскверняют уста» кіраўнікі рэспублікі, абласцей і нават раёнаў. А культура? Калі, скажам, як ужо гаварыў В. Зуёнак у сваім дакладзе, ва ўсёй нашай краіне на яе развіццё выдзяляецца паўтара працэнта гадавога бюджэту, што, бясспрэчна, мізэрна мала, дык у Беларусі, дзе культура знаходзілася, як кажуць медыкі, у лятальным стане, і гэтыя куцыя паўтара працэнта скарочаны ўдвая. Даўно ўжо не толькі не будуюцца новыя тэатры, музеі, бібліятэкі, не ставяцца помнікі, але і тыя, што збудаваны нашымі продкамі і не знішчаны заваёўнікамі, паспяхова разбураюцца. А ў якім становішчы знаходзіцца наша галоўная захавальніца кніжнай культуры — Ленінская бібліятэка!.. А ўрадавая? Ей жа не знайшлося месца на ўсіх паверхах велізарнейшага Дома ўрада, выселілі ў падвал!.. Ці не лепш было б паслухацца парады вядомага героя з камедыі А. Грыбаедава:

Уж коли эло пресечь:
Забрать все книги бы да сжечь.

Колькі было пастаноў аб будаўніцтве новага купалаўскага тэатра! І што?.. А ў якіх умовах працуе філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які дае асноўныя кадры ў нашу нацыянальную літаратуру, навуку, культуру? А ў якіх умовах знаходзяцца нашы рэдакцыі! Ды і тое ж выдавецтва «Мастацкая літаратура», якое штогод аддае Міністэрству фінансаў 12 мільёнаў рублёў прыбытку?

Пра музеі і гаварыць не хачацца. Тыя некалькі вартых жалю, што ў нас ёсць, перавялі на гаспадарчы разлік, што раўназначна іх гібелі. А ўмовы, у якіх знаходзяцца самі музеі, ды і тыя, хто там працуе? Адзіны мастацкі музей — а іх па крайняй меры павінны быць у сталіцы тры — Музей нацыянальнага мастацтва, Музей рускага мастацтва, Музей замежнага мастацтва — у такіх цесных умовах, што большасць шэдэўраў вымушаны пыліцца ў запасніках, фактычна хавацца ад народа. І ніхто за ўсё гэта не адказвае.

Культура ў Беларусі ў небяспецы. Прыняты нядаўна з такой цяжкасцю Закон аб мовах забыты, сёй-той, як мне здаецца, не прыступае і не думае прыступаць да яго выканання. Не зроблены адпаведныя захады і да больш шырокага выдання і перавыдання кніг на беларускай мове, азнаямлення са спадчынай. Ды і па прапагандзе лепшых дасягненняў беларускага мастацтва мала што робіцца. І ў далейшым ці будзе хоць што рабіцца для паляпшэння стану культуры, калі нашы дзяржаўныя мужы падумалі, каб у Вярхоўным Савеце рэспублікі былі прадстаўлены інваліды і пенсіянеры, а не падумалі, каб там былі прадстаўлены нашы творчыя саюзы, работнікі культуры. Раней хоць паводле пасад там былі прадстаўнікі гэтых арганізацый. А цяпер? Ні аднаго мастака! Ні аднаго кампазітара! Ні аднаго артыста! Ні аднаго работніка кіно! Ні аднаго бібліятэкара! Ні аднаго работніка музея! Дзе, у якой краіне ды і рэспубліцы такое магчыма? А ў нас, аказваецца, усё можна... Тры пісьменнікі-дэпутаты не ўратуюць ні нашу мову, ні нашу культуру, асабліва калі ўлічыць, што ў дэпутацкім корпусе ёсць такія яе ненавіснікі, як старшыня Мазырскага гарвыканкома ды і некаторыя іншыя, да яго падобныя.

Мне здаецца, Саюз пісьменнікаў павінен стаць ініцыятарам правядзення Усебеларускага форуму работнікаў культуры, на якім варта пагаварыць пра многае, а галоўнае — распрацаваць праграму прапаганды беларускай культуры, аховы яе ад тых, хто яе ненавідзіць і свядома ці несвядома шкодзіць яе развіццю. Форум гэты трэба правесці пад лозунгам: «Работнікі культуры, яднайцеся!» Толькі з'яднаўшыся, мы можам супрацьстаяць таму націску на культуру, які ішоў і ідзе з боку бяздушнага чыноўна-бюракратычнага апарату — ён у нашай рэспубліцы і не збіраецца здаваць свае пазіцыі, заваяваныя, вядома ж, зусім не лепшымі справамі ў часы сталіншчыны і брэжнеўшчыны. Калі што-небудзь добрае ў нас і робіцца, дык не дзякуючы клопатам «прагрэсіўна-кансерватыўнага» кіраўніцтва, а насуперак яму.

Літаральна некалькі слоў пра наш Саюз пісьменнікаў. Ен за апошнія гады вырас, але аўтарытэт яго ў вачах грамадскасці не падняўся. І тут віна не толькі ўсіх нас, пісьменнікаў, нашага праўлення і сакратарыята, а віна і тых, хто не чытае нашых твораў, ігнаруе нашу арганізацыю, не падтрымлівае добрых пачынанняў і парыванняў, а, наадварот, робіць усё магчымае, каб з літаратуры — гонару, славы і сумлення народа — зрабіць яшчэ адню непатрэбства.

І як бы мы тут, на нашым з'ездзе, ні крытыкавалі адзін аднаго, каго б на чале творчага саюза ні ставілі, як бы ні мянялі свой статут, гэта нічога не зменіць, пакуль не будуць зменены ў рэспубліцы адносіны да нашай мовы, нашай культуры, а, значыцца, і літаратуры.

ЗАКЛІКАЮ СТАЦЬ БЕЛАРУСАМІ

Выступленне Вольгі ІПАТАВАЙ

Пераломны, рашучы, але і дзіўны час прыпадае на нашу долю: тысячныя мітынгі называюць кіраўніцтва рэспублікі злачынцамі і патрабуюць яго, сённяшняе і ўчарашняе, прыцягнуць да судовай адказнасці. З другога ж боку, лепшых і сумленных прадстаўнікоў інтэлігенцыі шальмуюць, называюць утрыманцамі і экстрэмістамі. Страты з аднаго і другога боку відавочныя.

У перадвыбарчай кампаніі не заікайцеся, што пісьменнік — пойдуць размовы аб казачных ганарарах, і, напрыклад, запэўнівай не запэўнівай, што жывеш не ў харомах, — не даюць веры! Улада — ужо ў нейкай разгубленасці — штампуе ўказы і законы, спрабуючы, як плацінамі, агарадзіцца ад народнага крыгаходу.

Інтэлектуальны і мастацкі патэнцыял нацыі з натугаю і крывёй выцягвае — то імя, то дазвол насіць Пагоню на пінжаку ці стаяць са свечкай у знак чарнобыльскай жалобы. У той час як незалежнай прэсы — амаль няма, падручнікі выдаюцца па-ранейшаму са сталінска-брэжнеўскай пазіцыі, а народ так і не ведае гістарычнай праўды аб самім сабе.

Сам Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР даведваецца аб спрадвечных беларуска-віленскіх землях, мабыць, у той момант, калі зноў узнікла патрэба ў крыві беларусаў. Тав. Мікуліч тэрмінова прымае няшчасных бежанцаў з Літвы, якія не жадаюць вучыць літоўскую мову. Калі пры такім націску не зажадалі, яны і тут, на Беларусі, не захочуць вучыць чужую — беларускую. Затое трэці тыдзень тав. Мікуліч пазбягае сустрэчы з членамі рады краязнаўчага таварыства, якое Вярхоўны Савет адмовіўся рэгістраваць. Вось «Отечество», якое амаль адкрыта заклікае ратаваць Расію—тую, якая ляжыць да мяжы былой Заходняй Беларусі, там ужо «Усходняя Польшча»—калі ласка!

Нездарма на Гродзеншчыне ў райкомах шчасліва рапартуюць аб імклівым росце таварыстваў польскай культуры. ТБМ там і часткі такой бацькоўскай увагі не мае. Любым гатовы стаць наш ідэолаг — польскім, расейскім, паўднёваафрыканскім — абы не беларускім!

Сумна ад гэтага. Сумна ад трывалага позірку нашых улад выключна ў бок так званых інтэрнацыянальных інтарэсаў. Можа, час думаць і пра свой народ? Пра збаўленне ад крывасмокаў-ведамстваў, пра паветра, грашовыя сродкі беларусаў? Пакуль гэтым займаецца толькі Народны фронт.

На Украіне пісьменнікі ўзялі Рух пад крыло, узнялі яго да сапраўды народнага. Вы скажаце, што там не так вытаптана народнае поле і не так аплявана інтэлігенцыя? Гэта праўда. Там, напрыклад, даўно дазналіся б, чаму зробленыя на заводзе Леніна дазіметры дазволена прадаваць па-за межамі рэспублікі. Я дарма спрабую дайсці да ісціны — пісьменнікаў цяпер проста не пускаюць да рабочых.

Я заклікаю нашых ідэолагаў і дзяржаўных стратэгаў стаць беларусамі. Я заклікаю нашых беларускіх пісьменнікаў стаць дзяржаўнымі стратэгамі і павялічыць свае намаганні — інакш у нашага зняверанага ва ўсім і ва ўсіх народа можа скончыцца цярпенне...

ПРАЎДА ЗАСТАЕЦЦА ДЭФІЦЫТАМ

Выступленне Сяргея ГРАХОЎСКАГА

Літаратура ў нашы дні перастае быць павелічальным люстэркам уяўных поспехаў і перамог, а становіцца барометрам, дазіметрам, компасам, набатам трывогі.

Мы так доўга маўчалі, так доўга хлусілі сабе і людзям у эйфарыі выдуманага шчасця, так доўга былі ў гіпнатычным сне, што цвярозыя думкі, якія цяпер здаюцца банальнымі, баяліся выказаць самым блізкім. І вось прычакалі шчаслівай пары, калі можна гаварыць праўду. Праўда і сумленне былі найбольшым дэфіцытам і ў пэўнай ступені яшчэ застаюцца дэфіцытам.

Прыйшоў час кожнаму адумацца, пакаяцца, паспавядацца, як перад сконам, не азіраючыся ні на прэзідыум, ні на «нінаандрэеўскіх» прынцыпалаў, ні на добраахвотных «кваліфікатараў», нанятых на высокія аклады кіраваць літаратураю. Можа, вы скажаце, каму з нас патрэбны нянькі і апекуны?

Шчыра прызнаемся: усе мы былі канфармістамі—званарамі і алілуйшчыкамі масавага ачмурэння, старанна ружовымі фарбамі малявалі ўкормленых калгасных, раённых, абласных і вышэйшых чыноўнікаў, а заплюшчвалі вочы на махляроў, хабарнікаў, прыстасаванцаў і злачынцаў.

Праўда, не ўсе спакусіліся на танную славу і тлустую скварку. Стоікам у сваіх перакананнях, асобаю з непадкупным сумленнем з першых крокаў у літаратуры быў і застаецца Васіль Быкаў, з паляшуцкай упартасцю лёс людзей на балоце адстойваў Іван Мележ, праўду сказаў у «Дабрасельцах» Аляксей Кулакоўскі. У гісторыю сышоў Караткевіч, сумленна гаварылі тое, што думаюць, Панчанка, Адамовіч, Гілевіч, Дамашэвіч, Карпюк, Казловіч, Алексіевіч, Брыль, Якавенка, Матукоўскі.

Асабліва ўвішныя паслугачы апарату аператыўна адгукаліся раманамі, аповесцямі, паэмамі, п'есамі на кожную «гістарычную» пастанову, а ўсе яны былі толькі гістарычныя. І прамашкі не было: вярхі, задаволеныя якасцю лакіроўкі, не скупіліся на аддзяку. Па чатырыста адданых песняроў узнагароджваліся адным указам!

У царскай Расіі былі ўзнагароджаны толькі прыдворны гісторыяграф Карамзін, аланецкі губернатар Дзяржавін, выхавацель цэсарэвіча Жукоўскі і вернападданы паэт Кукальнік. А колькі ў нас ардэнаносцаў і герояў аўтаручкі? Пісьменнікі заўсёды былі заступнікамі народа, а не прыслужнікамі начальства. Мудра сказаў Аксакаў: «Награждениям не подвергался». А колькі мы патрацілі намаганняў, каб «подвергнуться» любой узнагародзе!

Смешна і прыкра слухаць цяпер, калі, прадстаўляючы аўдыторыі пісьменніка, падпіраюць яго падпоркамі і мыліцамі: «лаўрэат, заслужаны, кандыдат, дэпутат, доктар, акадэмік». Нібыта без гэтых падпорак не паверацъ, што выступае сапраўды пісьменнік.

Многія шчыра верылі, што «наша пакаленне будзе жыць пры камунізме». І я ў 50-я гады па наіўнай даверлівасці сцвярджаў, што Наваполацкі гігант прынясе людзям шчасце, а ён стаў ракавым і ракавым могільнікам для дзяцей і дарослых—праз некампентэнтнасць і абыякавасць да лёсу людзей у імя плана. Амаль нікога з першабудаўнікоў ужо не засталося.

Нашы публіцысты на ўсю краіну загаварылі пра Салігорск, Наваполацк, Чарнобыль, пра гібель Нарачы, Дняпра і Прыпяці. А хто прыслухаўся да голасу Казько, Казловіча, Петрашкевіча, Якавенкі, Віктара Жука, Дуброўскага? Наўкол—зона маўчання. У забруджаных радыяцыяй вёсках будуюць дамы і клубы, узвялі паселішчы за 30-кіламетровую зонаю, а цяпер высяляюць і адтуль. Закапаны ў зямлю народныя мільёны і матэрыялы, людзі зноў беспрытульныя, а хто пакараны за злачынную некампетэнтнасць і абыякавасць? Ніхто.

Чарнобыль, аварыі апошняга часу высвятлялі некампетэнтнасць і разгільдзяйства, а з другога боку—міласэрнасць і спагаду нашых людзей. Недарэчна толькі, калі абвяшчаецца «Тыдзень міласэрнасці». Міласэрнасць павінна быць адвечнаю, асноваю нашага сумлення і маралі. Хацелася б ведаць, колькі ахвяраваў дзецям Чарнобыля аўтар выбуховага рэактара акадэмік Аляксандраў, наш былы міністр аховы здароўя і тыя колішнія кіраўнікі рэспублікі, што ў першыя ж дні трагедыі затыкалі рот Адамовічу і нашым фізікам, каб толькі не «панікавалі».

Здзіўляе бяздумная і безадказная гатоўнасць некаторых наменклатурных дзеячаў аднолькава некампетэнтна кіраваць эканомікай, палітыкай, прамысловасцю, навукаю, сельскай гаспадаркаю, літаратураю і мастацтвам, урэшце ўсё завальваць і зноў выплываць у вышэйшых сферах «у сувязі з пераходам на іншую работу» або на высокую пенсію.

У нас ёсць акадэмічны Інстытут літаратуры, а сапраўднай гісторыі літаратуры няма. Многія члены саюза з вучонымі ступенямі за дзесяцігоддзі не надрукавалі ні радка. Найбольш плённа выступаюць у жанры крытыкі жанчыны: Грамадчанка, Чабан, Савік, Лысенка. З соцень новых кніг рэцэнзуецца 10—15, у многім дзякуючы Алесю Марціновічу.

У залаты фонд літаратуры пара вярнуць глыбока вывучаную творчасць Гартнага, Гарэцкага, Нёманскага, Галавача, Чарота, Мурашкі, Зарэцкага, Дубоўкі, Пушчы, Каваля, Калюгі, Хадыкі, Мрыя, Мікуліча, Шашалевіча — усіх вялікамучанікаў Курапатаў і ГУЛАГа, а ў першую чаргу нашых пачынальнікаў і папярэднікаў, закрэсленых бэндаўскагарбуноўскім дзёгцем. Неабходна аднавіць памяць усіх ахвяраў сталінізму, а мы ніяк не збярэмся выдаць іх творы і ўшанаваць хоць бы мемарыяльнаю дошкаю ў нашым доме. Незразумела, чаму ўрад да гэтага часу не прызнае права на існаванне «Мартыралога Беларусі». У свеце ёсць таварыствы вязняў фашысцкіх лагераў, а мы саромеемся вяртаць народу памяць сваіх слаўных папярэднікаў, нібыта мелі дачыненне да тых злачынстваў.

У многіх звеннях апарату яшчэ засталіся людзі, сфарміраваныя ў даперабудоўчы час, яны, бедныя, не могуць, ды і не вельмі рвуцца перакоўвацца. Калі ім не ўдаецца аспрэчыць і пераканаць апанентаў у адкрытай дыскусіі і яны спрабуюць апраўдацца па радыё і тэлебачанні, дык буйны план высвечвае часта невысокі інтэлект і недасведчанасць.

У рэспубліцы прыняты закон аб мове, але дзейнасць яго пакуль што незаўважная. Гэта трэба дадумацца—5 і 10 гадоў авалодваць роднаю моваю, ад якой выракліся, пераехаўшы ў горад і захварэўшы на «інтэлігентнасць»! Нармальныя людзі куды хутчэй вывучаюць кітайскую, японскую і хіндзі.

Лёс роднай мовы, культуры і літаратуры—наш галоўны клопат. Не адстоім цяпер мы, станем сведкамі заняпаду і знікнення. Наш дом і наш Саюз — бадай, адзіны астравок, дзе ратуецца наша старажытнае і ўзбагацелае слова. Самае парадаксальнае, што бараніць яго даводзіцца беларусам... ад беларусаў, каб зберагчы душу народа, яго гісторыю і будучае.

Ці патрэбен нам Саюз пісьменнікаў? Ён створаны, па трапным вызначэнні Адамовіча, па ўзору калгаса, з міністэрствам у Маскве, з праўленнямі, брыгадамі, брыгадзірамі. Яму няма часу займацца творчымі клопатамі, яго ператварылі ў дэпартамент мітусні. Нашы маскоўскія калегі расколваюцца і адлучаюцца, заклапочаныя барацьбой з выдуманай русафобіяй, а што дзесяцігоддзямі ішла русіфікацыя Беларусі і іншых рэспублік—іх не хвалявала і не хвалюе.

І апошняе. Міністэрства фінансаў з блаславлення «большасці» дэпутатаў—відаць, «вялікіх аматараў» літаратуры, вырашылі да мільёнаў беднякоў далучыць большую частку пісьменнікаў. Яшчэ жывыя душыцелі Маякоўскага—фінінспектары, відаць, падлічылі мільёны ў літаратурных генералаў, што выдаваліся ва ўсіх рэспубліках і абласцях, і вырашылі аднатыражнікаў, чорнарабочых пяра пасадзіць на штрафны кацёл, нібыта гэтым можна залатаць усесаюзную прарэху—не бачачы мільярдаў ценявой эканомікі, без абмеркавання павышаючы аклады шматмільённай чынакратыі. Вось доказ, як нельга прымаць адзін закон на ўсю вялізную краіну. Патрэбна, каб урад Беларусі ўнёс тут свае карэктывы, калі ён сапраўды суверэнны.

А мы будзем рабіць усё, каб праўдаю і вераю служыць нашаму народу, яго добрай і светлай душы, каб зберагчы ўсе духоўныя і матэрыяльныя здабыткі папярэднікаў і сучаснікаў, каб хоць нешта светлае пакінуць нашым нашчадкам.

ШТО СЕЯЛІ, ТОЕ І ЖНЁМ

Выступленне Генадзя БУРАЎКІНА

Прашу мне вялікадушна дараваць, але я не буду гаварыць аб нашых спецыфічна прафесійных справах, аб нашых «чыста» літаратурных узаемадачыненнях. І не таму, што лічу справаздачны перыяд бясплённым для беларускай прозы і паэзіі, драматургіі і крытыкі. Не, я з сапраўдным хваляваннем і пачуццём гонару за родную літаратуру чытаў, напрыклад, у гэтыя гады новыя творы Пімена Панчанкі і Васіля Быкава, Рыгора Барадуліна і Віктара Казько, Уладзіміра Някляева і Аляксея Дударава... З вялікай усцешнасцю і надзеяй сустрэў я прыход у наш саюз Анатоля Сыса, Сяргея Сокалава-Воюша і іхніх маладых таварышаў. І ўсё ж у наш час глыбінных грамадскіх зрухаў і надзвычайнай палітызацыі жыцця я хачу хоць коратка падзяліцца з вамі горкім роздумам аб стане культуры ў рэспубліцы, аб тым самазадаволеным раўнадушшы да духоўнага як «зверху», так і «знізу», якое вымушае крыкам крычаць з усіх магчымых трыбун і перш за ўсё з гэтай.

Вы ўсе добра ведаеце вынікі выбараў народных дэпутатаў нашай роднай рэспублікі. Дарэчы, гэтыя вынікі на адной з апошніх сесій Вярхоўнага Савета БССР мінулага склікання бліскуча прадказаў Ніл Гілевіч. Выбаршчыкі даволі дружна адмовілі пісьменнікам у праве на давер і, відаць, упершыню ў пасляваеннай гісторыі да крыўднага бедна будуць прадстаўлены ў беларускім парламенце «інжынеры чалавечых душ». Ну што ж, магчыма, той-сёй з пыхлівых крытыкаў так званай мітынговай дэмакратыі радасна ўсклікне: так ім і трэба, хай не лезуць у вялікую палітыку, хай не баламуцяць народ сваімі экстрэмісцкімі заклікамі да свабоды думкі і абуджэння нацыянальнай свядомасці, працоўнаму люду яны не патрэбны... Можа, і не патрэбны. Можа, і сапраўды выпеставаны ў брэжнеўскія глухія дзесяцігоддзі малаадукаваны дэмагог з каўбасой наперавес заняў ужо ўсе магчымыя рубяжы, і святло розуму і таленту не магло прабіцца ў яго даўно заплюшчаныя вочы. Можа, і папраўдзе, славутая эканамічная стабільнасць вымагае ў нас бяздумнай паслухмянасці і мінімальных культурных запатрабаванняў. Ды ўрэшце, чаго хацець, калі ў рэспубліканскім бюджэце не адзін год традыцыйна на культуру выдаткоўвалася меней аднаго працэнта і ўсе кіруючыя пасады ў нас займаюць «чыстыя» гаспадарнікі! Што сеялі, тое і жнём... І здзіўляцца асабліва няма чаго.

Тое ж, што сярод народных дэпутатаў на сённяшні дзень не аказалася ніводнага мастака, кінематаграфіста, музыканта, артыста, не толькі не суцяшае, а робіць сітуацыю проста жахлівай.

Як вядома, кожны народ вуснамі творчай інтэлігенцыі — іх словам, песняй, фарбай — пакідае аб сабе памяць у вяках, перадае веды аб сабе іншым насельнікам зямлі. Даруйце за рэзкасць—не каўбасой, не калійнымі ўгнаеннямі і нават не трактарамі, а творчасцю пісьменнікаў, мастакоў, музыкантаў. Дык што ж — сучасны беларус не хоча пакінуць аб сабе памяць сваім нашчадкам і іншым народам? Ці — няма каму гэта зрабіць? Ці — не засталося ў душы нічога свайго, адметнага?.. Я не веру, што так думае наш працавіты, цягавіты і негаваркі, але шчыры і добры народ. Калі хто так і думае, дык гэта бессмяротны, нахабны чыноўніцкі апарат, які і сёння бачыць у людзях вінцікаў усемагутнай дзяржаўнай машыны, пешак у сваіх кабінетных гульнях. І наіўна думаць, што апарат гэты зусім не пакінуў следу сваёй бесперапыннай дзейнасці не толькі ў эканоміцы, палітыцы, а і ў чалавечых душах. Хіба гэта не ён у газетным допісе наіўнага рабочага папракаў нас кавалкам хлеба? Хіба гэта не ён блаславляў дысцыплінаваных ветэранаў і маладых актывістаў на тое, каб яны дружна даказвалі, што дзяржаўнасць беларускай мовы нікому не патрэбна, а «Мартыралог Беларусі» — ледзь не варожая арганізацыя? І хіба не ён станавіўся непераадольнай сцяною на шляхах да чарнобыльскай праўды?..

Ён — гэта славуты і дасюль непераможаны бюракратычны апарат, гібкі хрыбетнік камандна-адміністрацыйнай сістэмы, ніколі не любіў культуру, бо яе развіццё не можа быць без дэмакратыі, свабоды выказвання і спаборніцтва ідэй. І трэба аддаць яму належнае — у нашай рэспубліцы, ва ўсякім разе, ён дасягнуў значных поспехаў. Яго намаганні па адціранні інтэлігенцыі ў цёмныя закуткі нашага агульнага дома дарма не прапалі. Выбары гэта прадэманстравалі адназначна. Як пісаў паэт, «что ж, веселитесь...». Толькі вось з маёй душы ніяк не выходзіць недаўменне: чаму ж гэта ні на мітынгах, ні на сходах, ні на пленумах, ні на парадах, дзе так гучна (і правільна) гавораць пра пустыя паліцы магазінаў, ніхто нават шэптам не заікнуўся пра пустыя душы многіх людзей? Няўжо іх лягчэй і прасцей напоўніць, чым вясковыя крамы і сталічныя універмагі? І няўжо атрутная жыжка вялізных свінагадоўчых комплексаў назаўсёды замуціла крышталь нашых жвірыстых крынічак?

У сувязі з нагаданым спецыяльна хачу спыніцца на лёсе слаўнага нашага Полацка. Не таму, што ён скора збярэ гасцей на 500-гадовы юбілей свайго мудрага сына — Францішка Скарыны, а таму, што жыць многім яго гістарычным рэліквіям засталося самае вялікае сем—дзесяць год. Я бачыў гэта нядаўна, як кажуць, на свае вочы. Асыпаюцца муры, парахнеюць сцены, раўнуюцца вуліцы. І знікае, як прывід, гісторыя, такая па-мужыцку трывалая і ўсё ж такая кволая.

У друзе маўкліва канае памяць XII, XIV, XVIII стагоддзяў. Тая, якой няма ні ў якім іншым месцы не толькі Беларусі, а і ва ўсяго славянства. Гэта гучыць дзіка, але ў нас не знайшлося золата, каб пакрыць ім купалы чароўнай Сафійкі, той, чые родныя сёстры ззяюць на сонцы ў Кіеве і Ноўгарадзе. На дзесяткі геройскіх зорак брэжнеўскага Палітбюро знайшлося, а на Сафійку — не... Давайце ратаваць наш стары Полацк, давайце дабівацца, каб стаў ён цэнтрам міжнароднага турызму, каб і Ефрасіння Полацкая, і Францішак Скарына, і Сімяон Полацкі сталі вядомымі і дома і ў далёкіх краях. Колькі ж можна трываць і маўчаць!

На жаль, маўчаць мы навучыліся куды як здорава. І тады, калі гаворка ідзе пра сівую даўніну. І калі нехта ўздымае голас, дык часцей за ўсё застаецца адзін, а вось калі маўчым, дык ужо калектыўна. А час ад часу трэба ж і калектыўную думку выказаць, калі мы сапраўды саюз талентаў, таварыства аднадумцаў. Вось ужо каторы год бесцырымонна абражае, зневажае нашых таварышаў, знакамітых празаікаў, паэтаў, публіцыстаў добра вядомы ўсім «Политический собеседник» — і мы даволі спакойна назіраем, як адстрэльваюцца ад яго кананад Васіль Быкаў, Алесь Адамовіч, наш пасмялелы «ЛіМ». Я не буду цытаваць бумажкоўскія ці семашкоўскія «перлы», не буду дэманстраваць прыёмы так званай «палемікі», якія дазваляе сабе грамадска-палітычны часопіс, я толькі нагадаю прозвішчы тых, хто падвергнуты грубай безапеляцыйнай «праборцы» — акрамя традыцыйна ненавісных «Политическому собеседнику» Васіля Быкава і Алеся Адамовіча, гэта — Рыгор Барадулін, Віктар Казько, Святлана Алексіевіч, Барыс Сачанка, Сяргей Законнікаў, Валянцін Блакіт, Анатоль Сульянаў, Іван Ласкоў, Аляксей Карпюк, Анатоль Сідарэвіч, Васіль Якавенка... Магчыма, я назваў далёка не ўсіх, але, думаю, дастаткова, каб зразумець, якія розныя пісьменнікі не падабаюцца «Политическому собеседнику» і ўсё — па так званых ідэалагічных матывах. Твораў аўтары часопіса практычна і не ўпамінаюць (можа, таму, што проста не чыталі іх). Ды і цяжка дагадзіць літаратурным густам рэдакцыі, якая ў чацвёртым нумары за гэты год выдае за паэзію такія практыкаванні:

Не за то наши предки костьми полегли,
Чтоб Россию теперь разбазарили мы.
Не затем мы Державу крепили свою,
Чтобы нынче отдать неизвестно кому.

Па-мойму, гэтыя опусы аднолькава яркія як у адносінах да законаў вершаскладання, так і з пазіцый палітычнага гледжання на нашу ўчарашнюю і сённяшнюю гісторыю.

Тых, хто яшчэ не трапіў на бязлітасны суд часопіса, магу заспакоіць — у вас яшчэ ўсё наперадзе, дарагія сябры, бо ходзяць упартыя чуткі, што, нягледзячы на жорсткі недахоп паперы (праблемы ажно з друкаваннем падручнікаў), у бліжэйшы час «Политический собеседник» павялічыць свой аб'ём яшчэ на 2 друкаваныя аркушы. Так што месца хопіць на ўсіх...

А калі казаць сур'ёзна, дык я лічу, што мы абавязаны засведчыць свае адносіны да зместу шырока вядомага сваёй кансерватыўнай пазіцыяй часопіса — дарэчы, любімага друкаванага органа таго апарату, пра які я тут нагадваў. Можа, гэта, як лічаць скептыкі, не зменіць нічога. Але давайце не дапусцім, каб праз дзесяткі год, калі час дасць аб'ектыўную і суровую ацэнку сённяшнім справам і словам, дзеці нашы і маладыя нашы паслядоўнікі папракнулі нас у адсутнасці прынцыповасці і мужнасці. Хай яны бачаць, што мы калектыўна ведалі цану «палітсубяседнікаўскім» практыкаванням і не мірыліся ні з тым, калі ноччу ўламваліся ў зачыненыя дзверы нашага агульнага дома, ні з тым, калі лезлі з невуцкімі павучэннямі ў нашы спакутаваныя душы. Таму я прапаную прыняць спецыяльную рэзалюцыю з'езда з вызначэннем нашых адносін да публікацый часопіса «Политический собеседник». Тэкст яе, на мой погляд, мог бы быць прыкладна такі: «Х з'езд пісьменнікаў Беларусі рашуча асуджае публікацыі часопіса «Политический собеседник», якія ў зневажальнай форме бяздоказна і безадказна выстаўляюць палітычныя абвінавачванні многім вядомым пісьменнікам, што можа прывесці да непатрэбнай канфрантацыі і проціпастаўлення творчай інтэлігенцыі рабочаму класу і сялянству рэспублікі.

З'езд просіць Цэнтральны Камітэт Кампартыі Беларусі, чыім часопісам з'яўляецца «Политический собеседник», прааналізаваць работу рэдкалегіі і рэдакцыі часопіса і прыняць неабходныя захады да павышэння яго тэарэтычнага і журналісцкага ўзроўню, які адпавядаў бы задачам і мэтам перабудовы».

Толькі тады, калі мы будзем адкрыта заяўляць і адстойваць свае прынцыповыя пазіцыі, мы можам разлічваць на павагу і давер роднага народа. Давайце ж не толькі памятаць аб гэтым, а і кіравацца гэтым штодзённа — і ў кнігах, і ў грамадскай дзейнасці!

ЗА ХЛЕБ, ЗА ГОНАР, ЗА ПРАЎДУ...

Выступленне Васіля БЫКАВА

Вядома, што на гэткім прадстаўнічым форуме, як наш з'езд, хацелася б гаварыць найперш пра чыста літаратурныя справы: пра нашы тэмы, стыль, ступені нашага літаратурнага майстэрства, пра нашых герояў-сучаснікаў так, як гэта мы рабілі пяць, дзесяць і дваццаць гадоў таму, калі шчыравалі з такіх трыбун, каб павярнуць літаратуру тварам да здзяйснення сучаснасці, да нашых герояў-працаўнікоў, да несумненных заслуг мудрага кіраўніцтва і, вядома ж, авангарднай ролі партыі, якая так паспяхова вяла нас ад перамогі да перамогі. Але вось настала прабуджэнне, хваравітае працверазенне пасля шматгадовай эйфарыі, і свет убачыў, што нашы героі — не больш, чым пухіры, надзьмутыя нашай фантазіяй, рай наш — нішто іншае, як галеча (па рэйтынгу на 57 месцы ў свеце), а «наш ум, честь и совесть» вяла нас туды, куды і сама не ведала. Значыць, завяла, як той міфічны Сусанін... Дзе цяпер выйсце з гэтага тупіка і заняпаду, у якім апынуліся, а найболей — у якіх яшчэ апынемся? А што апынемся, тое відавочна ўжо для цэлага свету.

І вось дзіва! Як ішлі ў той нерат — быццам ніхто і не заўважаў, не біў трывогу, не пратэставаў, не толькі не спаліў сябе на плошчы, як той беспрацоўны славацкі камуніст, але нават не пасварыўся з начальствам. Каб нічога таго не заўважалі, не бачылі, дзень і ноч побач грукаталі глушылкі і шчыравалі ўсе органы, парткомы, арганізацыі — ад ЦК да Саюза пісьменнікаў. Столькі сілы і грошай было патрачана на тое, каб схаваць найперш ад саміх сябе найвялікшы дзяржаўны сакрэт — бег да прорвы. Для таго ствараліся песні, пісаліся раманы. Краіна жыла ў штучна створанай і старанна падтрыманай эйфарыі благадзенства і праведнасці. Цяпер настала эйфарыя іншага зместу: эмоцыі гневу заклекаталі ў нашых грудзях. І гэта добра, што яшчэ захавалася здольнасць душы да неспакою, да хоць бы спазнелага і боязнага пратэсту. У тым пэўная ацэнка таго, што нацыя не ўмёрла ў сваёй стогадовай быдлячай пакорнасці.

Але перабудовачныя зрухі апошніх год абудзілі не толькі праведныя народныя эмоцыі. Прахапіліся ад спалоху і іншыя сілы. З розных куткоў краіны, і асабліва з верхніх паверхаў кіраўнічых гмахаў, пачуліся слёзныя крыкі: нішчацца высокія арыенціры, хістаюцца ўстоі, глядзі, рухне ўвесь так старанна збудаваны палац народаў і настане канец. Але каму канец? Калі чытаеш у «Политическом собеседнике» несканчоны лямант наконт пагібелі асноў, дык цяжка адмовіцца ад думкі, што некаму, відаць, ёсць што губляць са стратай тых шматгадовых устояў, інакш бы так не лямантавалі. І, праўда, ёсць. І сярод гэтых страт — найперш, вядома, яе вялікасць улада над уся і ўсім, чароўная адмычка ад усяго іншага жаданага і звабліва ў жыцці.

Так, улада. Гэта некалі ў мінулым людзі імкнуліся да традыцыйных даброт жыцця: зямлі, грошай, маёмасці, — таго, што давалася працай, часам катаржнай працай некалькіх пакаленняў. Цяпер жа, каб дасягнуць жаданага, трэба зусім іншае і найперш — паслужлівасць. Розум, дзелавітасць, сумленне не толькі неабавязкова, але часцей за ўсё і замінае. Значыць, толькі паслужлівасць. Без гэтае самае распаўсюджанае пошасці веку не можа абысціся ніхто — ні чыноўнік, ні навуковец, ні мастак. Усё — талент, шчырасць, дабрыню, розум — перамагае магутны молах улады, тыя, хто мае ўладу, што на паўдарозе да яе, хто мае патэнцыяльныя дадзеныя для таго. Перад уладай не можа ўстаяць ніхто. І калі сярод нас знаходзяцца тыя, што могуць сёння сказаць, што яны не залежныя ад яе, што яны ўбераглісяад яе смяротна-зваблівых чараў і жывуць вольнымі людзьмі, дык мы павінны зняць шапку перад гэтымі нешматлікімі людзьмі. Павінны, але ці здымем? Ці таму нас вучыць жыццё? Хутчэй за ўсё мы іх узненавідзім: за тое, што яны не такія, як мы, не такія дробязныя трапетуны, як многія, і могуць сказаць, што думаюць. І нават выйсці на плошчу. Але тым яны быццам прыніжаюць нашу мізэрную годнасць і прычыняюць клопат. А калі яшчэ да ўсяго дадаецца іх несумненны талент, дык наогул нашай непрыязі няма мяжы. Ужо тут мы не дамо ім узвысіцца хоць бы з прынцыпу. Мы іх імкнёмся прынізіць, паставіць у наш звыклы рад. Любячы літаратуру, усё ж сябе мы любім болей за ўсё. Раней для таго прыніжэння былі хлёсткія азначэнні: «попутчик», «вораг народа», «ідэалагічны дыверсант». Цяпер не меней хлёсткія: «нефармал», «дэмакрат», «народафронтавец». Але ці не час паразумнець некаторым нашым энтузіястам, у тым ліку і пісьменніцкім: часы ўсё ж мяняюцца.

Цяпер нярэдка пачуеш, што Саюз пісьменнікаў не адпавядае новаму часу, састарэла яго структура, патрабуе абнаўлення кіраўніцтва. Правільна, і састарэла, і не адпавядае. Але Саюз пісьменнікаў — гэта найперш мы самі, і кіраўніцтва такое, якога мы заслугоўваем, ні больш і ні менш. Калі паглядзець, палітычная свядомасць СП, нашы палітычныя ідэалы на ўзроўні свядомасці гуртка рыбаловаў-аматараў, дык чаго ж чакаць ад праўлення, прэзідыума, сакратарыята? І чаго чакаць ад народа, калі ягоную інтэлігенцыю, творцаў і майстроў прыгожага, столькі гадоў ператварылі ў нясмелую, замуштраваную групку дзіцячага садзіка, да якой найбольшае патрабаванне, каб сядзела ціха. І сядзелі ціха. Дзесяцігоддзямі сядзелі, бяскрыўдна дазваляючы папінаць сабою зграі ідэалагічных наглядчыкаў, сярод якіх адзін С. Паўлаў чаго варты. Я падтрымліваю сённяшнюю прапанову наконт выключэння Паўлава з Саюза пісьменнікаў, хоць бы за яго антынародную, антынацыянальную дзейнасць на яго ранейшай пасадзе, за тое, што ён увогуле пастараўся накіраваць іншыя класы супраць інтэлігенцыі, супраць творчых саюзаў і, канешне, дамогся ў гэтым сэнсе пэўных і значных поспехаў.

Людзі могуць быць розныя — беспрынцыпныя і бяспамятныя, гісторыя жыве па сваіх законах і рупна робіць свой беспрыстрасны рэестр. Ад яе пільнага вока не засцеражэцца ніхто. І тут нельга адкараскацца ад думкі, што мы, беларусы, нясём на сабе нейкую каінавую пячаць праклёну за невядома якія грахі, у мінулым ці будучым. Я ўжо не кажу пра Чарнобыль — гэты гіганцкі атамны генацыд, які, здаецца, усё ж даканае нацыю. Асабліва пры такой эканоміцы і такой палітыцы, і такім начальстве, трэба сказаць. Незабыўны наш Караткевіч некалі расказваў прытчу, як Бог, стварыўшы зямлю, размяркоўваў яе між народамі. Нехлямяжыя беларусы, вядома ж, спазніліся. Усё ўжо было падзелена, апроч аднаго райскага кутка з мяккім кліматам, лясамі і барамі, рыбнымі рэкамі, урадлівымі палямі. І гэты куток Бог аддаў беларусам. Але каб тыя занадта не ганарыліся, прыставіў да іх надта ж благое начальства. За шмат стагоддзяў, што мінулі з тых біблейскіх часоў, парадзелі лясы, запаскудзіліся рэкі, клімат змяніўся, але якасць нашага начальства застаецца нязменнай.

Столькі гадоў нацыя без лідэра. Ва ўмовах дэмакратыі дык, можа, гэта было б і няблага, але ж нам да дэмакратыі — як да таго гарызонту, які ўсё аддаляецца. Пакаленні пражылі без яе і, мусіць, яшчэ будуць жыць новыя. Але як во пражыць без начальства? Азіраючыся цяпер назад, пры не надта і вялікім веку, бачыш, як небагата было сярод іх вялікага мноства людзей людскіх, у якіх за гады іхняй кар'еры не вытруцілася чалавечае ў душы. Зрэшты, мы не максімалісты. Беларусь абышлася б і без выдатнага кіраўніцтва, але з такім, якое б не шкодзіла, не душыла, не цугляла нацыю на кожным кроку. А то па цуглянню наша рэспубліка, безумоўна, самая перадавая ў Саюзе. Нездарма Алесь Адамовіч так трапна ахрысціў яе «вандэяй перабудовы».

Сапраўды, на што мы дзесяткі гадоў трацілі свой грамадзянскі імпэт, свой творчы запал? На змаганне за тое, што даўно ўжо дасягнута ў самых слабаразвітых краінах, што для якой-небудзь Верхняй Вольты — пройдзены і забыты этап. Дзесяткі гадоў мы змагаліся за родную мову, некаторыя касцьмі клаліся ў тым змаганні, як, напрыклад, Уладзімір Дамашэвіч, калі памятаеце. Закідвалі пісьмамі і енкамі ЦК КПСС, Гарбачова, за што іх пасля па адным цягалі ў ЦК на допыты, па сутнасці, на здзек, бо ўсе пункты скаргаў ЦК КПБ разам з падначаленымі яму міністэрствамі настойліва абвяргалі. І гэтыя скаржнікі выступалі ў якасці, канешне ж, паклёпнікаў. Сёння, калі абставіны трохі змяніліся, аддамо належнае нашым братам — мастакам Беларусі, некаторым з навукоўцаў, настаўнікам, імёны якіх цяпер і не ўспамінаюцца. Гэта цяпер, калі стала можна, Таварыства беларускай мовы раскашуе ва ўсенародным афіцыйным прызнанні, і дай яму Бог раскашаваць далей. Тое, што гэта таварыства робіць, вядома, трэба рабіць, але і не трэба заспакойвацца, па сутнасці, нічога яшчэ не дасягнута. Трэба зразумець, што доўгачаканы акт надання дзяржаўнасці беларускай мове не больш чым чарговы бюракратычны манеўр, нацыянальны падман. Пры цяперашніх далёкіх ад дэмакратыі пазіцыях нашага кіраўніцтва праблема нацыянальнай мовы застаецца пад вялікім пытаннем. Для таго, каб беларуская мова стала сапраўды народнаю, дзяржаўнай моваю, відаць, патрэбна змена ўсяго антынацыянальнага, сервілісцкага ладу на суверэнны, дэмакратычны, што пакуль нам і не свеціць. Мабыць, мы яшчэ не дараслі да таго. Да таго дарасла Балція, а не Беларусь, рукамі якой цяпер спрабуюць душыць яе боскую ініцыятыву да волі. Саюзны Вярхоўны Савет прымае законы аб крымінальнай адказнасці за тэрытарыяльныя прэтэнзіі, а Прэзідыум Вярхоўнага Савета нашай рэспублікі выдае заявы аб такой прэтэнзіі да Літвы. Сорам гэтай ганебнай акцыі падае, вядома, і на нас, творчую інтэлігенцыю. Нам найболей адказваць за ганебныя акты, якія падпісваюцца тымі, хто, бы матылі, з'яўляецца і знікае, ні за што не адказваючы. Як яны ні ў нас, ні ў Маскве не адказвалі ні за Венгрыю пяцьдзесят шостага года, ні за Чэхаславакію шэсцьдзесят восьмага года, ні за Афганістан. Нам жа заставацца на гэтай зямлі і ў яе гісторыі, і, значыць, несці гістарычную адказнасць.

Могуць сказаць: а што мы можам? Сапраўды, што? Мы самі задушаныя, нямыя і бяспраўныя. Дзесяткі год мы змагаліся за рэабілітацыю нашых няшчасных праведнікаў — ад Гаруна да Гартнага і пяці дзесяткаў іншых дзеячаў культуры, на якіх ужо рыхтаваліся новыя абвінавачванні, так сказаць, пасмяротныя, на другім заходзе. Год назад Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР праз Вярхоўны суд рэспублікі ўрэшце рэабілітаваў вялікую іх групу, але без удзелу кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў. Кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў у той час вяло зацятую вайну з беларускім народным фронтам і нават не пасварылася з начальствам. Як жа? А раптам начальства разгневаецца і адмовіць у сваёй панскай міласці?

Факт ганебнага ўварвання ў пошуках бомбы, вядома ж, ніхто не расследаваў, і не развеяны падазрэнні, што некаторыя з апаратчыкаў СП і навялі міліцыю на гэты начны ўзлом. Я ўстрымліваюся ад каментарыя гэтага факта, няхай яго ацэніць наша шаноўная грамада. І што ж, на тым усё сціхла? Бомбу не знайшлі, дакументы забралі і ўсё скончылася? Скончылася хіба ў аператыўных зводках карных органаў, але для гісторыі толькі пачынаецца. І ўсё тое, безумоўна, праявіцца ў жыцці наступных пакаленняў, дзяцей тых дзяўчынак і хлопчыкаў, якіх лупцавалі веласіпеднымі ланцугамі каля Траецкага прадмесця, якіх труцілі газамі каля Маскоўскіх могілак, білі міліцэйскімі палкамі каля Курапат, дзе здаўна ляжаць у брацкіх магілах іхнія дзяды і прадзеды. Такое не забываецца, не знікае ў памяці народа і ягонай гісторыі, якія б высілкі для таго ні рабілі партыя, КДБ, МУС, нашы псеўдавучоныя ад Абэцэдарскага да Залескага.

(Працяг на стар. 8).

X з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі

(Пачатак на стар. 7).

Тупы жандарскі бот па-ранейшаму папірае і фізічнае існаванне нацыі, і яе стогадовыя духоўныя набыткі, якія яна па крошцы выпрацоўвала ўласнымі высілкамі і сухотамі сваіх найлепшых людзей, збірала і зберагала праз войны, голад, галечу і іншаземнае панаванне. Народ — сірата без лідэра, гэта элементарна. Але яго будучае не безнадзейнае, калі ён мае ўласную інтэлігенцыю, бо менавіта інтэлігенцыя генерыруе ідэі і з'яўляецца жыватворным ферментам палітычнага працэсу ў грамадстве.

Відома, у мастацтве найперш талент, але, апроч таленту, яшчэ так неабходна і сумленне. І калі талент ад Бога, дык сумленне, хоць і не цалкам, але ў значнай меры ад нашае чалавечае волі. І калі мець на ўвазе наш дужа няпросты час і наша мастацтва, дык у іх, мабыць, болей усё вырашае менавіта сумленне — сумленне ва ўсім: у стаўленні да народа, да гісторыі, да сучаснасці і будучыні.

Ці трэба нам сваё карпаратыўна-цэхавае аб'яднанне, свой прафесійны творчы саюз? Безумоўна, патрэбны. Толькі не такі, якім мы ўжо сытыя па горла: не як зброя ўлады супраць літаратуры, не сродак уціску, а такі, каб выражаў волю большасці, нашу волю і нічыю болей. Не «міністэрства літаратуры», падпарадкаванае — каму толькі не падпарадкаванае? — ад ЦК да аддзела міліцыі, не дэпартамент папяровых спраў з трыма паверхамі пісцоў-чыноўнікаў, а наш родны дом, наша царква, калі хочаце, у якой бы пісьменнік мог знайсці праўду і абараніць свае інтарэсы. Нам патрэбна такое кіраўніцтва, якое б не кіравала намі і не дазваляла каму б там ні было кіраваць сабой. Каб мела свой гонар і паважала гонар іншых, але найперш сваіх членаў і членаў іншых братніх творчых саюзаў. А калі якая несправядлівасць, уціск ці занядбанне літаратуры або грамадства, каб мела адвагу сказаць пра тое перад усім светам, а то і выйсці на плошчу і павесці за сабой тых, хто яшчэ адважваецца «людзьмі звацца». Што, занадта? Не, не занадта! Іншых і розных у нас ужо было даволі. Цяпер патрэбны менавіта такія, тым болей, што часы наступаюць далёка не райскія, горкія і цяжкія часы. Барацьба будзе зацятай — за хлеб, за гонар, за праўду, за сябе і нашага цярпліўца-народа.

Сёння мы адмаўляемся ад спадчыны сталінска-брэжнеўскай сістэмы. І правільна робім. Але ці павінны мы не паважаць сваіх старэйшых таварышаў, якія нібыта пісалі не так і не пра тое, як нам здаецца?

Размовы аб традыцыях, так званай традыцыйнасці. Хто сёння скажа, што такое арыгінальнае і што такое традыцыйнае? Тое, што было сто гадоў назад арыгінальнае, цяпер традыцыйнае, што было традыцыйнае — арыгінальнае... Нам стваралі традыцыі нашы класікі Купала, Колас, Чорны, Багдановіч, Мележ. Дык што, нам адмаўляцца ад класікаў сваіх, ад бацькоў? Некаму гэтага і хацелася б, але, мяркую, у многіх таварышаў рэалістычны погляд на рэчы і душа, якая жыве болем і трывогай народа.

Любоў, нянавісць, нараджэнне і смерць чалавека — гэта адвечныя ісціны, якія не здолее адмяніць ніводны сацыяльны лад. І, канечне ж, нашы кнігі павінны быць пра чалавека, пра тое, як ён радуецца і пакутуе, пра тое, як нараджаецца і памірае. Мы проста людзі на гэтай зямлі, а пасля ўжо рабочыя, сяляне, інтэлігенты. У сувязі з гэтым не магу не сказаць, што забываем пра сваіх таварышаў, якія пайшлі ўжо ад нас. Толькі ўспомнім некаторых пад час нейкага юбілею. Тое, што я кажу, патрэбна не мёртвым, яно патрэбна жывым...

Наконт структуры СП. Важна, не хто працуе, а як працуе. Лічу, што павінен быць старшыня саюза, сакратар па арганізацыйных і два сакратары па творчай рабоце. А работы ў нашым Саюзе пісьменнікаў непачаты край.

МЫ — ЧАСЦІНКА НАРОДА

Выступленне Віктара СУПРУНЧУКА

Надта бурлівы, супярэчлівы і напружаны ў сацыяльным плане сённяшні час. За мінулыя ад папярэдняга з'езда чатыры гады было рознае. Слова «пісьменнік» ужывалася ў некаторых рускамоўных выданнях з іроніяй, са здзекам. Па раёнах рэспублікі распаўсюджвалася інфармацыя аб вядучых літаратарах як аб экстрэмістах. Людзі, асабліва ў вёсках, часта верылі гэтаму.

І ўсё-такі пісьменніцкае слова гучала са старонак газет і часопісаў, на радыё і тэлебачанні. Заклікала беларусаў да нацыянальнай свядомасці, да адраджэння роднай мовы. Гэта было напачатку таксама сустрэта адмоўна. Якое, маўляў, нацыянальнае адраджэнне, калі мы найвялікшыя інтэрнацыяналісты!

Нарэшце прыняты Закон аб мовах, да якога маюць вялікае дачыненне пісьменнікі. Можна было б радавацца, што ажыццёўлена гістарычная справядлівасць, вернута народу адабранае. Толькі насцярожвае, што ёсць у рэспубліцы сілы, здольныя тарпедаваць гэты закон, які толькі-толькі пачынае жыць.

У нашай сітуацыі найвялікшая патрэба ў стварэнні выдавецтва Саюза пісьменнікаў, пра што ўжо казаў Васіль Зуёнак. Новае кіраўніцтва, выбранае на з'ездзе, павінна лічыць гэта задачай нумар адзін. Магчыма, вырашыўшы праблему з выдавецтвам, мы зможам хоць неяк сацыяльна застрахавацца і выжыць у тым хаосе, які чакае грамадства.

Мяркую, што правы пісьменніка саюз павінен адстойваць цвёрда і прынцыпова і з любога боку — з юрыдычнага, маральнага, матэрыяльнага. Дарэчы, даўно наспела неабходнасць мець у апараце СП кваліфікаванага юрыста, без дапамогі якога проста складана будзе існаваць пісьменніцкай арганізацыі ў сённяшніх умовах.

Хацелася б бачыць наш саюз сапраўды творчым, без групаўшчыны. Кожны пісьменнік — гэта асоба, індывідуальнасць. Яму важна, каб былі стол, папера, пішучая машынка і нармальныя хатнія ўмовы, бо кватэра — яго «цэх», майстэрня. Каб выдаваліся кнігі, якія ён піша. І калі пачынаюць утвараць групоўкі з тых ці іншых літаратараў, я за гэтым бачу толькі амбіцыйнасць і асабістую карыслівасць.

Вельмі прыкра, што некаторыя маладыя (маецца на ўвазе не толькі ўзрост), нарэшце ўступіўшы ў члены СП, пачынаюць ганіць свой саюз. Навошта ж уступалі? Магчыма, дзеля ілюзорнага дабрабыту, якога не забяспечвае членскі білет? Дабрабыт забяспечвае толькі настойлівая праца за пісьмовым сталом.

Нацыянальна-адраджэнцкая хваля, якая ўзнялася ў грамадстве дзякуючы найперш інтэлігенцыі, веру, верне ў нашага беларускага люду павагу да роднай літаратуры. Але аўтарытэт складваецца з дробязяў. Мне заўсёды робіцца ніякавата, калі, чытаючы выступленне ці інтэрв'ю нашага паважанага паэта ці празаіка ва ўсесаюзным друку, бачу, як ён спасылаецца на Распуціна, Мажаева, Абрамава, Ліхачова і г. д. Безумоўна, гэта разумныя людзі. Толькі ці не збядняем мы сябе? Што, няма мудрага ў Купалы і Коласа, Багдановіча і Гарэцкага, у Быкава і Брыля, Танка і Гілевіча?..

Лічу, што наша беларуская літаратура — самабытная і арыгінальная літаратура. Аб яе правінцыяльнасці разважае толькі той, хто сам нічога вартага для яе не зрабіў альбо хто не хацеў бы беларускасці.

І ГЭТА НЕПАКОІЦЬ...

Выступленне Анатоля СУЛЬЯНАВА

Палітычнае кіраўніцтва краіны нямала зрабіла па ўмацаванні мірных тэндэнцый, па адсоўванні новай вайны, скарачэнні арміі і ваенных выдаткаў. Савецкі народ павінен быць упэўнены, што вайны не будзе. Але гэта магчыма толькі пры ўмове, калі нашы Узброеныя Сілы будуць досыць моцныя ў маральных і ваенных адносінах.

Як жа абстаяць справы з самай цяжкай праблемай — маральнай? Будзем шчырымі — не зусім добра. Падае прэстыж Узброеных Сіл, скарачаецца колькасць абітурыентаў, якія паступаюць у ваенныя вучылішчы, не ліквідавана дзедаўшчына, пагоршыліся бытавыя ўмовы афіцэраў і прапаршчыкаў. Узрасла колькасць «адказнікаў» і «ўцекачоў». Не буду стамляць вас лічбамі. Толькі прызыўнікоў па Мінскай вобласці было «в бегах» за 1989/90 гады — 150. Цяпер, у час нашага з'езда, «в бегах» 30 маладых салдат, прызваных з Мінскай вобласці.

Расце колькасць прызыўнікоў, раней судзімых і якія мелі прыводы ў міліцыю за хуліганства; наркаманаў, асоб, хворых на бытавы алкагалізм. Марудна скарачаецца злачынасць у арміі.

Беларусь доўгія гады займала вядучае месца па выхаванні дапрызыўнай моладзі, абсалютная большасць якой сумленна выконвае патрабаванні канстытуцыі і прысягі. Творчыя саюзы маюць ваенна-шэфскія камісіі. Многія пісьменнікі часта працуюць у вайсковых часцях, штабах, ваенных вучылішчах: Васіль Быкаў, Мікалай Кругавых, Віктар Трасцянскі і іншыя. Пішуць на гераіка-патрыятычную тэматыку Іван Шамякін, Васіль Хомчанка, Віктар Трыхманенка, Мікалай Чаргінец, Леанід Прокша. Выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Беларусь», «Юнацтва», «Народная асвета» выпускалі ў свет нямала добрых, цікавых кніг, патрэбных юнацтву. Хацелася б сказаць добрае слова пра кнігу М. Зяньковіча «Хлапчукі ў пілотках».

Аднак работа па гераіка-патрыятычным выхаванні моладзі значна паслабла. І гэта непакоіць! З экранаў тэлевізараў, кінатэатраў, сцэн, са старонак часопісаў, кніг, газет гэтая тэма знікае. Цяпер галоўны герой экрана — артыстка Нягода з сучаснага секс-фільма «Маленькая Вера»! Навошта фільмы пра армію, пра гісторыю Айчыны, пра беларускія атрады ў бітве пры Грунвальдзе ці на полі Куліковым? Сярод шалёнага енку і аглушальнага крыку інструментальных ансамбляў, якіх безліч, сярод парнасцэн кінематографа, наркаманіі і крымінальшчыны, прастытутак і «рыцараў» мафіі амаль не чуцен голас сапраўднага хвалявання за лёс і маральнае здароўе народа.

На старонках друку з'явілася антыармейская тэматыка. Я далёкі ад думкі, што пра армію трэба пісаць толькі добрае. Не і не! Трэба і крытыкаваць! Але не зараднічаць, не ганьбаваць годнасць вайскоўцаў.

Наш саюз згодна статуту абавязаны абараняць інтарэсы пісьменнікаў. Але што атрымліваецца за апошнія тры-чатыры гады? То раптам пачынаюцца нападкі на Быкава, то на Адамовіча, то на Алексіевіч, то на Карпюка. Але ні праўленне Саюза пісьменнікаў, ні сакратарыят не абараняюць пісьменнікаў ні вусна (па радыё ці ТБ), ні ў друку.

Тут ужо гаварылі пра экалогію. Так, мы п'ём з дапамогай аграпрома ваду, насычаную гербіцыдамі і пестыцыдамі, ужываем поўную нітратаў зеляніну, заносім у арганізм з ежай радыенукліды.

дыхаем атручаным таксічнымі выкідамі паветрам. Прымаліся рашэнні аб вынасе з рысы горада ліцейных вытворчасцей, але яны не выкананы. Мінск увайшоў у першы дзесятак гарадоў па запыленасці і загазаванасці, ды плюс радыенукліды. Здавалася б, трэба берагчы дрэвы, якія ачышчаюць паветра горада. Ды не! Будаўнікі, завальваючы планы па ўводу жылля, школ, дарог, актыўна выконваюць планы па знішчэнні дрэў. Пры рэканструкцыі Слуцкай шашы было знішчана 2000 маладых таполяў і бярозак, а іх можна было перанесці тут жа, на шырыню павелічэння шашы. Больш за 200 дрэў знішчана пры будаўніцтве развязкі каля Маскоўскіх могілак. Ніводнага дрэва не пасаджана! Побач з гаражом ЦК на вуліцы Чырвонаармейскай ёсць някепскі парк. Ён невялікі, недагледжаны, але туды шмат гараджан прыходзяць адпачыць. Нядаўна ў гэтым маленькім парку спілавана 40 дрэў і завезены жалезабетонныя канструкцыі.

І апошняе. Мінск — адзіны горад сярод сталіц саюзных рэспублік, які падвергся яшчэ адной небяспецы — гукавой і вібрацыйнай. Гэта і трактары, уключаючы магутныя «Кіраўцы», што свабодна бегаюць па вуліцах горада, і магутныя цягачы, самазвалы, вялікагрузныя аўтамабілі.

Але я пра іншае. Я пра палёты над горадам магутных бамбардзіроўшчыкаў, якія маюць на борце цыстэрну паліва і самую сучасную зброю. Якую — вы здагадаецеся самі. Выявілася, што палёт бамбардзіроўшчыкаў з уключанымі фарсажамі над Мінскам павялічвае на 12% заўчасныя роды, на 15% — гіпертанічныя крызы ў хворых на сэрца.

Што можна прадпрыняць? Цяпер ідзе скарачэнне УС. Толькі колькасць самалётаў і верталётаў скарачаецца на 800. Відаць, мэтазгодна, абгрунтаваўшы праблему, выйсці з прапановамі ў Міністэрства абароны і Генштаб аб скарачэнні акружной авіячасці ці перабазіраванні яе на іншы аэрадром.

Насельніцтва Мінска даўно мае патрэбу ў больш камфортных умовах пражывання і працы.

БОЛЬШ САМАСТОЙНАСЦІ

Выступленне Валерыя ГРЫШАНОВІЧА

Ёсць адзіны шлях выхаду з забруджанай зоны бязвер'я, у якую трапілі мы ў выніку распаду ў грамадстве элементаў іржы. Гэты шлях ляжыць у гуманістычным накірунку і над ім ззяе зорка Скарыны.

Безумоўна, мы, выдаўцы, прыйшлі да X з'езда са сваёй творчай справаздачай. Ёсць праграма выдання спадчыны. Вяртаюцца ў народ забытыя творы і іх аўтары. Вяртаюцца пасля забыцця рэпрэсіраваныя літаратура і пісьменнікі з трагічным лёсам. Падрыхтаваны да друку першыя кнігі «Бібліятэкі беларускай класікі». Ліквідавана чарга на друкаванне твораў маладых аўтараў.

Але дазвольце спыніць гэты пералік, бо нас не пакідае пачуццё незадаволенасці, калі не трывогі. Думаецца, настала пара пільна паглядзець на ўвесь працэс кнігавыдання ў рэспубліцы.

Хто ім правіць? Таварышы Макаловіч з Нічыпаровічам? Так. Але ў значнай ступені і «Коннік без галавы». Балем правіць царыца прыбытку — «макулатурная» літаратура, якая выдаецца мільённымі тыражамі. Нацыянальная ж літаратура трапіла ў гаротнае становішча папялушкі. Яе доля выпуску ў намінале, тыражах, паперы складае — 1/10 частку. Такое пачварнае развіццё, як радыяцыя, не мае паху, але паступова разбурае жывую тканіну нацыянальнай культуры.

Можа, бяздумная пагоня за прыбыткамі залаціць ручку выдаўцам? Што ж, такія-сякія крохі выпадаюць. А ў цэлым ад гэтых мільёнаў, як кажуць, і не холадна, і не горача. Вялікадзяржаўны манапалізм наклаў лапу і на дзяржаўную ідэалагічную сферу. Дзесяткі мільёнаў рублёў (дзевяноста працэнтаў прыбытку «Мастацкай літаратуры») ідуць у дзяржаўную кішэню—толькі не на развіццё культуры, паліграфічнай базы, кніжнага гандлю і г. д.

У СП БССР, безумоўна, ёсць права наладзіць самастойную выдавецкую дзейнасць. У гэтай сувязі ў парадку асабістай ініцыятывы Васіль Быкаў, Васіль Зуёнак і я звярнуліся ў ЦК КПБ, Савет Міністраў рэспублікі з прапановай стварыць пры СП БССР своеасаблівы філіял выдавецтва «Мастацкая літаратура» — выдавецкі саюз імя Ф. Скарыны па выпуску літаратурнай спадчыны беларускай класікі, сабора беларускіх святых, твораў маладых аўтараў. Мяркуецца пры гэтым саюзе стварыць рэдакцыю па аператыўным выпуску актуальных твораў і забяспечыць яе камп'ютэрнай тэхнікай. Аднак глухой сцяной на шляху саюза паўсталі асобныя кіраўнікі Дзяржкамдруку БССР, якія лічаць існуючую сістэму і практыку кнігавыдання ў рэспубліцы ўзорнай.

Але ж сёння нават у былых слабаразвітых краінах тэрмін выдання кнігі не перавышае паўгода. Там адмовіліся ад архаічнай практыкі планаваць учарашні дзень.

Нагадаю, што ў 1517 годзе Ф. Скарына ў сціслыя тэрміны выдае ў Празе дваццаць багата ілюстраваных кніг ад «Псалтыра» да «Кнігі прарока Данііла». А такія, як «Эклезіяст», «Песнь песняў», «Кніга прамудрасці боскай», выходзілі адна за другой праз тыдзень.

Сучасны «Скарынаўскі каляндар» у нашым выдавецтве рыхтаваўся больш, чым працягвалася за мяжой плённая дзейнасць першадрукара. І слава богу, што на шляху яго кніг да патомкаў сустрэліся высакародныя разбойнікі, а не чыноўнікі.

Чаплянне за старыя структуры, непрызнанне новых канцэпцый выдавецкай справы, фінансавыя перашкоды, падаткаабкладанні і без таго сціплай аплаты пісьменніцкай працы шкодзяць развіццю літаратуры і таленту.

Адпаведна вядомай пастанове ўрада за першы квартал гэтага года мы павялічылі ганарар аўтарам. Законнае павелічэнне абярнулася для выдавецтва падаткам у суме трыста тысяч рублёў. Хіба гэта не дзяржаўны рэкет?

Дык што ж перашкаджае Дзяржкамдруку БССР падтрымаць нашу ініцыятыву па стварэнні выдавецкага саюза пры СП БССР? Страх перад дэцэнтралізацыяй, разнявольваннем жывой і творчай выдавецкай справы? Да таго ж я нагадаю, што толькі «Мастацкая літаратура» штогод пералічвае Дзяржкамдруку звыш 4 мільёнаў рублёў, і ў той жа час ніводнага рубля не ідзе ад прыбытку на рахунак СП БССР.

Добра, каб тыя грошы спрыялі стварэнню сучаснай паліграфічнай базы, інакш кажучы, працавалі на заўтрашні дзень нашай літаратуры. На жаль, гэтая база зношваецца, старэе і становіцца дапатопнай.

Можа, у нас ужо ўзараны пласты славянскай культуры, у поўным аб'ёме мы вярнулі літаратурную спадчыну, якую пакінулі нам славянскія гуманісты і асветнікі?

Не і яшчэ раз не. Да гэтага часу ў рэспубліцы не выдадзены ніводзін летапіс, ніводная гістарычная хроніка. Пра якую жывую споведзь пакаленняў можна ў такім разе гаварыць з афіцыйных трыбун?

Маральныя выдаткі безупынай пагоні за звышпрыбыткамі, хочам мы гэтага ці не, плодзяць нацыянальных нігілістаў, расшчапляюць цэласны погляд і эстэтычны густ. Адна справа наладзіць у рэспубліцы масавую вытворчасць калготак, а іншая — ці варта кланяцца таму ж «Коннику без галавы»?

Вось чаму сёння патрэбна прынцыпова новая канцэпцыя выдавецкай справы! Патрэбен прарыў у гуманістычна-дэмакратычным накірунку.

Жыць па старых мерках, пачываць на сумніцельных лаўрах ужо нельга. Мы б прасілі з'езд падтрымаць ідэю стварэння пры Саюзе пісьменнікаў БССР выдавецкага саюза імя Ф. Скарыны. Выказваем спадзяванні, што ЦК і Саўмін рэспублікі падтрымаюць гэту ініцыятыву, якая абгрунтавана ў адпаведнай запісцы.

У перспектыве новы выдавецкі скарынаўскі саюз можа стаць міжнародным. Ужо сёння на нашу ідэю адгукнуліся кнігавыдаўцы Югаславіі, Польшчы, Канады і іншых краін. Вольга Іпатава ў сваім выступленні паставіла пытанне аб перадачы выдавецтва «Мастацкая літаратура» Саюзу пісьменнікаў БССР. Я асабіста за самастойнасць і незалежнасць ад любога дыктату. У галіне творчасці, у тым ліку і ў галіне кнігавыдання. Што тычыцца адсутнасці паліграфічных магутнасцей, на якія спасылаюцца ў Дзяржкамдруку БССР, то яны ёсць. У рэспубліцы паспяхова існуе «падпольнае» выдавецтва ЦК КПБ, якое акуратна штампуе «Рэвальвер Мегрэ» мільённымі тыражамі. І робіцца гэта не на карысць беларускай літаратуры ў прамы абыход дэкларуемай ідэі партыйнасці і народнасці літаратуры. Хочацца спадзявацца, што багатыя магчымасці гэтага выдавецтва будуць падпарадкаваны высакароднай ідэі адраджэння нацыянальнай культуры, адраджэння скарынаўскай гуманістычнай традыцыі кнігадрукавання.

Кніга — феномен культуры і эканамічны. На жаль, у нас адбыўся яўны перакос. Наша задача ліквідаваць гэты перакос, вярнуць чытача да першавытокаў нашай нацыянальнай духоўнасці.

БЫЦЬ НОСЬБІТАМ КУЛЬТУРЫ

Выступленне Лявона БАРШЧЭЎСКАГА

Праект Статута СП БССР, які мы тут абмяркоўваем, на жаль, нічога не гаворыць пра найважнейшы, на мой погляд, абавязак кожнага беларускага пісьменніка — абавязак быць носьбітам і захавальнікам адной з тых еўрапейскіх культур, якая стаіць на парозе знікнення. Мне могуць запярэчыць: маўляў, статут — гэта сухі, юрыдычны дакумент і г. д...

Пэўна, яно так. Але статут арганізацыі, аснову якой усё-такі складаюць не «фізікі», а «лірыкі», мае поўнае права мець у сабе крыху лірыкі. Напэўна, яшчэ ні ў адной рэспубліцы Саюза колькасць носьбітаў нацыянальнай мовы, нацыянальнай культуры не скарацілася да такой ступені, як у нас, і менавіта праз гэта і ўзнікае вышэйсфармуляваны найгалоўнейшы абавязак беларускага пісьменніка.

Маё разуменне, што ў нашай трагічнай сітуацыі мы павінны колькасць замяніць якасцю, г. зн. калектыўны розум усяго народа павінен хоць збольшага кампенсавацца нашым з вамі розумам, нашай з вамі адданасцю...

Не трэба цешыць сябе ілюзіямі, што мы можам у бліжэйшыя 30—50 гадоў вярнуць нацыянальную самасвядомасць мільёнам беларусаў. Але за гэтыя гады мы павінны стварыць супольніцтва нацыянальна-свядомых інтэлектуалістаў, якое будзе мець уплыў — як адна са складнікаў грамадскай думкі — на ўсе бакі нашага жыцця. Па-мойму, за апошнія гады пазначыліся абрысы касцяку гэтага супольніцтва. Але шмат хто з шаноўных нашых калег па-ранейшаму заняты, як мне здаецца, задавальненнем сваіх уласных амбіцый, вырашэннем сваіх уласных спраў. Бясспрэчна, у кожнага з іх ёсць талент, ёсць здольнасці рабіць большае. Безумоўна, галоўны дэфіцыт нашай сённяшняй літаратуры — гэта дэфіцыт чытача. Але сёй-той працуе ў нас, як некаторыя нашыя прамысловыя прадпрыемствы, якія масава працягваюць выпускаць прадукцыю, попыту на якую ўжо гадоў 10—15 няма.

(Працяг на стар. 10).

X з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі

(Пачатак на стар. 9).

Трэба сёння сказаць адназначна: пісаць кнігі на абстрактнага ўсярэднена рабочага-селяніна-інтэлігента — рэч бесперспектыўная. Трэба разлічваць толькі (я маю на ўвазе найперш дарослую літаратуру) на нацыянальна-свядомага чытача. Сёння ж такіх чытачоў на ўсёй Беларусі, можа, толькі ў 2—3 разы больш, чым саміх пісьменнікаў. І ў гэтай тысячы-дзвюх чалавек не хопіць грошай, каб купляць усе без выключэння беларускія выданні, а галоўнае — у іх не хопіць часу, каб іх прачытаць. Значыць, мы павінны выхоўваць сабе чытача.

Вядома, выхаванне — гэта працэс. І працэс доўгі. А жыць, зарабляць на кавалак хлеба неяк трэба. І тут я хацеў бы сказаць, так бы мовіць, са званіцы прадстаўніка перакладчыцкай гільдыі.

Шаноўныя таварышы паэты, празаікі, крытыкі! Шмат у каго з вас паэтычныя кніжкі з'яўляюцца ледзь не штогод, празаічныя — раз на два гады. Цяпер гэтым кніжкам аб'ектыўна трэба канкурыраваць з той безданню цікавай, часам адкрытай нанова літаратуры, што паяўляецца ў «тоўстых» часопісах дый на паліцах кнігарань.

Тым часам мы прынялі закон аб наданні беларускай мове статуса дзяржаўнай. Гучна заяўляем, што трэба нам падручнікі, хрэстаматыі па-беларуску, бо, натуральна, інакш мы нават студэнтаў філолагаў і педагогаў на беларускай мове навучыць не можам. Між тым, як скласці тую ж хрэстаматыю па замежнай літаратуры для студэнтаў, калі ў нас практычна няма перакладзеных на беларускую мову класікаў старажытнагрэчаскай і старажытнарымскай літаратуры. Калі возьмем нават лаўрэатаў Нобелеўскай прэміі па літаратуры — а гэта ж XX стагоддзе, — то ніводнага радка мы не маем перакладзеных на беларускую мову з Сальмы Лагерлёф і Кнута Гамсуна, Фрэдэрыка Містараля і Мігеля Анхеля Астурыаса — спіс можна доўжыць і доўжыць.

Яшчэ раз звяртаюся, найперш да нашых паэтаў.

Будзе добра, калі ў прамежках паміж вашымі ўласнымі паэтычнымі зборнікамі (а добры зборнік, як правіла, можна скласці за 5—7 гадоў) вы будзеце выдаваць па адной-дзве-тры перакладныя кніжкі. Паверце, работы тут хопіць усім. Што ж да праблемы ведання моў, дык яна не такая невырашальная, бо паэзія — гэта з'ява, якая існуе трохі і па-над мовамі. А практычна па дапамогу можаце звяртацца хоць бы і да мяне: абяцаю дапамагчы кансультацыямі па любой з еўрапейскіх моў — было б у вас толькі жаданне перакладаць.

А ёсць жа ў гэтай справе добрыя прыклады для ўсіх нас —Рыгор Барадулін і Алесь Разанаў, Ніл Гілевіч і Хведар Жычка, празаікі Янка Брыль і Уладзімір Арлоў, Уладзімір Ягоўдзік і Іван Пташнікаў — хай даруюць мне тыя, каго не назваў...

Прарокаў шмат не бывае, дый цяжка быць прарокам, стваральнікам новых культурных каштоўнасцей у кожнай кнізе, калі выпускаць іх адна за адной... Літаратурнай працы, аднак, вынікі якой будуць адчувальныя і для будучых пакаленняў свядомых беларусаў, хопіць з лішкам.

Зараз іншыя часы? Пэўна ж. Але часы іншыя, а суддзі, на жаль, тыя ж. Колькіх пустапарожніх дыскусій мы пазбеглі б, колькі паперы сэканомілі, калі б былі сумленнымі, добрасумленнымі, чытаючы творы адзін аднаго. Давайце азірнёмся— і давядзецца прызнаць, што ў кодэксе пісьменніцкага гонару адбыўся вельмі небяспечны зрух, якога мы (што самае страшнае) часцей папросту не заўважаем.

З вялікага атрада беларускіх крытыкаў, які налічвае добрую сотню, па праблемах сучаснага літаратурнага працэсу выступаюць у друку не болей пяцішасці. Ды і то часцей з агульнымі развагамі, без аналізу, без крытычнага разгляду канкрэтных твораў — агулам абвінавачваючы цэлыя пакаленні ў літаратуры, а то і ўсю літаратуру, у правінцыялізме, бутафорнасці, дэкаратыўнасці і яшчэ чорт ведае ў чым. Міжволі прыходзіш да думкі, што прафесія крытыка перастала быць прафесіяй, якая абавязвае да ведаў, да ведання прадмета, і вымагае адно красамоўнага дылетанцтва; што пісаць пра літаратуру бяруцца тыя, хто не разумее і не любіць яе. І не, каб прыгадаць, што яшчэ А. С. Пушкін сказаў: «нет убедительности в поношениях, и нет истины, где нет любви»...

Даўно вядома: найлепшы спосаб разбурыць, зламаць чалавека — гэта паставіць пад пагрозу яго мову. Прыгадайце, колькі гадоў не аціхае боль (часам здаецца, што толькі шум) за нашу мову, за становішча, у якім яна і ўсе мы апынуліся. Але скажыце, як можна весці прапаганду мовы, барацьбу за мову, аплёўваючы з усіх трыбун—і ўсесаюзных таксама! — літаратуру? Не паважаем адзін аднаго і хочам, каб нас паважалі іншыя?

Прасцей за ўсё — абвінаваціць ва ўсім іншых: папярэднікаў, сталіншчыну, былое і сённяшняе кіраўніцтва рэспублікі, тым больш, што ёсць за што абвінавачваць. Цяжэй — штосьці змяніць, перайначыць: спярша ў сабе, у сваім доме, пасля ў адносінах да мовы і культуры — у адносінах, трэба прызнацца, не адно вярхоў, а і народа. Для гэтага шмат што трэба, і найперш, як мне ўяўляецца, аўтарытэт. Высокі, ні чым не заплямлены аўтарытэт пісьменніка, нашай пісьменніцкай арганізацыі, да голасу якой павінны прыслухоўвацца і вярхі, і нізы.

А Саюз пісьменнікаў — гэта ж мы з вамі, мы ўсе. І тыя, хто памятае, і тыя, хто не памятае словы з «Евангелля ад Лукі»: «Усякае царства, раздзяліўшыся само ў сабе, апусцее, і дом, раздзяліўшыся сам у сабе, упадзе».

Дык што — пазіраць, як дом падае? Дзяліцца? Раздзяляцца? Ці паспрабаваць удасканаліць, зрабіць больш рухомай, жывой структуру саюза? Прапаную: адмовіцца ад прынцыпу ганаровасці, калі гаворка ідзе пра рабочыя органы Саюза пісьменнікаў, і выбіраць і ў праўленне, і ў прэзідыум, і ў сакратарыят людзей не проста аўтарытэтных, а яшчэ і працалюбівых, рупных, здольных адстойваць і пісьменніцкія рашэнні і пісьменніцкія лёсы, калі спатрэбіцца.

Галоўнае ж, каб у наш дом, у наш саюз вярнуўся дух творчасці, дух таварыскасці, каб мы паспрабавалі выкарчаваць са сваіх душаў абыякавасць і, падтрымліваючы адзін аднаго, памяталі, што ні адраджэнне мовы, ні адраджэнне нацыі немагчыма, калі не адродзяцца давер, павага і добразычлівасць сярод нас, калі мы не ўсвядомім, чым ганарыцца, а чаго саромецца ўсім нам — перш перад самімі сабой, а потым перад усім светам.

КАБ ВЯРНУЎСЯ ДУХ ТВОРЧАСЦІ

Выступленне Таісы БОНДАР

«Мы так безнадзейна расчалавечыліся, што за сённяшнюю сціплую кармушку аддадзім усе прынцыпы, душу сваю, усе намаганні нашых продкаў, усе магчымасці для нашчадкаў — толькі б не зачапіць свайго ўбогага існавання», — яшчэ шаснаццаць гадоў таму з горыччу звяртаўся да сучаснікаў А. Салжаніцын, а і сёння гэты зварот гучыць, і сёння цяжка сказаць, колькі часу нам спатрэбіцца для аднаўлення з разрухі не нашае гаспадаркі (хоць і тут рабоце канца не відно), а нашае чалавечае годнасці. Не год, не два—гэта відочна. Дасюль мы жывём паміж неадпаведнасцю слоў і думак, у свеце знявечаных душаў, якія не адчуваюць, не ўсведамляюць гэтае сваёй знявечанасці.

Страшна думаць пра галечу нашу. Не тую, пра якую мы плачамся зараз усяму свету, быццам напраўду засталіся голымі, босымі і галоднымі, а пра галечу духоўную, душэўную, калі ў кожным расце, разрастаецца пустыня, калі адчужэнне ўжо такое, што ўсё часцей здаецца: нас усіх развялі па адзіночках.

Зразумела трывога тых, хто і год, і два, і пяць спрабуе разабрацца, што мы збудавалі, што будуем, ды, на маю думку, на сённяшні дзень важней убачыць, зразумець, хто — хто? — будуе. Хто працуе, сябе не шкадуючы, хоць бы сябе, чалавека ў сабе выбудоўваючы.

Тое, што мы адкрываем цэлыя пласты творчасці рэпрэсіраваных ці высланых у выгнанне аўтараў (што само па сабе, канешне ж, добра!), зусім не азначае, што мы адкрываем, бачым поўную, цэласную карціну развіцця нашае літаратуры — колькі тых, хто жыў і жыве (і цяпер жыве!) ва ўнутранай эміграцыі, не знаёмых, не вядомых шырокаму масаваму чытачу, без асаблівых спадзяванняў, што яго, гэтага масавага чытача, займеюць: тыражы беларускіх кніг і часопісаў кажуць самі за сябе, а перакладам жа з году ў год цяжэй (калі раней шумныя, мнагалюдныя дэкады і літаратурныя святы збіралі літаратараў з усёй краіны і знаёмствы часцей за ўсё перарасталі ў творчае супрацоўніцтва, то маладзейшым пісьменнікам сёння часам даводзіцца мець справу з рамеснікамі, а то і халтуршчыкамі ад літаратуры).

Так і чую ў адказ абрыдла-павучальнае: сапраўдны талент праб'ецца, а не праб'ецца — што ж, выдаткі шляху. І як растлумачыць — хто ў нашым залішне рацыянальным свеце паверыць, што можна не біцца, не прабівацца не ад таго, што мала сілы ці мужнасці, а ад таго, што многа годнасці (годнасць, праўда, гэтаксама не з сённяшняга лексікону). Вось і грымяць на ўвесь Саюз адны і тыя ж выглянцаваныя ад частага ўжывання імёны, вось і разбіваюцца хваля за хваляю — пакаленне за пакаленнем — аб моцна, дабротна зляпленыя ці саструганыя ў свой час п'едэсталы. Калі якое новае імя і ўзмывае ўгору, то толькі на хвалі выбуху, на хвалі «чарнухі», да якой заўсёды ёсць якая-ніякая цікавасць. І вось ужо пнуцца маладыя «вытанчыць» што-небудзь такое... ці адкрыта эратычнае, ці прыкрыта антысавецкае — як жа! абы вылучыцца! абы заўважылі!

А папярэднікі? Тыя, хто скардзяцца на адсутнасць у маладых літаратурных аўтарытэтаў? «Вас няма,—сцвярджаюць, — з вас ніхто не вылучыўся». Так, не вылучыўся. Не абцяжараны ні залішняю ўвагаю крытыкі, ні ўзнагародамі, ні прэстыжнымі і грашовымі выданнямі. Дастаткова сказаць, што ў пакаленні, якое набліжаецца да сваіх пяцідзесяцігоддзяў, па пальцах аднае рукі пералічыш тых, хто мае нават простае перавыданне.

«Вас няма. З вас ніхто не вылучыўся»,—сцвярджаюць. Быццам не памятаюць, што ледзь толькі з'яўляўся хто на гарызонце, тут жа, з усіх бакоў, кідаліся папракаць то за залішнюю эмацыянальнасць, то за лішні рацыяналізм. І— нічога, ні радка не чыталі. А каго не чыталі, таго і не было. І крытыка так лічыла, бо і крытыка належала ім, ушанаваннем гадамі і званнямі, ад іх кармілася. І — быццам перарвалася сувязь пакаленняў...

НА СЛУЖБЕ Ў ІСЦІНЫ

Выступленне старшыні мандатнай камісіі Яўгена КАРШУКОВА

Беларускія пісьменнікі сабраліся на X з'езд, глыбока ўсведамляючы сваю адказнасць перад народам і часам рэвалюцыйных пераўтварэнняў у краіне. Пісьменнік, сапраўдны майстар мастацкага слова, грамадзянін, не можа, не мае права стаяць убаку ад спраў свайго народа, яго лёсу, трывог, клопатаў, памкненняў. Важкае і сумленнае слова пісьменніка заўсёды служыла людзям.

Прыемна адзначыць, што літаратурная творчасць займае ў жыцці нашых людзей большае месца. Палепшылася работа не толькі абласных аддзяленняў СП БССР, але і літаратурных аб'яднанняў, гурткоў у раёнах, на прадпрыемствах, у навучальных установах рэспублікі. Прыняцце Закона аб дзяржаўнасці беларускай мовы надало імкненню да мастацкай творчасці новы імпульс. Будзе жыць беларускае слова — будзе жыць беларуская літаратура.

Прыкметнае ажыўленне літаратурнага жыцця рэспублікі, рост цікавасці да мастацкай літаратуры тлумачаць і значны рост нашай пісьменніцкай арганізацыі за кошт літаратараў, якія жывуць і працуюць на перыферыі. Сёння Саюз пісьменнікаў Беларусі налічвае 419 членаў.

Нацыянальны склад наступны: беларусаў — 341, рускіх — 37, яўрэяў — 21, украінцаў — 9, палякаў — 8, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей — 3.

А вось у якіх жанрах працуюць нашы пісьменнікі: у прозе — 221, паэзіі — 185, драматургіі — 42, пісьменнікаў, якія пішуць для дзяцей — 68, у крытыцы і літаратуразнаўстве — 129. Мастацкім перакладам займаецца 41 пісьменнік. Многія пісьменнікі працуюць у некалькіх жанрах.

Па ўзросту дэлегаты размяркоўваюцца наступным чынам: да 30 гадоў — 4, ад 31 да 40 — 51, ад 41 да 50 — 89, ад 51 да 60 — 125, ад 61 да 70 — 83, ад 71 да 80 — 50, старэй за 80 гадоў — 17.

Самыя маладыя члены Саюза Людміла Рублеўская і Алесь Бадак, якім па 25 гадоў. Найстарэйшая пісьменніца ў нашым Саюзе — Зоська Верас (Войцік Людвіка Антонаўна). Ёй — 98 гадоў.

Такім чынам, хоць нешта і зроблена ў кірунку амаладжэння нашага саюза, але патрабуюцца далейшыя сур'ёзныя захады.

У СП БССР 355 мужчын, 64 жанчыны. У гэтых шэрагах Героі Сацыялістычнай Працы, лаўрэаты Ленінскай прэміі Максім Танк і Васіль Быкаў, Героі Сацыялістычнай Працы Кандрат Крапіва і Іван Шамякін. Народных пісьменнікаў у нас — 6, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР — 7, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі БССР — 45, лаўрэатаў прэміі імя Куляшова і Мележа — 17, лаўрэатаў прэміі Ленінскага камсамола — 4, камсамола Беларусі — 16, народных дэпутатаў СССР — 2, народных дэпутатаў БССР — 3, дэпутатаў мясцовых Саветаў — 1, пісьменнікаў, якія маюць вучоную ступень, — 77, заслужаных работнікаў культуры БССР — 36, заслужаных дзеячаў навукі БССР — 5.

Пісьменнікі працуюць у дзяржаўных, навуковых і грамадскіх установах, выкладчыкамі ў вышэйшых навучальных установах, у школах, выдавецтвах, рэдакцыях тэлебачання і радыё, газет і часопісаў, на кінастудыі і ў тэатрах.

Сярод дэлегатаў з'езда адзін удзельнік грамадзянскай вайны — Кандрат Кандратавіч Крапіва, 96 чалавек — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. Гэта асабліва прыемна нагадаць напярэдадні 45-годдзя Перамогі.

ЦІ МАЕМ МЫ БУДУЧЫНЮ?

Выступленне Уладзіміра ДАМАШЭВІЧА

Ці маем мы будучыню? Над такім пытаннем задумваецца сёння кожны свядомы чалавек. Мы ўсе ўжо бачым, што нам пагражае экалагічная катастрофа. Тэхнічны прагрэс на нашых вачах паварочваецца да нас сваім жорсткім бокам, робіцца згубным як для прыроды, так і для чалавека.

Што ж рабіць? Чалавецтва ў трывозе, грамадскасць абурана, няма чыстага паветра, не хапае звычайнае чыстае вады, расце колькасць захворванняў, звязаных з забруджваннем, з загазаванасцю навакольнага асяроддзя. Але што можа зрабіць грамадскасць? Яна можа толькі выйсці на вуліцы і плошчы і заявіць свой пратэст. Але вырашыць праблему можа толькі ўлада, якая мае сродкі і рэальныя магчымасці. Улада, дзяржава, тая самая, якая і спарадзіла гэтую самую вялікую праблему нашага часу — забруджванне.

Нас цяпер хочуць пераканаць, што атамная энергія — наш добры сябра. Яна нам патрэбна, як паветра, толькі яна адна можа выратаваць нас ад энергетычнага голаду. Ці так гэта? Здаецца, што не. Бо атамная энергія была выклікана патрабаваннямі гонкі ўзбраення, патрэбна была як важкі аргумент у спрэчцы дзвюх сістэм. Хіба выпрабаванні атамнай зброі выкліканы мірнымі патрэбамі? Колькі ўжо ўзарвана зарадаў з 45-га года? Ужо даўно больш за тысячу. Што яны далі чалавецтву, каб зменшыць яго штодзённыя патрэбы? Што яны прынеслі прыродзе, акрамя шкоды?

Так, цяпер атамныя выпрабаванні вядуцца пераважна пад зямлёй. Мы супакойваем самі сябе, што верагоднасць заражэння асяроддзя пры гэтым мінімальная. Але ўсё гэта ілюзіі, таму што радыяцыю мы захопліваем у сябе ў двары, каля калодзежа, з якога бяром ваду. Грунтовыя і падземныя воды вымываюць радыяцыю і нясуць яе нашым унукам і праўнукам. Што скажуць пра нас нашы нашчадкі? Хіба мы не падобны на тых, што гавораць: пасля нас — хоць патоп?

Калі экалагічны ці энергетычны крызіс у большай ці меншай меры характэрны для ўсяго чалавечага супольства, то ў нас, жыхароў Савецкага Саюза, ёсць яшчэ свае спецыфічныя праблемы, якія таксама патрабуюць свайго неадкладнага вырашэння.

Апошнія пяць год перабудовы змянілі наш воблік, нашых людзей непазнавальна — хоць бы ў тым сэнсе, што мы перасталі баяцца, перасталі сябе хваліць, сталі самакрытычныя, перасталі бязбожна лаяць капіталізм.

Мы на ўвесь голас загаварылі пра свае вялікія і малыя праблемы, не баючыся, што неба ад гэтага ўпадзе на зямлю. Мы робімся аб'ектыўнымі ў сваіх ацэнках, а гэта аснова для выздараўлення.

Цяжкі і цярністы шлях прайшлі нашы рэспублікі — ад кароткага росквіту нацыянальных культур да заняпаду, да страты роднай мовы і іншых сацыяльных і культурных каштоўнасцей.

Цяпер распачаўся адваротны працэс: мы зноў ідзём на пад'ём. Мы яшчэ не набылі суверэннасці, самастойнасці.

Моцны цэнтр не адразу аддасць свае правы слабым рэспублікам. Цэнтралізацыя і гігантаманія — вось дзве галоўныя апоры, на якія цэнтр апіраецца. Але гэтыя апоры не вечныя, яны з цягам часу ператвараюцца ў сваю процілегласць — як і тэхнічны прагрэс. Цэнтр нібы сапраўды баіцца, каб рэспублікі не сталі моцныя. Мо тады ў іх больш стане набываць сілу тэндэнцыя да раз'яднання, да аддзялення? Але навошта трымаць сілаю? Зрабіце так, каб кожная рэспубліка магла дыхаць вольна ў саюзных абдымках.

Возьмем Беларусь. З дваццаці сямі міністэрстваў у рэспубліцы дваццаць адно ў саюзна-рэспубліканскім падпарадкаванні, гэта значыць, тулава яго тут, а галава — у Маскве. А шэсць самых мізэрных міністэрстваў, як мясцовай, тарфяной прамысловасці, камунальнай гаспадаркі, маюць рэспубліканскі статус.

А што мае для сябе рэспубліка з таго, што вырабляе, што гадуе? Не той гаспадар, хто вырабляе, а той, хто размяркоўвае, — справядліва сказаў першы сакратар ЦК КПБ.

Ці аслабне цэнтр, калі ён аддасць рэспублікам частку іх кроўных правоў быць у сябе дома гаспадаром? Ці аслабне цэнтр, калі дазволіць рэспублікам вырашаць свае цэласныя нацыянальныя і ўсялякія іншыя праблемы? Калі ён захоча астацца старым цэнтрам, ён пабаіцца ўсё гэта зрабіць. Калі наш саюз распадзецца, гэта будзе доказам таго, што ён трымаўся на несправядлівасці і ўціску. Тое, што будуецца на праўдзе і справядлівасці, будзе стаяць моцна.

Адна з галоўных прычын размывання нацыі — міграцыя. Ніхто ў моцным цэнтры яшчэ, здаецца, не асудзіў гэтае з'явішча, народжанае ў сталінскія часы, калі яна была надзейным рычагом разбурэння цэласнасці кожнай рэспублікі. Перамяшаць, перасяліць, зрушыць з абжытага месца, пазбавіць пачуцця гаспадара, адарваць ад каранёў і пусціць па ветры эпохі — вось што дала міграцыя. І яна моцна папрацавала яшчэ ў перыяд застою, паказала сябе на цаліне, на БАМе, на «вялікіх будоўлях камунізму». Міграцыя спарадзіла шмат новых вострых праблем, абвастрыла нацыянальныя трэнні і канфлікты, якія цяпер маюць выбуховы характар. Нехта нават пажартаваў, што міграцыя — гэта слуп, які як глыбока ні закопвай, не пусціць каранёў.

Чарнобыль і асіміляцыя — вось дзве страшныя хваробы, якія сёння нам пагражаюць. І як бы нас ні супакойвалі, як бы ні згладжвалі вострыя рагі, кожнаму непрадузятаму чалавеку відаць, што Чарнобыль нанёс нам, беларусам, такі ўдар, якога мы не атрымалі нават у мінулую вайну. Пад пагрозу пастаўлена будучыня нацыі — і гэта не гіпербала. Ужо сёння смяротнасць у рэспубліцы катастрафічна расце, хварэюць і паміраюць ад рака маленькія дзеці, школьнікі, моладзь. Адыходзяць, асыпаюцца, як лісце пасля замаразка, старэйшыя людзі. Не выключана, што парушыўся генафонд ва ўсіх, хто трапіў пад згубныя ападкі Чарнобыля, і мы не ведаем, якія трагедыі нас чакаюць у бліжэйшы час.

Калі ў поглядах на чарнобыльскую трагедыю ў нас у рэспубліцы, нарэшце, праз чатыры гады, склалася цвёрдая думка, то па іншых прынцыповых пытаннях адной думкі ў грамадскасці і ў рэспубліканскага кіраўніцтва няма. Гэта зноў жа — экалагічная праблема, якая ў нас у рэспубліцы больш вострая, чым у іншых рэспубліках Саюза. Такія гарады, як Наваполацк, Мазыр, Магілёў, Гродна, Салігорск, звязаныя з нафтаперапрацоўкай, з хіміяй, з соллю, — пастаўлены на грань катастрофы. Пяройдзены ўсякія нормы загазаванасці ў сталіцы Беларусі — Мінску. Калі грамадскасць рэспублікі ўстрывожана такім становішчам, дык кіраўніцтва рэспублікі застаецца надзіва спакойным.

Цяпер у нас ідзе працэс абуджэння нацыянальнай свядомасці, працэс вяртання да нацыянальных каранёў. Урэшце прыняты Закон аб дзяржаўнай беларускай мове. Дзіўна толькі, што закон не ўступіў у сілу з моманту яго надрукавання, а пачне дзейнічаць толькі з першага верасня. Больш як паўгода мы трацім толькі таму, што так захацелася начальству. Яно, відаць, псіхалагічна павінна сябе падрыхтаваць да таго, што беларуская мова стане дзяржаўнай.

Але гэта ўжо дробязі ў параўнанні з тым значным якасным зрухам, які адбыўся ў свядомасці беларускага народа, нашага грамадства — што наданне беларускай мове статуса дзяржаўнай верне яе да жыцця, верне будучыню беларускаму народу.

Падводзячы вынікі, можна сказаць, што калі народы, а асабліва ўрады ўсіх краін будуць кіравацца розумам і здаровым сэнсам, а не вузкімі карыслівымі мэтамі і амбіцыяй, то чалавецтва знойдзе дарогу з таго тупіка, у якім яно апынулася, што ўсе самыя складаныя праблемы можна вырашыць, калі зацікаўлена думаць аб заўтрашнім мірным дні, аб шчасці сваіх дзяцей, аб шчасці ўсяго чалавецтва, калі памятаць пра тыя вялікія ахвяры, якія яно панесла ў імя будучага!

Варта сказаць пра адну цікавую падзею, якая адбылася ўчора: у Доме літаратара пад старшынствам Яўгена Лецкі адбылося заснаванне новага таварыства — Міжнароднай асацыяцыі беларусаў (назва ўмоўная), выбраны арганізацыйны камітэт. Задача згуртавання — завязаць кантакты з беларусамі ці ўраджэнцамі Беларусі, якія сёння раскіданы па ўсім свеце і хочуць мець сувязі з бацькаўшчынай. Думаю, што наша грамадскасць такое згуртаванне падтрымае. Пажадаем яму поспехаў!

АСЭНСОЎВАЦЬ УРОКІ ГІСТОРЫІ

Выступленне Кастуся ТАРАСАВА

Напярэдадні з'езда прагучала многа ўсхваляваных слоў пра сімптомы крызісу ў нашым Саюзе пісьменнікаў, пра раз'яднанасць, небяспеку расколу. Але наўрад ці гэта адбудзецца, бо СП усё-такі не партыя, ён аб'ядноўвае людзей па прафесійным занятку. А пісьменніцкая праца — гэта праца індывідуальная, здабыткі яе аніякім чынам не залежаць ад прыналежнасці да групы ці фракцыі. Пісьменнікі заўжды аднадумцы толькі ў адносінах да ідэі, канцэпцый — культурных, сацыяльных, палітычных. Таму настрой незадаволенасці, на маю думку, гэта плён нашай бяздзейнасці. Грамадская пазіцыя саюза страціла адэкватнасць вастрыні грамадскага жыцця ў рэспубліцы. Апошнім часам Саюз пісьменнікаў наогул не выказваў сваіх адносін да тых сацыяльных і палітычных праблем, якія зацікаўлена абмяркоўвае народ.

Таму запіс у праекце статута, з якім вы знаёміліся, пра адзін гадавы сход — гэта гарантыя нашай маўклівасці і на наступную пяцігодку. Я лічу, што тут трэба добра падумаць, каб была магчымасць часцей збіраць пісьменніцкія сходы.

Хачу прывесці яшчэ адзін прыклад, ён вельмі важны, прынцыповы. У лістападзе мінулага года было зарэгістравана ўжо ўпамянутае Вольгай Іпатавай таварыства «Отечество», тое самае, што абвясціла Беларусь у сваёй першай тэрміналогіі «западными русскими землями». Зразумела, што наш урад заплюшчыў вочы на гэты абразлівы і нечаканы пасаж, а, можа, прыняў яго за норму. Адпаведна ў сакавіку Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР адмовіў у рэгістрацыі Беларускаму краязнаўчаму таварыству, якое было створана, ці лепш сказаць, адроджана на з'ездзе. Зарэгістраваны польскае, татарскае, яўрэйскае, украінскае, рускае культурныя аб'яднанні. А вось перад беларускімі краязнаўцамі ўрадавыя колы апусцілі заслону.

Варта прыгадаць, што Беларускае краязнаўчае таварыства існавала ў дваццатых гадах і было вынішчана пад час сталінскага генацыду на Беларусі, а орган таварыства «Наш край» зачынены. І вось сёння замест адраджэння, замест выпраўлення несправядлівасці мы сустракаем шчыры працяг былой даваеннай палітыкі, неаспрэчны доказ той маны пра падтрымку апаратам нацыянальнай культуры. Подпіс таварыша Мікуліча пад крыўдным адказам — гэта праява ўсталяваных адносін да роднай гісторыі, да звяржэння яе помнікаў, да адраджэння нацыянальнай свядомасці. Нежаданне рэгістрацыі БКТ стаіць у адным шэрагу з адмовай рэгістрацыі «Мартыралога», БНФ, Канфедэрацыі маладзёжных суполак.

Існуюць і больш сур'ёзныя з'явы, якія наш саюз здолеў абмінуць увагай. Мы ніяк не адрэагавалі, што Вярхоўны Савет СССР паставіў абмеркаванне Чарнобыля на самы канец сваёй сесіі, акрэсліўшы такім учынкам адносіны да трагедыі беларускіх зямель. Мы не выказалі ацэнкі нашай арганізацыяй у сувязі з тым, што грошы, якія маглі б — а з гуманітарных меркаванняў павінны былі — пайсці на ліквідацыю вынікаў чарнобыльскага ядзернага выбуху, пайшлі, аднак, на павышэнне дабрабыту савецкіх, партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх работнікаў. Па сціплых падліках, гэта складае шэсць-семь мільярдаў рублёў на год — за тры гады кошт чарнобыльскай праграмы ў Беларусі.

Не хвалюючыся жахлівым недахопам медыкаментаў, спецыяльнага медыцынскага абсталявання, вітамінаў для дзяцей і прадуктаў для хворых, Вярхоўны Савет БССР прымаў пастановы супраць сцягоў, значкоў, мітынгаў, удзелу ў выбарах аддзяленняў ТБМ і БЭС. Гэта было важней. Болей таго, у сітуацыі, калі само жыццё народа пастаўлена пад пагрозу, калі павялічваюцца захворванні дзяцей, калі неабходна перасяляць сотні тысяч сем'яў, Прэзідыум Вярхоўнага Савета рэспублікі палічыў магчымым прыняць пастанову па Літве.

Цынічны гандаль землямі, штучнае акрэсліванне рэспубліканскіх межаў, якімі бавіліся Сталін і ягоныя хаўрусні, не могуць лічыцца законнымі і служыць базісам для тэрытарыяльных рахункаў. Таму відавочна, што заява Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, пабудаваная на такіх аргументах, мае цалкам амаральны характар. Сумна бачыць, што ўрад рэспублікі не асэнсоўвае ўрокі даўняй і нядаўняй гісторыі, не памятае здрады, якую зведаў беларускі народ пры падпісанні Брэсцкага міру, а потым Рыжскага мірнага дагавора, не задумваецца над трагічным вопытам армяна-азербайджанскага пагранічнага канфлікту.

Семя зла прарастае і на камянях, але свядома кідаць такое насенне ў народную свядомасць — рызыкоўны ўчынак.

ЗРУХАЎ ПАКУЛЬ МАЛА

Выступленне Галіны КАРЖАНЕЎСКАЙ

У перыяд паміж з'ездамі не было, мабыць, пісьменніцкага сходу, дзе хоць бы адно выступленне не ўяўляла сабой плач па гаротнай долі беларусаў. Як бы ні балела, лічу—плакаць лепш на адзіноце, сам-насам. Ды і каго мы спадзяёмся разжаліць? Паслухаўшы, пачытаўшы лімаўскую пошту, паназіраўшы за ходам падзей у рэспубліцы, я стала задумвацца пра феномен нацыянальнага характару. І прыйшла да сумнай высновы—менавіта суб'ектыўны фактар сыграў згубную ролю ў нашай нацыянальнай драме. Вядома, я не збіраюся прыніжаць і фактар аб'ектыўны—гістарычныя ўмовы існавання. Аднак жа скажам прама: недахоп самапавагі і самасвядо-

(Працяг на стар. 12).

X з'езд Саюза пісьменнікаў Беларусі

(Пачатак на стар. 11).

масці, схільнасць да пераймання чужых поглядаў і няўменне адстойваць свае, празмерныя асцярожнасць і нават баязлівасць—вось той маляўнічы букет, у які кожны з нас прынёс сваю сціплую кветачку.

Паслухайце, як пісала пра беларуса адна польская газета яшчэ ў пачатку стагоддзя (цытату прыводзіла «Наша Ніва»): «Ціхі як вада, а як святая зямля прымае ўсё пакорна. Спрэчак і ўсялякага змагання ўнікае. З душы яго ніводзін крык не вырвецца». Крык-то можа і вырвацца—як здарылася гэта на трэцім годзе чарнобыльскай бяды. А вось што да змагання...

Гледзячы на грамадзянскае аблічча некаторых кіраўнікоў—буйнога маштабу і драбнейшых, проста дзіву даешся: няўжо іх продкі хадзілі на Грунвальд? Ці, можа, толькі кап'ё і дубальтоўка надаюць нам мужнасці? Думаецца нават, што ўзмоцнены інстынкт самазахавання здольны аказаць нам мядзведжую паслугу і прывесці да адваротнага эфекту.

Сказанае ў поўнай меры тычыцца і творчага асяроддзя. Не многія з нас асмельваюцца публічна пакласці свой мужны голас на шалі грамадскай сітуацыі. Так, мы — за, мы падтрымліваем ўсё перадавое, толькі хай яно, перадавое, перамагае без нашага ўдзелу. Хай змагаюцца палярныя сілы грамадства, а мы пачакаем выніку. Хай хтосьці іншы расчысціць завалы, а тады ўжо мы як след пакажам сябе на расчышчаным і ўсяму вынесем сваю ацэнку.

Хто лічыць так—свядома ці падсвядома,—той памыляецца.

І колькі б мы ні паўтаралі, што асноўная праца пісьменніка—над ягонымі творамі, у пераломныя часы публіцыстычнае слова можа важыць болей, чым мастацкае. Тым больш, калі гэта слова В. Быкава, А. Вярцінскага, У. Калесніка, Н. Гілевіча, В. Казько і многіх іншых.

Калі б у мяне спыталі, у чым асноўная прыкмета сённяшняга дня, я сказала б—у раз'яднанасці. Усе раз'яднаны з усімі: заходнія з палескімі, старэйшыя з малодшымі, рабочыя з інтэлігенцыяй, творчая інтэлігенцыя з тэхнічнай, адзін творчы саюз з другім, і нават у межах аднаго пакалення няма ні згоды, ні ўзаемаразумення.

І пакуль уся пара ідзе ў свісток, пакуль нашы энергетычныя, інтэлектуальныя магутнасці працуюць ухаластую—мясцовае кіраўніцтва і ўсесаюзныя ведамствы, як і раней, іграюць мускуламі і дэманструюць сілу.

Ці не так было заўсёды? І пакутлівае ўтварэнне БССР, і кашчучная пастанова 1959 г. пра неабавязковасць вывучэння роднай мовы, і здзіўляючая нашпігаванасць нашай тэрыторыі ракетнымі базамі—усё гэта з'явы аднаго шэрагу. Яшчэ на зары перабудовы, калі нацыянальна свядомай грамадскасці не ўдалося адстаяць элементарнага—сімволікі, можна было зразумець: мясцовыя ідэалагічныя бастыёны так проста, голымі рукамі не возьмеш. Праз многа гадоў хтосьці з лімаўцаў напіша ўспаміны, як надумаліся мы зняць з паласы штотыднёвіка лозунг наконт пралетарыяў і што ў нас з гэтага атрымалася. Калі з такога робяць невырашальную праблему і замах на сацыялізм — якіх прагрэсіўных змен можна чакаць? Ад нараджэння да старасці нас суправаджаюць адны і тыя ж лозунгі, заклікі, рытуалы. На гадзінніку ідэалогіі час безнадзейна спыніўся.

Есць, вядома, у нас і пэўныя зрухі за апошнія гады ў рэспубліцы—нязначныя ў параўнанні з іншымі рэгіёнамі і досыць важкія для нас саміх. Тут і рэабілітацыя ахвяр сталіншчыны як вынік вялікіх намаганняў прагрэсіўнай грамадскасці, і вяртанне імён вучоных, пісьменнікаў, грамадскіх дзеячаў, якія доўгі час насілі кляймо «буржуазных нацыяналістаў». Тут і ўтварэнне ТБМ, экалагічнага саюза, краязнаўчага таварыства і г. д. З дапамогай прэсы быў зроблены «ўкарот» дзеячам Мінатамэнерга, якім няма куды болей убухаць грошы, акрамя як на ракаўскі дыснэйленд. На жаль, праект каскаду азёраў на Іслачы застаецца ў сіле і пачынае ажыццяўляцца.

Можна было б і яшчэ сёе-тое нагадаць, што дапамагае нам падтрымліваць жыццёвы тонус. Толькі падстаў для аптымізму ўсё ж малавата.

Жыццё паказала, што па сабе падабраныя, загартаваныя на агні ўладалюбства кадры не збіраюцца нічога мяняць. Зацяжны, ні на што не падобны рамонт у трох рэдакцыях, матэрыяльна падпарадкаваных выдавецтву «Полымя»,—чым не яскравы прыклад? Нечалавечая цярплівасць трох калектываў і трох рэдактараў—гэта не толькі праява нацыянальнай рысы, але і сведчанне нашай бездапаможнасці перад яе вялікасцю Бюракратыяй. Мы па-ранейшаму не ведаем, на якую кнопку ўпраўленцкай махіны націснуць, за які рычаг тузануць, каб яна ўрэшце лязгнула, зарыпела і пачала працаваць на людзей. Пакуль што руху да лепшага тут не відаць. Перабудова па-беларуску, так бы мовіць.

Не адчуваецца станоўчых зменаў і ў рабоце літаратурна-драматычнай рэдакцыі радыё. Магутны сродак уздзеяння на людскія розумы і сэрцы марнуецца на паўпрафесійныя «падзелкі», на матэрыяльнае падтрыманне вузкага кола аўтараў, на тыражыраванне літаратурнага браку.

Трывожныя тэндэнцыі назіраюцца і ў сістэме прыёму ў СП БССР. Рэкамендацыі творчых секцый даўно сталі фармальнасцю. Секцыі нібыта спаборнічаюць паміж сабой, зноў і зноў закідваючы сеці на прадмет папаўнення пісьменніцкіх шэрагаў. Планка патрабаванняў стала настолькі нізкай, што яе пешкі пяройдзе кожны, хто толькі пажадае папоўніць сабой нашы слаўныя рады.

Не хачу сказаць, што ў саюз не прымаюцца здольныя, перспектыўныя, вартыя павагі аўтары. Прымаюцца, іх шмат. Але сёння якраз і ідзе тая «калектыўная загрузка» пісьменніцкіх кадраў, пра якую ў дакладзе гаварыў В. Зуёнак.

Закончу ж словамі Коласа з яго мудрых «Казак жыцця»: «...каб быць смелым, трэба быць дужым, а каб быць дужым, трэба мець цвёрды грунт пад нагамі і ясна пачуваць і ведаць, дзеля чаго ты жывеш на свеце».

ПАВІННЫ ЗГУРТАВАЦЦА

Выступленне Адама МАЛЬДЗІСА

Васіль Быкаў слушна тут гаварыў, што мы працягваем «бег да прорвы». Прорвы экалагічнай, эканамічнай, маральнай, нацыянальнай, і будзем працягваць «пікіраваць» уніз, пакуль не паразумнеем, пакуль не зразумеем, што ў нармальным грамадстве павінна існаваць раўнавага розных сіл—левых і правых, апазіцыйных і кіруючых, радыкальных і кансерватыўных. Як птушка не можа лятаць, калі ў яе толькі адно крыло — левае ці правае, так і грамадства не можа паспяхова развівацца, калі ў ім толькі адна рука. Толькі адна партыя. Кіруючы апарат без апазіцыі не можа сам сябе кантраляваць, сам сябе напраўляць. І ў гэтым прычына нашых бядот — і пры Сталіне, і пры Брэжневе, ды і цяпер таксама.

Дзе ж выхад? Пры тыпова беларускай нецярпімасці да інадумцаў спадзявацца на хуткую рэгістрацыю апазіцыйных партый наўрад ці рэальна. Не будзе асаблівага плюралізму ў новым Вярхоўным Савеце БССР, бо туды пераважна выбраны тыя, хто будзе спалучаць заканадаўчую ўладу з выканаўчай уладай на месцах. Як тут ужо гаварылася, была блакіравана большасць кандыдатаў ад творчай інтэлігенцыі, ад работнікаў культуры. Між тым у гэтых людзей у ходзе перадвыбарчай кампаніі назапасіўся пэўны вопыт грамадска-палітычнай работы, сувязі з масамі. І гэты вопыт не павінен загінуць дарма. Таму я прапанаваў бы сфарміраваць з іх грамадскі, альтэрнатыўны «парламент», які дубліраваў бы ў сваіх абмеркаваннях і галасаваннях асноўны, падтрымліваў бы дзейнасць яго радыкальных дэпутатаў, фарміраваў бы грамадскую думку (праз «ЛіМ» і г. д.). На чале гэтага грамадскага форуму я бачыў бы пісьменнікаў Г. Бураўкіна, С. Законнікава, В. Рагойшу, К. Тарасава або гісторыка М. Ткачова.

Як пісьменніка мяне трывожыць, што няма ў рэспубліцы, у кіруючых колах сур'ёзнага настрою выконваць прыняты закон об мовах, лячыцца ад нацыянальнага нігілізму. Ранейшая хваля русіфікацыі пачынае дапаўняцца магутнай хваляй паланізацыі. Усе каталікі, а іх, па падліках Ватыкана, у Беларусі прыкладна два мільёны, абвяшчаюцца палякамі. У адрозненне ад праваслаўнай царквы каталіцкі касцёл — за двума выключэннямі — не жадае паварочвацца да беларускай мовы. Замест таго, каб адкрыць, па прыкладу праваслаўнай, сваю каталіцкую семінарыю, мы працягваем «імпарт» ксяндзоў з Польшчы. Хутка ў Мінску будуць тры польскія касцёлы, і ніводнага — беларускага. Многія з нашых кіраўнікоў з задавальненнем разыгрываюць любую карту, польскую, каталіцкую ці нават літоўскую — абы толькі не беларускую.

Дарэчы, некалькі слоў пра Літву. Тыя кроплі літоўскай крыві, што цякуць у маіх жылах, даюць мне дадатковыя падставы сказаць, што літоўская пазіцыя сёння таксама небездакорная. Нечаканым было вяртанне Літвы да канстытуцыі 1938 года. Ды і апублікаванне ў Вільнюсе карты з тэрытарыяльнымі прэтэнзіямі да Беларусі таксама сяброўскім актам не назавеш. Нявырашанай застаецца справа Віленскага беларускага музея, да матэрыялаў якога доступ цяпер ускладнёны (гэты музей трэба было б адрадзіць у базыльянскіх мурах як супольны культурны асяродак). І тым не менш я лічу нашы тэрытарыяльныя прэтэнзіі да Літвы проста незразумелымі. Пасляваенныя граніцы ў Еўропе павінны захоўвацца ў недатыкальнасці.

Стоячы на краі прорвы, мы павінны нарэшце ўсвядоміць сваё становішча, згуртавацца на аснове канструктыўных сіл.

«УЗБРОІЦЦА НА МОРА КРЫЎД...»

Выступленне Анатоля ВЯРЦІНСКАГА

Я нядаўна тройчы выйграў заклад. У вядомага драматурга. У вядомага тэатральнага крытыка. І ў вядомага рэжысёра. Гэта значыць, у людзей, якія ў той ці іншай меры ведаюць (павінны ведаць) Вільяма Шэкспіра, у прыватнасці яго «Гамлета — прынца дацкага», у прыватнасці, маналог апошняга «Быць альбо не быць?». У адказ на пытанне, які сэнс прынц дацкі ўкладваў у сваё горкае «Быць альбо не быць?», яны ўсе тлумачылі адназначна: жыць альбо не жыць. Вытлумачвалі, словам, так, як і прынята ў нашым штодзённым ужытку. Я ж, перачытваючы нядаўна «Гамлета» ў перакладзе Юркі Гаўрука, адкрыў раптам для сябе, што мы тут крыху вольна абыходзімся з Шэкспірам, што пачатак стаўшага крылатым маналога трэба разумець шырэй — як пытанне, якое катэгарычна патрабуе рашэння перад новым крокам, якое патрабуе зрабіць выбар...

Пытание: быць альбо не быць?
Што лепей,
Што разумней: альбо цярпець удары,
Каменні, стралы, яраснага лёсу,
Альбо ўзброіцца на мора крыўд
І знішчыць іх змаганнем...

Вечнае, заўсёды надзённае, можна сказаць, пытанне. Для літаратуры. Для грамадства. Для чалавецтва.

І раз я ўжо пачаў з класікі, з экскурса ў класічную спадчыну, звернемся на хвіліну да нашага Купалы. Хаця б да гэтага двухрадкоўя — надзвычай сугучнага з толькі што працытаванымі шэкспіраўскімі радкамі:

А воля мне жалезная патрэбна
За крыўды маёй мілай помстай
заплаціць...

Там — «узброіцца на мора крыўд», тут — «воля мне жалезная патрэбна».

Нехта сказаў, што геній заўсёды народны. З гэтым цяжка не пагадзіцца. І як бы мы ні вытлумачвалі паняцце народнасці і ні суадносілі яго ў кожным канкрэтным выпадку з індывідуальна-творчымі асаблівасцямі мастака, застаецца ўсё ж галоўным крытэрыем мера яго суперажывання з жыццём і лёсам народным, мера яго гуманнасці ў адносінах да чалавека як часцінкі народа, мера яго здольнасці акрэсліваць справядлівасць і несправядлівасць, дабро і зло і быць на баку абяздоленых, пакрыўджаных, маючых патрэбу ў спагадзе і дапамозе.

Я прывёў двухрадкоўе з паэмы Купалы «Яна і я». Там ідзе размова аб тым, як адплаціць за «крыўды мілай», як змагацца са злом. А давайце спытаемся, чаму верш «А хто там ідзе?» быў названы «народным гімнам беларусаў»? Ды, відаць, таму, што прагучалі ў ім ідэйна-сутнаснай дамінантай абурэнне і боль за крыўду людскія, народныя — за «мора крыўд». Помніце:

А што яны нясуць на худых плячах,
На руках у крыві, на нагах у лапцях?
— Сваю КРЫЎДУ.
А куды ж нясуць гэту КРЫЎДУ ўсю,
А куды ж нясуць на паказ сваю?
— На свет цэлы.
А хто ж гэта іх, не адзін мільён,
КРЫЎДУ несць наўчыў, разбудзіў іх сон?
— Бяда, гора.

Бо менавіта крыўду — як сінонім зла, як знак несправядлівасці, як след сацыяльнага і нацыянальнага прыгнёту — прыкмячае перш за ўсё паэт у вобліку і поступе народным...

Гэтыя радкі прыгадаліся мне, па асацыяцыі, у час нядаўняй выбарчай кампаніі, пад час адной з сустрэч, якая адбывалася ў невялікай школьнай зале, твар у твар з людзьмі, што называецца. Звяртаючыся да кандыдатаў, да патэнцыяльных «слуг народа», людзі (а гэта быў народ — рабочыя, служачыя, інжынеры, настаўнікі з мікрараёна «Серабранка») ставілі пытанні, выступалі, спрачаліся з кандыдатамі і адзін з адным. І я ў нейкі момант зазначыў мысленна, што ў напаленай атмасферы сустрэчы дамінуе адна эмоцыя — крыўда. Гучалі незадаволенасць, разгубленасць, трывога, боль, асуджанасць. Але пакрывала іх, выступала агульным назоўнікам менавіта яна — крыўда...

Крыўда «на», крыўда «за», крыўда «з-за».

Крыўда — на «властей прадержащих», учарашніх і сённяшніх.

Крыўда — за злачынствы сталіншчыны, за архіпелаг ГУЛАГ, за Курапаты і магілёўскія кар'еры.

Крыўда — за рассяляньванне, за разрабочванне, за разінтэлігенчванне, за расчалавечванне, словам.

Крыўда — за Чарнобыль.

Крыўда — за экалагічную катастрофу, за брудную ежу, за атручаныя паветра, ваду і глебу.

Крыўда — з-за няпраўды, прапагандысцкай хлусні, недаверу, бяссэнсіцы, бязвер'я...

Словам — крыўда.

Вось і прыгадалася мне тады купалаўскае «А хто там ідзе?». І падумалася, што як быццам на двары другі час, другая эпоха, што і плечы ў нас не такія ўжо худыя, і крыві на руках няма, і ногі нашы не ў лапцях, — а крыўд хапае. І не мора іх ужо, здаецца, а цэлы акіян.

Быць альбо не быць?

І яшчэ — «за што?!»

«За што?!» — чуецца нам з безыменных курапацкіх магіл.

«За што?!» — крычым мы разам з героем быкаўскай аповесці «Аблава» Хведарам Роўбай.

«За што?!» — напісана на бледных, прыхопленых радыяцыяй тварыках дзяцей у гематалагічнай клініцы.

«За што?!»—успыхвае ў вачах юнака, які з уласцівым маладосці наіўным максімалізмам паверыў у перабудову і адраджэнне, у магчымасць гаварыць на роднай мове, а над галавой якога не-не ды і завісае міліцэйская дубінка...

«За што?!», «Чаму?», «Як гэта так?» — гэтыя пытанні гучаць сёння, у наш так званы перабудовачны, так званы пераходны час і ў жыцці, і ў літаратуры. Менавіта яны, гэтыя пытанні, за якімі крыўды чалавека і крыўда за чалавека, складаюць галоўны нерв новай п'есы Аляксея Дударава, новай аповесці Віктара Казько, выступленняў Генадзя Бураўкіна і Ніла Гілевіча, новых вершаў Максіма Танка, Пімена Панчанкі, Максіма Лужаніна, Уладзіміра Някляева, Ніны Мацяш, Людмілы Паўлікавай, Сяргея Законнікава, Галіны Каржанеўскай, Сержука Сокалава-Воюша, Васіля Жуковіча, Міколы Янчанкі, Міхася Шэлехава (называю вершы, што змяшчаліся нядаўна ў «ЛіМе»)...

Апошнім часам у дыскусіях аб нашай новай, кастрычніцкай і паслякастрычніцкай гісторыі не-не ды і выказваецца думка, што Кастрычніцкая рэвалюцыя — з'ява акцыдэнтная, гістарычна не абумоўленая. Думаю, што для такога сцвярджэння недастаткова падстаў. Бо — успомнім Горкага — нідзе так, як у Расіі, не адносіліся дрэнна да чалавека, нідзе так, як у царскай імперыі, так яго, чалавека, не зневажалі. Успомнім тут адпаведныя мастацкія сведчанні Цёткі, Купалы, Коласа, Багдановіча, Гарэцкага...

Народ, беларускі народ!
Ты цёмны, сляпы, быццам крот.
Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма...

Так што гаручага матэрыялу для рэвалюцыі было больш чым дастаткова, дастаткова было гэтага самага «мора крыўд».

Іншая справа, як рэалізоўваўся — і дадам: рэалізуецца — гуманістычны зарад рэвалюцыі, што атрымалася ў рэальнасці з добрых намераў і высакародных парыванняў. Леў Талстой любіў паўтараць адну ўсходнюю прыказку: «Спалі каран, служы ідалам, знялаў Каабу, але не крыўдзі чалавека». Чалавек — не сродак, а мэта, чалавек — мера рэчаў, чалавек — вянец прыроды... Не крыўдзі чалавека! Але крыўдзілі. І яшчэ як крыўдзілі!

І працягваем, як ужо гаварылася, крыўдзіць. І суб'ектыўна і аб'ектыўна. І прама і ўскосна. І маральна і фізічна... Чаго не хапае перабудове, дык гэта перш за ўсё, па-мойму, рашучага і паслядоўнага адмаўлення ўсякай бесчалавечнасці, рашучай і паслядоўнай гуманізацыі ўсіх сфер жыцця (калі гэта гучыць не вельмі наіўна). Мы гаворым пра неабходнасць усталявання грамадзянскага, прававога грамадства, але часта ўпускаем з поля гледжання адну «дэталь»: «фундаментам права з'яўляецца гуманнасць» (Альберт Швейцар).

Мяне бянтэжыць, у прыватнасці, тэндэнцыя разглядаць па-ранейшаму чалавека не як мэту, а як сродак, не як суб'ект палітыкі, права, вытворчасці, а як іх аб'ект. Калі вы помніце, мы ў «ЛіМе» не так даўно спрачаліся з нашым партыйным лідэрам па пытанні аб тым, «хто накорміць краіну». Маю на ўвазе артыкул пад такой назвай урача і юрыста Я. Новікава, нядаўна стаўшага народным дэпутатам БССР. Са спасылкамі на працы Маркса было пераканаўча даказана, што цэнтрам грамадства, цэнтрам грамадскіх адносін павінен быць чалавек, вытворца, а не дзяржава, гэта значыць: чыноўнікі, тыя, хто кіруе, кантралюе, вядзе ўлік, размяркоўвае і г. д.

Сёння прыходзіцца прадоўжыць нашу палеміку з першым сакратаром ЦК КПБ. Ен даў для гэтага падставу, выказаўшы крыху дзіўны погляд на тыя працэсы, якія назіраюцца сёння ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. «Нарастаюць страты ў народнай гаспадарцы, звязаныя з «мітынговай дэмакратыяй», гаварыў у сваім дакладзе пленуму ЦК Я. Я. Сакалоў. — За мінулы год толькі ў прамысловасці і будаўніцтве страчана каля 800 тысяч чалавека-дзён, або на 36 працэнтаў больш, чым за папярэдні год. Рэспубліка недаатрымала прамысловай і будаўнічай прадукцыі на 100 млн. рублёў. Удумайцеся, таварышы, у гэтыя лічбы...»

Я ўдумаўся. Я падумаў: хто і як гэтыя лічбы вызначыў? Гэта па-першае. Падругое: выходзіць, каб не мітынгі (а яны ж, да слова, адбываліся, як правіла, у выхадныя дні або пасля працы), каб не дэмакратызацыя, не палітызацыя мас, а інакш кажучы, — каб не перабудова, то... То ўсё было б у парадку. Дзіўная логіка, ці не праўда? Але мяне тут бянтэжыць не сама логіка, не столькі тэкст, колькі падтэкст. А ён, калі я яго правільна зразумеў, зводзіцца да таго, што чалавеку адмаўляецца ў праве быць грамадзянінам і дазваляецца быць толькі працаўніком... Крыўдзяць грамадзяне начальнікі радавых грамадзян!

Чаму рашыў гаварыць пра «мора крыўд», чаму вырашыў выдзеліць менавіта гэту тэму? Відаць, не толькі таму, што задумаўся над урокамі класікаў. Справа, відаць, яшчэ і ў тым, што нядаўна, разбіраючы даўнія запісы, наткнуўся раптам на шматгадовай даўнасці, з часу студэнцтва, занатоўку: «Пражыць бы жыццё так, каб нікога не пакрыўдзіць». Так некалі фармуляваў сваё жыццёвае, так сказаць, крэда. Спытаецеся, ці атрымалася. Не зусім... Магчыма, і гэтым выступленнем некага пакрыўдзіў.

А з другога боку: тое ж самае жыццё не раз ставіла і ставіць сёння перад суровым, жорсткім выбарам:

Быць альбо не быць?..

Вось чаму на ўсю нашу літаратуру трэба глядзець як на трагічную ў самой яе змястоўнай сутнасці.

Прыйшоў час рашуча і канчаткова адкінуць ненавуковыя, фальшывыя і вульгарызатарскія канцэпцыі гісторыі Беларусі, беларускай грамадскай думкі, беларускай культуры, распрацаваныя ў нашай Акадэміі навук і на кафедрах ВНУ пасля 1930 года, г. зн. пасля пагрому і вынішчэння сапраўдных навуковых сіл. Чым хутчэй мы гэта зробім — тым лепш, бо для вялікай работы па адраджэнні Беларусі патрэбен сур'ёзны навуковы грунт.

Непасрэдна пра літаратуру гаворкі на з'ездзе пакуль што, на жаль, амаль не вялося. Што зробіш! Відаць, вельмі баліць, турбуе і займае думкі іншае. І калі ўжо працягваць гаворку пра іншае, дык у маім разуменні — перад беларускімі літаратарамі стаяць дзве галоўныя задачы. Па-першае, ратаваць нашу зямлю і жыццё на ёй, жыццё людзей нашых; колькі хопіць сіл у нас — трэба рабіць усё, каб дапамагчы, пасадзейнічаць гэтаму выратаванню. Учора Вярхоўны Савет СССР зацвердзіў Чарнобыльскую праграму на бліжэйшыя два гады — на першы этап, праграму-мінімум. Добра, вядома, але нават само абмеркаванне, я лічу, было крыўдным для беларускага народа, на долю якога прыпала 70% ад усёй забруджанай смертаноснымі радыенуклідамі тэрыторыі.

Другая задача, на якой я спынюся трохі больш, гэта — выратаванне нашай мовы і культуры, і праз гэта — жыццё на Беларусі зрабіць беларускім. Я не агаварыўся — іменна беларускім. Да гэтага часу мы яго рабілі савецкім, сацыялістычным, інтэрнацыянальным, усё гэта добра, і было б зусім добра, калі б пры гэтым яно не рабілася ўсё менш беларускім. Дык вось — трэба вярнуць яму нацыянальнае аблічча, трэба ўвесь стыль жыцця троху-патроху перайначыць на наш адметны самабытны беларускі лад, які ў нас калісьці быў. Без гэтага, як вы разумееце, уласнай будучыні ў нас, у нашага народа быць не можа. Як мы дапаможам свайму народу ў гэтым яго духоўным адраджэнні — пытанне няпростае. Тут ад нас, пісьменнікаў, патрабуюцца не толькі добрыя, таленавітыя, праўдзівыя творы, але і вельмі вялікая грамадская праца і, калі хочаце, і стойкасць, і мужнасць, і цярпенне.

Адносіны да беларускай літаратуры ў нашым грамадстве калі і пачалі мяняцца, дык толькі ледзь-ледзь — і, можа быць, перш за ўсё тут, у Мінску, у сталіцы. Ствараюцца курсы па вывучэнню беларускай мовы, праводзяцца семінары і лекторыі для партыйна-савецкіх работнікаў, для камсамольскага актыву. У СМ распрацоўваецца дзяржаўная праграма ажыццяўлення Закона аб мовах у рэспубліцы. Напомню, дарэчы, што ў сілу закон уступае з 1-га верасня. Вядома, менавіта тады самыя вялікія цяжкасці ў сваёй працы мы і напаткаем. Тым больш, што Вярхоўны Савет абвясціў рускую мову афіцыйнай мовай СССР — і мы не наіўныя, разумеем, што г. зн. дзяржаўнай.

Вы ведаеце, як далёка ў нас зайшло руйнаванне беларускай нацыянальнай культуры. Мабыць, ні ў аднаго народа ў гісторыі не было такіх гнюсных здзекаў з народнае душы, як у Беларусі — і пры шматлікіх каралях-царах, і доўга пасля... Пачытайце ў «Камунісце Беларусі» № 4 архіўную публікацыю-пісьмо ЦК КПБ ад 25.1.1929 года наконт нацыяналізму ў асяроддзі беларускіх навукоўцаў і літаратараў. Малапісьменныя жандары ад мастацтва і навукі нават прозвішчы нашых слаўных паэтаў і пісьменнікаў правільна напісаць не ўмелі, а як яны здзекаваліся з іх! З іх — і з нас, нашчадкаў тых, каго загналі ў Курапаты або на Калыму.

У сувязі са сказаным трэба забараніць у нас у Беларусі карыстацца сёння паняццем «беларускі нацыяналізм». Інакш — нейкі абсурд: нацыянальная культура ў страшным заняпадзе, вытручана з душ мільёнаў нацыянальная самасвядомасць — і ў такой сітуацыі крычаць пра пагрозу беларускага нацыяналізму!

Гэтаксама нельга ў нас, у Беларусі, гаварыць, а тым больш крычаць, пра рэальнае двухмоўе і пра інтэрнацыяналізм, бо гэта святатацтва і здзек з народа, чыя культура знаходзіцца ў такім складаным становішчы. Не трэба высокіх слоў, хоць яны і вельмі добрыя самі па сабе, не трэба. Лепш хоць на нейкі час устрымацца ад іх — з элементарнага пачуцця прыстойнасці.

З гэтай трыбуны справядліва крытыкаваўся часопіс «Политический собеседник», які некаторымі сваімі артыкуламі па сутнасці спрыяе абуджэнню і распальванню міжнацыянальнай непрыязі і варажнечы. Брыдка ўсё гэта, непрыгожа, і вельмі крыўдна, што гэта мае месца — на зямлі народа, адвеку слыннага сваёй талерантнасцю, міралюбнасцю і дружалюбнасцю, чым мы заўсёды даражым і, спадзяюся, будзем даражыць. Ну, але ладна, у гэтага часопіса хоць тыраж невялікі. А вось што рабіць мне, якога месяцы тры назад абвясціла ваяўнічым шавіністам многамільённая ўсесаюзная «Литературная газета»? У публікацыі двух бойкіх на пяро супрацоўнікаў Інстытута літаратуры АН БССР сцвярджаецца, што нібыта я ў вершы «На новым вітку» патрабую выгнання з Беларусі «некоренного населения». Ні больш, ні менш. Уяўляеце, калі б такое ў 37-м апублікавалі таварышы крытыкі! Я з абурэннем адмятаю гэты паклёп. Ні адзін з маіх рускіх, украінскіх, яўрэйскіх, татарскіх і іншых па нацыянальнасці сяброў і таварышаў, побач з якімі я жыву і працую тут, у нашым агульным доме, не паверыць гэтай інсінуацыі.

Месяц з гакам назад ужо наша рэспубліканская газета «Знамя юности» апавясціла сваіх чытачоў, што ў тым жа вершы «На новым вітку» ёсць «спекуляция на национальных чувствах», — вядома ж, у артыкуле аднаго з тых самых акадэмічных аўтараў. Уявіце сабе: цяжкахворы чалавек, знаходзіцца ў крытычным стане, калі нічога не рабіць — то можа пачацца перадсмяротная агонія, і родныя-блізкія, якім гэты чалавек бясконца дарагі, кідаюцца шукаць хоць якой-небудзь рады, хапаюцца ў роспачы за любы сродак, каб толькі ўратаваць, ні ўдзень, ні ў ночы не адыходзяць ад хворага, знебыліся ад пакут, выбіваюцца з апошніх сіл, а ім — дасведчаныя адукаваныя людзі заўважаюць: што вы спекулюеце на стане яго здароўя? Што вы без падстаў падымаеце паніку? Якое ж трэба мець сумленне і сэрца, каб дазволіць сабе такое!

Уся прычына ў тым, што для адных пытанне аб беларускай мове і культуры — пытанне іх уласнага лёсу, сэнсу жыцця, а для другіх — толькі «предмет досужих разговоров», кажучы паруску, практыкаванне ў пустаслоўі. У гэтым і ўся розніца.

Хацеў бы ў сувязі з гэтым нагадаць пра адзін факт з нашай нядаўняй літаратурнай гісторыі. Вядома, што пасля XX з'езда КПСС некаторыя крытыкі з каманды Лукаша Бэнды хадзілі па публічных бібліятэках, бралі старыя падшыўкі газет і, па-зладзейску азіраючыся, выразалі свае артыкулы, у якіх яны выкрывалі беларускіх нацыяналістаў — каб не засталося слядоў іх подлай работы. Ці не прыйдзецца аднойчы і сямутаму з нашых сучаснікаў заняцца такой жа няўдзячнай справай?

Таварышы, калі нават Чарнобыль не аб'яднае нас — не вызваліць душы ад дробязлівага, нядобрага, зласлівага, пошлага, жорсткага — дык што ж тады аб'яднае?..

ШТО Ж ТАДЫ АБ'ЯДНАЕ?

Выступленне Ніла ГІЛЕВІЧА

Сёння — 4 гады чарнобыльскай трагедыі. Для нас — 4 гады новага летазлічэння. Да гэтага часу лік гадоў мы вялі ад нараджэння Хрыста — і налічылі амаль не 2000. Цяпер будзе справядліва, як бачым, пачаць нам, на Беларусі, новае летазлічэнне. У тым ліку — і ў дачыненні да літаратуры, да яе гісторыі. Я паўтараю тое, што сказаў яшчэ ў кастрычніку 1986 года ў Балгарыі, у Сафіі, на міжнародным форуме пісьменнікаў — «Мір — надзея планеты», а менавіта — што для беларускай літаратуры пачынаецца новая гістарычная эра — настолькі вялікая і страшная падзея здарылася. Гэта ўсенародная бяда прымусіла, ці павінна прымусіць нас па-іншаму паглядзець на ўсю гісторыю Беларусі і на гісторыю беларускай літаратуры ў прыватнасці. А іменна, паглядзець на нашу гісторыю як на несупынную трагедыю. Калі нават пачнём не з самай глыбокай старажытнасці — першым яе актам была Люблінская унія 1569 года, затым Берасцейская унія 1596 года, затым забарона беларускай мовы ў 1697 годзе, пасля — разгром паўстання Каліноўскага, пасля — грамадзянская вайна 1918—21 гадоў, пасля — усё тое жахлівае, што суправаджала калектывізацыю, пасля — жуткі гвалт над душой народа ў акупіраванай Заходняй Беларусі, пасля — пагалоўнае вынішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі і наогул цвету нацыі ў рэпрэсіях 30-х гадоў, пасля — Вялікая Айчынная вайна і фашысцкая акупацыя Беларусі з масавым вынішчэннем насельніцтва, а праз увесь гэты час — апусташэнне і нявечанне мільёнаў душ няпраўдай, хлуснёй і страхам. І вось, нарэшце, Чарнобыль — нешта настолькі пагрознае для лёсу нашага народа, чаго і ў самых кашмарных снах прысніць не маглі мы...

АДРАДЖЭННЕ — ПРАДАЎЖАЕЦЦА

Выступленне Алега ЛОЙКІ

Я хачу запыніць вашу ўвагу на моманце, звязаным з адраджэннем як такім — гэта па-першае, і, па-другое, з такой з'явай, якая тут не называлася і якая родам з XIX стагоддзя і вядзе радавод ад пачатку партый. Напачатку хачу пагаварыць аб фанатызме. Мы прадаўжаем жыць пад абладай фанатызму, ваяўнічага фанатызму, шмат у чым амаральнага, шмат у чым бескультурнага, ну і вядома, фанатызму, які заўсёды суседнічае, мяжуе з дагматызмам або проста з невуцтвам. Фанатызм — рэч вельмі страшная, не мне, відаць, тут даказваць, але я хачу ўсё-такі звярнуць ува-

(Працяг на стар. 14).

(Пачатак на стар. 13).

гу на некаторыя яе праявы. Хоць бы ў адносінах нашай партыі да нефармалаў. Гэта з вобласці фанатызму менавіта палітычнага. А што мы маем у вобласці этыкету? Міхаіл Сяргеевіч Гарбачоў едзе ў Ватыкан да Папы Рымскага, падае яму руку, а да нас прыязджае пастар з Захаду, служыць месу, і знаходзіцца журналістка, якая пагрозліва махае яму кулаком, крычучы абразлівыя словы святому айцу. Там, дзе фанатызм, там этыкету няма. Там няма міласэрнасці сапраўднай.

Хачу нагадаць факты гісторыі. Дзекабрысты былі памілаваны тым Мікалаем, якога мы называем іншы раз «палкіным» праз дваццаць гадоў. Паўстанцы Кастуся Каліноўскага, у тым ліку і Францішак Багушэвіч, былі памілаваны самым жорсткім царом Аляксандрам III праз дваццаць гадоў. Пасля грамадзянскай вайны ў 1925 годзе была першая амністыя для палітычнай эміграцыі, паводле якой прыехалі многія. Вось бачыце, праз пяць гадоў была прынята амністыя! Махноўцы былі памілаваны да дзесяцігоддзя Кастрычніка ў 1927 годзе. А наша палітычная эміграцыя — вінаватая і невінаватая — 45 гадоў яна ўсё яшчэ не рэабілітаваная, не памілаваная, як быццам мы ў дзевяць разоў больш жорсткія сталі пасля 25-га года. У гэтым зноў жа я бачу праяву фанатызму, які скоўвае нас у свеце і які перашкаджае нам кансалідавацца. А нам трэба сапраўды кансалідавацца і тут, у рэспубліцы, і з усімі беларусамі ў свеце на ідэях адраджэння.

Мы многа гаворым пра адраджэнне, пра нацыянальную ідэю, разам з тым некаторыя адрываюць цэлую беларускую літаратуру ад нацыянальнага адраджэння, некаторыя нават і не бачаць, што ў нашых працэсах сацыяльна-грамадскіх нацыянальнае пытанне застаецца першасным. Яно першааснова культуры, яно першаснае ў палітыцы, хоць мы ніяк не хочам да гэтай пары прызнаць. Першасным застаецца яно таму, што яно прыярытэтнае, таму што пасля хрысціянскай ідэі была толькі ідэя нацыянальная, якая гэтак жа сама людзей кансалідавала. Хрысціянскай — дзве тысячы гадоў, нацыянальнай крыху менш — 500, як нашаму Скарыне зараз, яна — равесніца Адраджэння, і Адраджэнне прадаўжаецца. І мне прыкра чытаць, калі сёй-той піша, што ў нас у Беларусі ў сённяшніх умовах «нацыянальнае пытанне падключаецца». Куды яно падключаецца? Яно што — тэлевізар, халадзільнік, які можна выключыць, падключыць і г. д.? Адраджэнне аднойчы пачалося і яно прадаўжаецца. Я ўжо думку гэтую сцвердзіў: яно трывушчае. Адраджэнне як трава: яе косяць — расце, косяць — расце.

У нас не было сапраўднага інтэрнацыяналізму, бо класавая ідэя вульгарызавалася, яна затаптала нацыянальную, затаптала хрысціянскую. Хрысціянская адраджаецца — і нацыянальная ў час перабудовы ў сваім рэчышчы адраджэнчым па-новаму сёння пачуваецца. І дарма спадзяюцца тыя, хто не памагае беларускай мове, дарма яны думаюць, што — гэта так сабе, вось сёння пагаварылі пісьменнікі — і на гэтым скончылася, зноў усё вернецца назад. Не вернецца, бо гэта закон жыцця чалавецтва.

ПРАЎДА — НЕ ЛОЗУНГ

Выступленне Эдуарда СКОБЕЛЕВА

Як і іншыя, што выступалі да мяне, у прыватнасці, Таіса Бондар, Уладзімір Дамашэвіч, Алег Лойка, я заклапочаны палітыканствам, якое размывае нашу маральную салідарнасць. Вядома, салідарнасць ніколі не была стабільным фактарам нашага жыцця, але ўсё-такі ў любыя часы заставалася адчувальнай мэтай, вакол якой згуртоўвалася большасць. Цяпер мэты практычна няма.

Верх, здаецца, усё больш бярэ нецярпімасць. Глотка і рукі робяцца пераважным аргументам, і працаўнікі пяра, якім характэрна сціпласць і далікатнасць, палохаюцца гэтай злавеснай валтузні, як і заўсёды ў гісторыі, задрапіраванай пад апошняе слова дэмакратыі. Ніхто з нас не мае права забываць пра трагічныя ўрокі 20—30—40-х гадоў. Прэтэнзія застаецца, невуцтва застаецца, значыць, застаецца аснова для новых рэпрэсій, і хто, калі не мы, павінны выступіць супраць нецярпімасці, супраць даносаў, здаслівасці і новага самадурства?

Цяперашні этап нашага жыцця яшчэ далёкі ад сапраўднай дэмакратыі. Мы сутыкаемся з хлуснёй, непаслядоўнасцю, галечай адных, якая прадвызначае абыякавасць, і сквапнасцю другіх, штурхаючай на экстрэмізм. Можа здарыцца і так, што цяперашні час захлёстваючай дэмагогіі, тым не менш, затрымаецца ў нашай памяці, як вяршыня плюралістычных магчымасцей. Можа высветліцца, што менавіта сёння мы губляем свае галоўныя шанцы.

Краіна абудзілася. Людзі патрабуюць роўнасці, не роўнасці ў няроўнасці, а роўнасці ў рэальных магчымасцях. Права на свабоднае нацыянальнае развіццё нельга прызнаваць за аднымі і адмаўляць за другімі. Будучае нашай шматнацыянальнай садружнасці — у сапраўднай самастойнасці і свабодзе, у гарманічным узаемадзеянні ўсіх інтарэсаў. Спробы шукаць казлоў адпушчэння асуджаны на няўдачу. Галоўны сродак гармоніі — праўда, якая аб'яднае ўсіх, — не рубель, не долар, якія раз'ядноўваюць.

І тут я хацеў бы нагадаць пра ідэал, таму, што без ідэалу не можа быць не толькі сур'ёзнай творчай задумы, але пасуе і пісьменніцкая тэхніка, паэтычнае майстэрства.

Асабіста я выходжу з сацыялістычнай перспектывы, лічу сацыялізм аб'ектыўна непазбежным і не блытаю ідэю сацыялізму са злачыннай ці бяздарнай практыкай яе ўвасаблення. Нікольні не атаясамліваю з бескантрольнымі і безадказнымі полюсамі вызначальнай улады.

Пісьменнікам, якія нахлябаліся дэмагагічнага, безнацыянальнага варыва, спяшаюцца прысягнуць гандлярству і эксплуатацыі, я прадказваю творчую бясплоднасць і жорсткую духоўную драму.

Здаецца, наступае літаратура пустой балбатні і прымітыўнага зубаскальства, на чарзе споведзі — невукаў і нягоднікаў. Выбух палітычных страсцей зрушыў нашы абавязацельствы перад літаратурай як сферай узвышанага і цудоўнага.

Літаратурная вучоба павінна быць пастаянная і для пачынаючых, і для аксакалаў. Але, здаецца, усё адступае перад залішняй самаўпэўненасцю адных і адчайнай стомай другіх. Робіцца ўсё больш рэдкім крытык, які сваю задачу бачыў бы не ў прысудзе, не ў пераказванні фабулы, а ў цвярозым аналізе рэдкіх крупінак сапраўднага мастацтва. Іх інтуітыўна знаходзяць тыя старыя і тыя маладыя мастакі, якія шчыра перажываюць трагізм нашай эпохі.

Падтрымліваючы слушную прапанову аб стварэнні пры СП БССР выдавецтва імя Скарыны, я б дапоўніў яе прапановай аб тым, каб гэта выдавецтва выпускала таксама паэзію, прозу і крытыку за кошт аўтараў, але на льготных умовах (скідка на 50—60 працэнтаў) для членаў СП, а таксама для тых адданых літаратуры людзей, якія не могуць уступіць у саюз, у тым ліку і па прычынах унізіцельнай працэдуры прыёму.

Сапраўдныя пісьменнікі заўсёды прысягалі праўдзе. Але праўда — гэта не лозунг, гэта канкрэтная справа, гэта тое, што вызначае спрыяльную плынь народнага жыцця. Змяніць ідэі — яшчэ не азначае наблізіцца да праўды.

Цяпер праўда ўзняла сваю планку, яна ўзнялася вышэй за сацыяльна-палітычную і філасофскую дактрыну, яна ўжо вызначае гэтую дактрыну. Гэта праўда — новая экалагічная свядомасць, якая ставіць паперадзе ўсіх мэт не ўяўны народ, не алігархічную банду, якая фактычна захоплівае ў свеце багацце і ўладу, а новага, дасканалага чалавека, які ўсвядоміў, якую смяротную небяспеку ўяўляюць для планетарнага жыцця і алігархія, і невуцтва мас, любая эгаістычная пагоня за багаццем, уладай ці асалодай, што кідае выклік прыродзе і тым самым народам.

Нас спакушаюць бязмежным спажываннем. Але новая экалагічная свядомасць, якая ўказвае адзіны шлях да выратавання чалавечага роду, ужо патрабуе ад усіх нас стрыманасці і ўмеранасці, ужо выкрывае індывідуальны прыбытак як ілжывы шлях цывілізацыі.

Усе мы падтрымліваем палітыку перабудовы, але ўсе разумеем пад ёй штосьці сваё. Менавіта таму я заклікаю кожны раз выяўляць узровень нашых рэальных агульных інтарэсаў, не асабліва спадзеючыся на замежных добразычліўцаў. Бо і яны хочуць свайго.

Вось вам цікавы напамін, якім я і закончу сваё выступленне. Я працытую з газеты «Стампа» ад 13 красавіка г. г. былога пасла Італіі ў СССР С. Рамана: «Нам нужен Горбачев, и поэтому нам придется заплатить за то, чтобы он остался у власти. Этой ценой является сегодня независимость Литвы, от которой в данный момент приходится отказаться. Только не нужно маскировать нашу дипломатию псевдоидеологическими мотивами и как-то по-иному называть нашу «реальную политику». Мы не помогаем Советскому Союзу стать демократическим... Мы просто помогаем Горбачеву создать новую диктатуру».

Давайце падумаем, пра якую дыктатуру ідзе гаворка, і спраектуем усё сказанае на свае літаратурныя задумы і на свае маральныя даўгі перад народам, кроў якога цячэ ў нашых жылах.

ШЭРАСЦЬ НЕБЯСПЕЧНАЯ

Выступленне Юліі КАНЭ

Нягледзячы на ўсё цяжкае, што адбываецца зараз у жыцці, нам трэба падумаць аб будучыні нашай арганізацыі, а значыць, і літаратуры. Дзеля гэтага мы абнаўляем яе статут, хочам спрасціць яе структуру.

В. Зуёнак гаварыў у дакладзе аб парнаскім і масавым падыходах да пытання аб прыёме ў саюз. Ёсць трэці, сярэдні, а значыць, найбольш сур'ёзны падыход — прафесійны. Прыцягнуць да літаратуры можна і трэба, але неабавязкова прымаць усіх, ёсць іншыя шляхі. Захаваць нацыянальную літаратуру, дапамагчы ёй выжыць колькасным шляхам нельга — толькі якасным. Інакш — аморфная аматарская маса, шэрасць. Ежы Лец пра сярэдняга пісьменніка: «Думаеце, ён мала зрабіў? Ён жа знізіў агульны ўзровень». А шэрасць, некампетэнтнасць, непрафесіяналізм у наш дэмакратычны час могуць быць ваяўнічымі, агрэсіўнымі і, значыць, небяспечнымі.

А што тычыцца крытэрыяў, дык яны ёсць. Проста не трэба тым, хто думае, што іх няма, уваходзіць у прыёмную камісію. Лічу, што трэба знізіць колькасць яе членаў (з 24 да 15) і ўвесці кансультантаў, якія б давалі абгрунтаваныя, аргументаваныя пісьмовыя заключэнні. Тады, можа, усе будуць чытаць усіх і не будуць прымаць пачкамі, ці чародамі, ці гуртамі. Раней людзей ведалі — чыталі іх, пра іх. Цяпер жа — ні твораў, ні твораў не ведаем.

Хачу спыніцца яшчэ на адным вельмі знамянальным пункце статута. «СП БССР праяўляе клопат аб спадчыне беларускай літаратуры і іншых нацыянальных літаратур, якія склаліся ў рэспубліцы». Гэты пункт — прызнанне, што такія літаратуры былі, але іх не стала, амаль ці цалкам звяліся, а засталася толькі спадчына (беларуска-яўрэйская і беларуска-польская літаратура). Але пры адпаведных умовах гэтыя заглухлыя літаратуры патроху могуць адрадзіцца, толькі ім трэба дапамагчы.

АДЗІНАЕ ПАТРАБАВАННЕ — АБ'ЕКТЫЎНАСЦЬ

Выступленне загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ Аркадзя РУСЕЦКАГА

Як для ўсёй краіны, так і для нашай рэспублікі час сёння не просты. Адбываюцца складаныя, шмат у чым супярэчлівыя і нават крызісныя працэсы. Аб гэтым шмат і заклапочана гаварылі прамоўцы.

І я ўпэўнена падтрымліваю тых, хто з гэтай трыбуны спрабаваў знайсці адказы на балючыя пытанні жыцця, хто разважаў пра тое, як на прынцыпах шырокай сацыялістычнай дэмакратыі надаць новы змест, новы характар дзейнасці нашым дзяржаўным і грамадскім інстытутам.

Я горача падтрымліваю гэта і таму, што высокі творчы і інтэлектуальны патэнцыял дзеячаў літаратуры і мастацтва рэспублікі моцна ўплывае на фарміраванне грамадскай думкі.

Да пісьменніцкага слова прыслухоўваецца сёння ўсё больш і больш людзей, усё больш і больш людзей азіраецца на вас, чакаюць ад вас парады.

Дзяржаўныя органы, органы культуры, партыйныя камітэты, іх ідэалагічныя ўстановы выступаюць за новыя, больш гнуткія і дзейсныя формы адкрытага, узаемадаверлівага супрацоўніцтва з творчымі саюзамі і творчымі калектывамі. Чым больш разнастайным стане мастацкае жыццё, тым больш плённым будзе яго заўтрашні дзень — перспектыўнае, жыццяздольнае будзе развіваецца і далей, а штучнае, знарочыстае, легкадумнае адамрэ.

Хацелася б толькі перасцерагчы, каб гэтыя працэсы не раз'ядноўвалі мастацкую інтэлігенцыю, а згуртоўвалі яе, не развальвалі творчыя саюзы, а яшчэ больш нарошчвалі іх патэнцыял. Толькі аб'яднанымі намаганнямі можна адстойваць і рэалізоўваць прыярытэтнае права культуры ў нашым жыцці.

Гэта тым больш важна сёння, калі ўсё наша грамадства імкнецца да ўзбагачэння інтэлектуальнага патэнцыялу, настойліва вяртаецца да народных вытокаў. Неўзабаве адбудзецца сход рэспубліканскага актыву, дзе мы маем намер разгледзець і вынесці на шырокае народнае абмеркаванне праект канцэпцыі далейшага развіцця нацыянальнай культуры. Гэты праект распрацоўваецца на дзяржаўным узроўні з шырокім удзелам вучоных, грамадскасці. Таму выказваю спадзяванне, што да яго абмеркавання, дапрацоўкі, а пасля і рэалізацыі актыўна падключацца ўсе творчыя саюзы.

Галоўнае сёння—забяспечыць матэрыяльныя магчымасці для рэалізацыі творчых памкненняў. Што-кольвечы ў гэтым напрамку ў рэспубліцы зроблена. Я маю на ўвазе часопіс «Крыніца», бібліятэчку часопіса «Маладосць». Зусім нядаўна прынята пастанова Бюро ЦК

КПБ, згодна з якой выходзіць бюлетэнь Таварыства беларускай мовы «Наша слова», будзе павялічаны аб'ём і перыядычнасць часопіса «Спадчына», часцей стане выходзіць «Родная прырода», з'явіцца новы часопіс «Тэатральная Беларусь», неперыядычныя выданні па музыцы і кінамастацтве. Аднаўляюцца аб'ёмы літаратурных часопісаў.

Што да пытання наконт выдавецтва Саюза пісьменнікаў, аб чым тут гаварылася, то я за яго станоўчае вырашэнне. Дзяржкамдруку БССР разам з Саюзам пісьменнікаў трэба разабрацца, што і як рабіць.

Заадно хацеў бы паведаміць вам, што ў мінулым месяцы прынята пастанова Бюро ЦК КПБ аб паляпшэнні жыллёвых умоў шэрагу членаў творчых саюзаў. Палову гэтага спісу складаюць пісьменнікі. Кіраўніцтву абласцей даручана прыняць аналагічныя пастановы.

Адзначу, што ўсе гэтыя слушныя прапановы, што выказаны на з'ездзе, будуць безумоўна разгледжаны ва ўрадзе рэспублікі і ў Цэнтральным Камітэце партыі.

Я згодны з тэзісам, які часта гучыць у асяроддзі мастацкай інтэлігенцыі, аб тым, што трэба па-іншаму трактаваць узаемасувязі ідэалогіі і культуры. Ідэалогія не павінна дыктаваць мастацкай культуры свае законы. Тут патрэбна дыялектычная ўзаемасувязь, бо іменна культура, у прыватнасці мастацкая творчасць, узбагачае ідэалогію, робіць яе больш адушаўлёнай, калі хочаце, больш чалавечнай.

Выходзячы з гэтага, ЦК КПБ і ўрад рэспублікі ставяць перад сваімі кадрамі наступныя асноўныя задачы:

— Першае, — настойліва вучыцца ўспрымаць з'явы культуры і мастацтва ў кантэксце ўсіх перабудоўчых працэсаў, з улікам іх рэальнага ўплыву на ідэйна-палітычнае і маральна-псіхалагічнае становішча грамадства.

— Другое, — знаходзіць у культурных і мастацкіх з'явах эмацыянальную і духоўную падтрымку пачынанням партыі, умела скарыстоўваць іх як для абнаўлення самой партыі, так і грамадства ў цэлым.

— Трэцяе,—павышаць інтэлектуальны ўзровень кадраў, іх унутраную культуру, адукаванасць і дасведчанасць, весці работу з інтэлігенцыяй на ўзаемадаверлівай аснове.

Але і самой творчай інтэлігенцыі нельга выключацца з гэтага працэсу. Духоўнае абнаўленне грамадства не можа быць эфектыўным без яе плённай дзейнасці, без новых таленавітых твораў, якія нясуць праўду пра жыццё народа, сцвярджаюць сацыялістычныя і агульнанародныя ідэалы.

Мабыць, некаму гэта думка падасца спрэчнай, але я лічу, што пазіцыю любога дзеяча культуры ў адносінах да перабудовы належыць вызначаць не па яго дэкларацыях, а па канчатковым творчым выніку працы, па тым, чым ён узбагаціў мастацкую культуру. Бо менавіта мастацкая культура несла і нясе ў сабе жывую сувязь і пераемнасць пакаленняў, дапамагае чалавеку адчуць роднасць са сваім народам, гісторыяй і спадзяваннямі на будучае. Дык хіба ж не ў развіцці мастацкай культуры патрыятычны абавязак мастака?

Час паказаў, што неабходна больш удумліва і разважліва падыходзіць да некаторых з'яў і ісцін, якія з'яўляліся раней своеасаблівымі стэрэатыпамі. Нельга, напрыклад, супрацьпастаўляць класавыя інтарэсы агульнанародным, агульначалавечым. Колькі было наламана дроў вакол Алеся Гаруна? Яго рабілі і апалітычным, і буржуазна-нацыяналістычным і г. д. Сёння ж мы прыйшлі да высновы, што ён—нацыянальны паэт, а яго творчасць—неад'емная старонка беларускай культуры. Такой жа аб'ектыўнай ацэнкі патрабуюць яшчэ шмат асоб і з'яў нашай гісторыі і культуры.

Адзінае патрабаванне на гэтым шляху—праўда, аб'ектыўнасць. Без праўды няма літаратуры і мастацтва. Без праўды няма свабоднага грамадства. Трэба не дапусціць, каб адна паўпраўда замянялася іншай. А такія спробы, асабліва ў перыядычным друку, назіраюцца. Часам некаторыя асобы, якія да нядаўняга часу або зусім замоўчваліся, або маляваліся толькі чорнай фарбай, сёння ўжо выстаўляюцца ледзь не ў вобліку святых і ўжо знарок замоўчваюцца негатыўныя, некаму нявыгадныя старонкі іх жыцця. Маятнікавыя хістанні не лепшы метад выяўлення гістарычнай праўды.

Як вядома, да твораў, якія вяртаюцца з архіваў і запаснікаў, прыкавана сёння асаблівая ўвага чытачоў. Дзякуючы гэтаму і некаторыя нашы выданні зрабіліся больш папулярнымі. Але, згадзіцеся, запаснікі не бясконцыя. І неўзабаве чытацкую цікавасць трэба будзе перавесці на іншае, на сённяшнія праблемы. Таму ўжо цяпер трэба думаць, як паўней і лепш задаволіць духоўны попыт заўтрашнік чытачоў.

Нельга нам адмаўляцца і ад мінулых заваёў, ад набытых маральных каштоўнасцяў. Навошта самім перакрэсліваць значэнне тых з'яў і падзей, якія ўвайшлі ў сусветную гісторыю! На жаль, мы з'яўляемся сведкамі, як пры раўнадушным маўчанні камуністаў бэсцяць У. І. Леніна і ленінскую партыю, як выключаецца з набыткаў гісторыі сацыялістычная і камуністычная ідэі, нават подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне падвяргаецца рэвізіі. Калі далей ісці па такому шляху, то сапраўды можна стаць Іванамі без роду і племені, страціць усялякія маральныя арыенціры.

Так, сёння партыі прад'яўляюцца папрокі ў марудпасці пераўтварэнняў, некаторай непаслядоўнасці, памылках у прыняцці рашэнняў. Усё гэта мае месца. Але ж краіна, грамадства, наша рэспубліка не стаяць на месцы ці, горш таго, адсоўваюцца на далёкія, даперабудоўчыя пазіцыі.

Ідзе пошук, актыўны, творчы, супярэчлівы пошук, у якім ісціннае рашэнне падобна на тое слова, што здабываецца, як зазначыў вядомы паэт, з «тысячи тонн словесной руды».

Яшчэ шмат якія праблемы пакуль што застаюцца надзённымі. На першым плане, вядома, праблема Чарнобыля. Для яе вырашэння патрэбна з'яднанасць і настойлівасць усіх нас, усяго народа. І каб яна мела рэальныя станоўчыя вынікі, трэба цвёрда усвядоміць: усё гэта—наш агульны боль, наша агульная бяда, і толькі аб'яднаўшыся мы будзем мець поспех.

Важна, каб рэальныя супярэчнасці і канфлікты ў грамадстве праходзілі і вырашаліся церпяліва, цывілізавана, без эмацыянальнага асляплення. Тут ваша мудрае, пераканаўчае слова можа мець адчувальнае ўздзеянне—стрымліваць ад неабдуманых учынкаў, гасіць непатрэбныя эмоцыі, студзіць гарачыя галовы. Калі эмоцыі бяруць верх над розумам, вынікі, як вы ведаеце, бываюць непрадказальныя.

На з'ездзе выявілася заклапочанасць лёсам маладых літаратараў. Радуе, што голас гэтага пакалення гучыць усё больш настойліва і самастойна. Але ўзаемасувязі творчых пакаленняў часам даюць збоі. Думаецца, тонус набыткаў маладых літаратараў павінен быць больш высокім, а пазіцыя іх вызначацца грамадзянскай сталасцю, шчырай прыхільнасцю да лепшых гуманістычных традыцый айчыннай літаратуры. Павінен вам сказаць, што шэраг канкрэтных мер, прадугледжаны для маладых аўтараў пастановай Бюро ЦК КПБ, на якім слухаліся тт. Вайтовіч, Макаловіч, Кудлаш.

Таварышы! Як вы ведаеце, сёлета адбудзецца XXXI з'езд Кампартыі Беларусі. Акрамя вырашэння на ім традыцыйнага кола пытанняў, упершыню ў гісторыі неабходна будзе прыняць праграму Кампартыі Беларусі і яе статут. Хацеў бы звярнуцца да вас з просьбай не застацца ўбаку ад выпрацоўкі гэтых важнейшых дакументаў. У іх мы будзем паслядоўна ажыццяўляць курс на ўмацаванне эканамічнага і палітычнага суверэнітэту нашай рэспублікі ў складзе Саюза ССР, далейшае развіццё нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа. Будзем імкнуцца стварыць неабходныя ўмовы для адраджэння яго культуры і мовы, задавальнення духоўных патрэб грамадзян іншых нацыянальнасцяў.

У з'ездаўскай гаворцы прынялі ўдзел многія іншыя літаратары. Выступленні іх былі ці кароткімі — у выглядзе рэплік, ці падчас перанасычанымі эмоцыямі і прыватнымі момантамі. Падаём іх у сціслых пераказах.

Валянцін **Тарас** у сваім выступленні зазначыў, што афіцыйнае зарэгістраванне ў Мінску таварыства «Отечество» мае, на яго думку, прамую ідэйную і тэарэтычную сувязь з пазіцыяй часопіса «Политический собеседник». У гэтым, мяркуе В. Тарас, пераконвае яго чацвёрты нумар і, у прыватнасці, артыкул Э. Скобелева. У гэтым артыкуле аўтар паўтарае сваю пазіцыю, якую ён засведчыў, падпісаўшы славутае пісьмо 74 расійскіх пісьменнікаў. Прамоўца падтрымаў прапанову аб выключэнні з Саюза пісьменнікаў БССР С. Паўлава.

Алесь **Наўроцкі** шмат і падрабязна гаварыў пра лёс рукапіса свайго рамана «Пакаленні і папялішчы» — вялікага, ажно на 90 друкаваных аркушаў твора, пра свае захады, каб надрукаваць яго ў маскоўскіх выданнях.

Павел **Прудзікаў** закранаў розныя пытанні, але ўсё ж на першы план вылучыў клопат пра лёс пісьменнікаў-ветэранаў. Прамоўца прыводзіў прыклады няўважлівых адносін да іх з боку ранейшага кіраўніцтва СП БССР.

Старшыня арганізацыйна-прапагандысцкай камісіі Мінскай гарадской рады ТБМ імя Ф. Скарыны Алесь **Нікалайчанка** заклікаў з'езд парупіцца пра лёс аднаго з сяброў рады, намесніка старшыні БНФ Юрыя Хадыкі. Як вядома, пракуратура Цэнтральнага раёна горада Мінска ўзбудзіла супраць яго крымінальную справу за арганізацыю несанкцыянаванага мітынгу «Чарнобыльскі шлях» і збор людзей каля будынка Беларускага тэлебачання. Ю. Хадыку пагражае год зняволення або дзве тысячы рублёў штрафу.

Боль за перажытае народам пасля чарнобыльскай катастрофы, трывога за тое, што прынясе беларусам дзень заўтрашні, прагучала ў выступленні Валянціны **Аколавай**. Паэтэса пераканана: сёння, калі будучыня залежыць ад кожнага з нас, калі пачалося нацыянальнае адраджэнне, як ніколі раней неабходна кансалідацыя творчых сіл. Яна таксама выказала прапановы адносна паляпшэння выдавецкай справы.

Некаторыя заўвагі па статуце Саюза пісьменнікаў Беларусі выказаў Уладзімір **Якутаў**. Гаварыў ён таксама аб кансалідацыі пісьменнікаў-камуністаў, узаемаадносінах літаратараў з партыйнымі органамі, прапанаваў вылучыць у акадэмікі АН БССР народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава.

Аб тым, як за справаздачны перыяд працаваў Беллітфонд, што рабілася па паляпшэнні матэрыяльнага і жыллёвага становішча пісьменнікаў, расказваў дырэктар Беллітфонду Васіль **Вільтоўскі**. Закрануў ён і пытанне самастойнасці рэспубліканскага фонду, пра што гаварылі на з'ездзе асобныя прамоўцы. На сённяшні дзень, сказаў ён, рэспубліканская пісьменніцкая арганізацыя ад Літфонду СССР атрымлівае значна больш, чым сам Літфонд ад нас праз УААП. Толькі за гэты год паступіць каля 950 тысяч рублёў. Прамоўца расказаў, на якія мэты гэтыя сродкі пойдуць, гаварыў, што па-ранейшаму востра стаіць жыллёвая праблема: каля ста пісьменнікаў на сённяшні дзень не маюць умоў для творчай працы. В. Вільтоўскі выказаўся за тое, што неабходна больш дбаць пра сем'і загінуўшых і памёршых пісьменнікаў.

Яўген **Лецка** заклікаў удзельнікаў з'езда падтрымаць стварэнне Міжнароднай асацыяцыі беларусаў. Мэтай асацыяцыі з'яўляецца актывізацыя і згуртаванне сіл, якія здольны свае патрыятычныя пачуцці, энтузіязм, свой вопыт, веды і сродкі аддаць справе нацыянальнага адраджэння. Асацыяцыя будзе будавацца па прынцыпу канфедэрацыі нацыянальных камітэтаў, якія ствараюцца ў кожнай краіне, дзе ёсць суполкі і згуртаванні беларусаў.

Супольнасць ствараецца на агульначалавечых прынцыпах дабра, праўды, справядлівасці, павагі да кожнага народа. Мы, падкрэсліў прамоўца, адмяжоўваемся ад тых, хто заплямілі сябе ўдзелам у рэпрэсіях сталінскага і гітлераўскага рэжымаў, прапаведуе нацыянальную выключнасць, ігнаруе правы іншых народаў. Бачачы сваю асноўную задачу ў кансалідацыі і духоўным адраджэнні народа як этнічнай цэласнасці, мы такі ж погляд маем і на нацыянальную культуру, якая з'яўляецца адзінай і непадзельнай, незалежна ад таго, дзе яна ствараецца: у Мінску, Маскве, Беластоку ці Нью-Йорку.

З лістом Якуба Коласа да тагачаснага сакратара ЦК КПБ Ц. С. Гарбунова пазнаёміў прысутных Аляксей **Слесарэнка**. У лісце народны пясняр даваў высокую ацэнку яму як артысту-чытальніку, прасіў аказаць дапамогу. На думку прамоўцы, у рэспубліцы неабходна арганізаваць студыю мастацкага чытання, каб была не толькі прапаганда, а і культура беларускага мастацкага слова.

Сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў СССР Юрый **Сураўцаў** зазначыў, што ён бы мог у сваім выступленні падрабязна пагаварыць аб сённяшнім стане беларускай літаратуры, называючы канкрэтныя імёны, кнігі. Балазе, рэгулярна сочыць за публікацыямі. На яго думку, творчы працэс у рэспубліцы праходзіць натуральна. Пісьменнікі, кожны ў меру свайго таленту, робяць сваю справу. Але апраўдана і тое, што на з'ездзе нямала гаворыцца аб палітыцы, закранаюцца розныя сацыяльныя праблемы, востра ставяцца пытанні экалогіі. У той жа час, падкрэсліў Ю. Сураўцаў, трэба, каб усё гэта не станавілася звычайнай модай, а падмацоўвалася канкрэтнымі справамі.

Праект Статута Саюза пісьменнікаў Беларусі, працягваў ён, таксама свайго роду знак часу. Зразумела імкненне пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі да самастойнасці. Далей прамоўца спыніўся на асноўных палажэннях праекта статута, выказаў па іх свае заўвагі. Падрабязна гаварыў Ю. Сураўцаў аб арганізацыі замежных паездак пісьменнікаў, пра што былі крытычныя заўвагі ў некаторых выступленнях.

Пра неабходнасць мець у рэспубліцы літаратурны тэатр, пра цяжкасці ў галіне культуры гаварыла Ніна **Загорская**. Яна адзначыла таксама, што пакуль вельмі мала робіцца па правядзенні ў жыццё Закона аб мовах у Беларускай ССР, што трэба больш удзяляць увагі творчай моладзі.

Уладзімір **Федасеенка** гаварыў аб тым, што ў творчым саюзе неабходна больш думаць адзін пра другога, менш займацца «самаедствам».

У выступленні Уладзіміра **Казберука** выказана думка, што, калі б не пісьменніцкая трыбуна, дык, ведаючы тэндэнцыйнасць нашага кіраўніцтва, сёння ў нас не было б закона аб беларускай мове. У. Казбярук звярнуў таксама ўвагу прысутных на больш дэталёвае вывучэнне нацыянальнай гісторыі.

Алесь **Петрашкевіч** не паспеў выступіць, ён здаў сваё выступленне ў сакратарыят. Там гаворыцца пра неабходнасць абароны гонару і годнасці пісьменніка, вядзецца палеміка з кінарэжысёрам А. Рудэрманам.

На з'ездзе з удакладненнямі, рэплікамі, прапановамі выступілі Сяржук **Сокалаў-Воюш**, Алесь **Емельянаў**, Нічыпар **Пашкевіч**, Карлас **Шэрман**, малады паэт Сяргей **Пацюпа** і іншыя.

З'езд прыняў шэраг пастаноў і рэзалюцый.

Аб выключэнні з Саюза пісьменнікаў Паўлава С. Я. («як чалавека, які, карыстаючыся сваім службовым становішчам, на працягу многіх гадоў перашкаджаў справе развіцця беларускай літаратуры і культуры ў цэлым»).

Аб асуджэнні часопіса «Политический собеседник» за публікацыі, у якіх «у зняважлівай форме бяздоказна і безадказна выстаўляюцца многім вядомым пісьменнікам палітычныя абвінавачванні», «процідастаўляецца творчая інтэлігенцыя рабочаму класу і сялянству».

Аб пратэсце супраць узбуджэння пракуратурай Цэнтральнага раёна г. Мінска крымінальнай справы ў дачыненні да навукоўца, намесніка старшыні рады БНФ «Адраджэнне» Ю. Хадыкі.

Аб неабходнасці афіцыйнага прызнання Беларускага народнага фронту за перабудову «як рэальнага, масавага грамадска-палітычнага руху».

Аб захадах па ліквідацыі вынікаў чарнобыльскай катастрофы і ўдзеле ў гэтай справе пісьменніцкай арганізацыі.

Аб новым заканадаўчым акце па падаходным падатку з ганарару за літаратурныя творы.

У агульнай, выніковай рэзалюцыі з'езда гаворыцца, апрача іншага, пра неабходнасць утварэння самастойнага выдавецтва Саюза пісьменнікаў, ухвалены першыя крокі па стварэнні Міжнароднай асацыяцыі беларусаў, выказана патрабаванне аб неабходнасці афіцыйнага прызнання «Мартыралога Беларусі» і краязнаўчага таварыства, ацэнена як станоўчая з'ява ўзнікненне ў межах СП новых ідэйна-творчых аб'яднанняў. З'езд абавязаў рэдакцыйную калегію «ЛіМа» разгледзець пытанне аб дэвізе газеты (паводле дадзенай з трыбуны з'езда даведкі, гэтае пытанне разглядалася на адным з пасяджэнняў рэдкалегіі, але не было вырашана).

ПАПРАЎКА

Пры перадруку са спісу членаў Рады СП Беларусі, абранай X з'ездам пісьменнікаў, выпала прозвішча Ірыны ЖАРНАСЕК.

Падліковая камісія прыносіць свае прабачэнні за гэтую прыкрую памылку.

Дом Скарыны ў Познані

У зборніку дакументаў і матэрыялаў «Францыск Скарына» (укл. В. І. Дарашкевіч, Мн., 1988) надрукавана на лацінскай мове з перакладамі на беларускую і рускую 17 дакументаў, якія датычаць дзвюх познанскіх судовых спраў, што ваўплывалі на жыццёвы шлях беларускага асветніка і першадрукара.

З іх высвятляецца, што Скарына бываў у Познані некалькі разоў на працягу 1529—1532 гадоў і спыняўся там на працяглы час. Жыў ён, як вынікае з дакументаў, у доме-камяніцы «шаноўнага Якоба Корба, грамадзяніна познанскага». У падвале гэтага дома захоўвалася мноства скуранога і футравага тавару Івана Скарыны, які памёр у 1529 годзе. Туды ж прыязджаў Францыск і ў гэтым жа доме атрымаў сваю і жончыну частку ад купецкай супольнасці з братам Я. Корб і раней быў цесна звязаны з сямействам Скарынаў.

Да гэтага часу ніхто не спрабаваў высветліць, дзе ж знаходзіўся дом Я Корба, ці захаваўся ён да нашага часу. Познанскія дакументы цалкам надрукаваны зусім нядаўна, хоць яны на працягу чатырох з паловай стагоддзяў захоўваліся ў познанскім архіве. А ў 1926 г. яны былі там знойдзены і часткова перакказаны польскай даследчыцай М. Вайцяхоўскай. Пазней да іх звяртаўся М. Гембаровіч і многія іншыя.

Багатае купецкае сямейства Корбаў да сярэдзіны XVI ст. было дастаткова вядомым у Познані. Яму належалі ў цэнтры горада на Рынкавай плошчы тры каменныя дамы. Дарэчы, амаль усе дамы на старым рынку захаваліся з часоў сярэдневякоўя і рэнесансу да нашых дзён.

Камяніца нумар 42 належала ў 1534 г. купцу Паўлу Корбу. Побач з ёю стаіць камяніца, якая ў свой час належала доктару медыцыны Валенцію Рэшку з Старагарда (1462—1557), які неаднаразова выбіраўся бурмістрам Познані. У дакументах, якія датычаць Скарыны, ён таксама ўпамінаецца двойчы, адзін раз — як познанскі бурмістр, перад якім Скарына прад'явіў указ караля аб сваім вызваленні з турмы. Аднак у зборніку дакументаў пра Скарыну (с. 147, 149, 152) ён жа названы з памылкамі: «пан Валянцін Скаргардыян», што можа выклікаць у гісторыкаў і скарыназнаўцаў непаразуменні.

Галоўны дом Корбаў знаходзіўся там жа пад нумарам 82. У 1514 г. ён належаў нейкаму Бау, але ў 1534 г. — згодна з рэестрам — менавіта Якобу Корбу.

Есць у перакладах дакументаў зборніка істотныя недакладнасці. Напрыклад, на стар. 110 гаворыцца (толькі ў перакладах) аб маёмасці нябожчыка Івана Скарыны, нібыта «канфіскаванай у падвале пад домам Якаба Корбы». Канфіскацыя ж, як вядома, прадугледжвае прымусовае беззваротнае адчужэнне маёмасці ў карысць дзяржавы. Нічога падобнага ў Познані ў 1529 г. не адбылося і не магло адбыцца. І ў арыгінале гэтага дакумента выкарыстана познелацінскае слова «arestata», якое можна нават не перакладаць, а толькі ўзгадніць са сказам, бо яно азначае «арышт», «затрыманне», але не канфіскацыю. Гэта неабходна падкрэсліць таму, што і ў біяграфіях Францыска Скарыны было і застаецца шмат выдуманых перакладчыкамі канфіскацый маёмасці, якіх на самай справе ніколі не было.

А ў сярэдзіне XVI ст. вышэйназваны дом ужо стаў уласнасцю Станіслава Схомбека.

Дом, у якім неаднаразова бываў Францыск Скарына, не згубіўся на працягу многіх стагоддзяў. Цяпер ён — адзіны ў свеце, які захоўвае водгук крокаў нашага славутага земляка. Такіх дамоў, акрамя даўніх універсітэцкіх памяшканняў, невядома ні ў Кракаве і Падуі, ні ў Нюрнбергу і ў Празе, ні ў Вільнюсе і ў Калінінградзе (Кёнігсбергу), ні ў родным для Скарыны Полацку.

Варта было б паклапаціцца тым, хто мае на гэта магчымасць, каб у вызначаны ЮНЕСКА год святкавання 500-гадовага юбілею Францыска Скарыны на фасадзе дома нумар 82 на Рынкавай плошчы ў Познані з'явілася адпаведная мемарыяльная дошка. Яна б стала тут пакуль што адзіным сімвалам непасрэднай сувязі сучаснікаў са Скарынам.

Што ж датычыць сярэдневяковай познанскай турмы, у якой беспадстаўна сядзеў Ф. Скарына, дык і пра яе з'явіліся некаторыя звесткі ў польскім гісторыка - краязнаўчым даведніку, які неаднаразова выдаваўся ў канцы 1960-х — пачатку 1970-х гг. Гэтае жудаснае збудаванне таксама захавалася да нашых дзён. Яно было, бадай, самым пачварным ва ўсёй Еўропе: заўжды сырыя адзіночныя камеры былі размешчаны ў месце праз раку Варту. Краты былі зверху, — па іх шасталі познанскія мяшчане і заезджыя купцы. Хто пляваў уніз на галовы вязняў, хто кідаў сухую скарынку хлеба ці якінебудзь агрызак... Наш першадрукар, асветнік і высокаадукаваны медык, сядзеў у гэтай турме без усялякіх падстаў, па ўказу самаўладнага і жорсткага караля, які ўрэшце вымушаны быў цалкам апраўдаць Скарыну і нават узяць яго пад уласную апеку.

Генадзь ЛЕБЕДЗЕЎ.

БЫЦЬ НОВАМУ ФОНДУ

Шмат стагоддзяў жывуць яўрэі на тэрыторыі Беларусі. Першае ўпамінанне пра яўрэяў — жыхароў Мінска — адносіцца да 1489 года.

У XVII—XIX стст. праз Беларусь праходзіла ўстаноўленая царскім урадам рыса аседласці, у выніку чаго яўрэйскае насельніцтва Беларусі ў 1897 годзе складала 13,6 працэнта, а ў гарадах і мястэчках часам даходзіла да 80 працэнтаў (у Мінску — 52 працэнты).

Беларусь з'яўлялася адным з важнейшых цэнтраў яўрэйскага духоўнага жыцця ў Расіі. У прыватнасці, у Валожыне і Міры знаходзіліся вядомыя ва ўсім свеце рэлігійныя навучальныя ўстановы — іешывы, у якіх займаліся навучэнцы з многіх краін Еўропы і Амерыкі.

Пасля Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі развіццё яўрэйскай культуры ў Беларусі атрымала магутны штуршок: яўрэйская мова выкладалася ў школах, педагагічных інстытутах і тэхнікумах. У Інстытуце беларускай культуры існавала яўрэйскае аддзяленне з філалагічным, літаратурным і гістарычным сектарамі. Пры Белдзяржуніверсітэце існаваў інстытут, які рыхтаваў настаўнікаў для яўрэйскіх школ.

Шматвяковае існаванне яўрэяў на беларускай зямлі пакінула пасля сябе шматлікія помнікі архітэктуры і будаўніцтва, выдатныя культурныя каштоўнасці, помнікі літаратуры і рукапісныя тэксты. Жыццё яўрэйскага народа ўвасобілі на сваіх палотнах Марк Шагал і Юдэль Пэн.

У гады другой сусветнай вайны яўрэйская культура ў Беларусі панесла непапраўныя страты. Былі не толькі знішчаны многія сотні тысяч яўрэяў, але аказаліся разбуранымі ці не большасць помнікаў яўрэйскай культуры.

Перакосы ў сталінскай і брэжнеўскай нацыянальнай палітыцы ўзмацнілі працэс заняпаду яўрэйскай культуры, нават ў наш перабудовачны час мы сутыкаемся з фактамі апаганьвання і знішчэння яўрэйскіх нацыянальных святыняў.

Настаў час падумаць пра тое, як захаваць нямногае, што засталося ў спадчыну нашаму пакаленню, адрадзіць сучасную яўрэйскую культуру: могілкі, абеліскі, будынкі, кнігі, рукапісы, фальклор, рэлігійныя святыні — усё тое, што ўзмацняе нашу гістарычную памяць, нацыянальную самасвядомасць і годнасць.

Мы, заснавальнікі Фонду захавання яўрэйскай гістарычнай спадчыны, звяртаемся да ўсіх зацікаўленых арганізацый і прыватных асоб з заклікам прыняць удзел у дзейнасці фонду, не на словах, а на справе прадэманстраваць імкненне народаў да дружбы, узаемаразумення, узаемадапамогі і інтэрнацыянальнай еднасці.

Л. ГУТМАН, старшыня яўрэйскай рэлігійнай абшчыны; М. ДАНЦЫГ, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР, старшыня аб'яднання яўрэйскай культуры; Л. ЛЕВІН, лаўрэат Ленінскай прэміі, заслужаны архітэктар БССР; І. ЧЫГРЫНАЎ, старшыня праўлення Беларускага фонду культуры; Г. БУРАЛКІН, старшыня СМ БССР; В. ЗУЁНАК, старшыня рады СП Беларусі; М. ЯРОМЕНКА, старшыня праўлення СТД БССР; І. ХАРАШЭВІЧ, упраўляючы справамі Беларускага Экзархата, протаіерэй.

Жадаючыя прыняць удзел у стварэнні і дзейнасці фонду, пазнаёміцца з яго статутам могуць звярнуцца па адрасе: 220002 г. Мінск, вул. Крапоткіна, 22, яўрэйская рэлігійная абшчына, арганізацыйны камітэт па стварэнні Фонду захавання яўрэйскай гістарычнай спадчыны.

НА ЭКРАНЕ

З 21 ПА 27 МАЯ
ДА СВЯТА СЛАВЯНСКАГА ПІСЬМЕНСТВА І КУЛЬТУРЫ У БЕЛАРУСІ

21 мая. 16.55

Прэм'ера дакументальнага фільма «ФРАНЦЫСК, СЫН СКАРЫНІН». Аўтар сцэнарыя А. Петрашкевіч. Рэжысёр С. Гайдук.

23 мая. 17.00

Прэс-канферэнцыя, прысвечаная Святу славянскага пісьменства і культуры ў Беларусі.

Трансляцыя з Дома літаратара.

23 мая. 19.25

Да Свята славянскага пісьменства і культуры ў Беларусі.

Выступленне ансамбля народнай музыкі «ЖЫВІЦА» Дзяржтэлерадыё БССР.

24 мая. 11.30

Малебен у памяць святых раўнаапостальных Мяфодзія і Кірылы — першанастаўнікаў славянскіх.

24 мая. 17.55

«Глыток волі». Пра мастацкі фільм «Маці Урагану» паводле У. Караткевіча.

24 мая. 19.30

Урачыстае адкрыццё Свята славянскага пісьменства і культуры ў Беларусі.

Трансляцыя з ДАВТа БССР.

25 мая. 19.00

Дабрачынны канцэрт, прысвечаны да Свята славянскага пісьменства і культуры ў Беларусі.

25 мая. 21.00

Спектакль ДАВТа БССР.

У. Солтан «ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА» паводле аповесці У. Караткевіча.

Рэжысёр-пастаноўшчык В. Цюпа.

Галоўныя партыі выконваюць Я. Пятроў, У. Энкадзіёсаў, В. Скорабагатаў, Н. Кастэнка, І. Шупеніч.

26 мая. 14.00

«КРУГЛЫ СТОЛ».

Сустрэча беларускіх і рускіх літаратараў.

27 мая. 11.00

«ВЕРУЮ...». Спектакль Мінскага тэатра моды, прысвечаны 500-годдзю Ф. Скарыны, адлюстроўвае погляды сучаснага мастака на творчую спадчыну беларускага рэнесансу.

У перадачу ўключаны інтэрв'ю з аўтарам калекцыі мадэлей І. Булгакавай і рэжысёрам Тэатра моды А. Варламавым.

27 мая. 11.45

Экран: праблемы, героі...

Вынікі кінафестывалю «Вясна-90». Вядучы — журналіст В. Небышынец.

27 мая. 22.00

Закрыццё Свята славянскага пісьменства і культуры ў Беларусі.

Паэтычнае фальклорнае свята «РОДНАЕ СЛОВА» (Вязынка).

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Валянціну Мысліўцу з прычыны напаткаўшага яго горя — смерці БРАТА МІКАЛАЯ.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Віктару Трыхманенку з прычыны напаткаўшага яго горя — смерці ЖОНКІ.

Супрацоўнікі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР смуткуюць з выпадку заўчаснай смерці аспіранткі інстытута Галіны ПОЯМАНАВАЙ і выказваюць спачуванне родным і блізкім.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856
АТ 06238

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі і нарыса — 33-19-65, аддзела пісьмаў і грамадскай думкі — 33-19-65, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела тэатра, кіно і тэлебачання — 33-21-53, аддзела музыкі — 33-21-53, аддзела выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 33-24-62, аддзела народнай творчасці і культасветработы — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і фотаілюстрацый — 33-44-04, 33-24-62, карэктарскай — 32-20-64, бухгалтэрыі — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.